3-4 стар.

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 КРАСАВІКА 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 73 (25938)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт запатрабаваў ад пракуратуры ўзмацніць барацьбу з карупцыяй

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад пракуратуры нараўне з узмацненнем крымінальна-прававых мераў у барацьбе з карупцыяй асаблівую ўвагу ўдзяляць нагляду за выкананнем патрабаванняў да парадку прыняцця эканамічных рашэнняў дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі. Прэзідэнт запатрабаваў таксама не аслабляць кантроль за выкананнем абмежаванняў для дзяржаўных службовых асобаў, як гэта прадугледжана Законам Рэспублікі Беларусь «Аб барацьбе з карупцыяй».

Кіраўнік дзяржавы 19 красавіка прыняў з дакладам генеральнага пракурора Пятра Міклашэвіча. Прэзідэнт праінфармаваны аб выніках дзейнасці праваахоўных органаў па процідзеянню карупцыі і злачыннасці за першы квартал гэтага года.

Генеральны пракурор адзначыў, што сумеснымі намаганнямі органаў пракуратуры, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў істотна зніжаны ўзровень карупцыі. Гэтаму садзейнічалі дакладная каардынацыя работы праваахоўных органаў і актывізацыя процідзеяння карупцыі з сувязі з уступленнем у студзені гэтага года ў сілу новага антыкарупцыйнага закона. За 3 месяцы 2007 года выяўлена 238 фактаў хабарніцтва, 195 фактаў крадзяжоў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, 347 фактаў учынення злачынстваў, звязаных са злоўжываннем уладай або службовымі паўнамоцтвамі. У цэлым колькасць карупцыйных злачынстваў у параўнанні з першым кварталам 2006 года знізілася на 24,4 працэнта.

У першым квартале 2007 года ў рэспубліцы ў цэлым зарэгістравана 41 458 злачынстваў, што на 10,3 працэнта менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Зніжэнне ўзроўню злачыннасці адбылося за кошт змяншэння колькасці ўчыненых цяжкіх (на 25,9 працэнта), менш цяжкіх злачынстваў (на 8 працэнтаў) і злачынстваў, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі (на 14,8 працэнта). Назіраецца зніжэнне колькасці наўмысных забойстваў, разбояў, грабяжоў і хуліганстваў. Істотна зменшылася колькасць злачынстваў з удзелам непаўналетніх (на 26 працэнтаў).

Прэзідэнт падкрэсліў, што абарона грамадзян ад злачынных замахаў застаецца адной з асноўных задач дзяржавы, і запатрабаваў ад органаў пракуратуры яшчэ больш эфектыўнай каардынацыі дзейнасці праваахоўных органаў па барацьбе са злачыннасцю, прыняцця дзейсных і своечасовых мераў па раскрыццю злачынстваў, прыцягненню вінаватых асобаў да адказнасці. Генеральны пракурор таксама праінфармаваў Прэзідэнта аб ходзе папярэдняга расследавання крымінальных спраў і судовага разгляду крымінальных спраў, што знаходзяцца на кантролі ў кіраўніка дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Расійскі Альфа-Банк разлічвае на доўгатэрміновую прысутнасць у Беларусі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка сустрэўся 19 красавіка са старшынёй савета дырэктараў ААТ «Альфа-Банк» Міхаілам Фрыдманам.

Прэзідэнт падзякаваў Міхаілу Фрыдману за работу ААТ «Альфа-Банк» у Беларусі, у прыватнасці за інвестыцыі, якія былі зроблены ў эканоміку рэспублікі праз ААБ «Беларусбанк».

«Нам выгадна, каб Альфа-Банк быў прадстаўлены ў нашай краіне. Мы ведаем аб сацыяльных праграмах вашага банка. Думаю, вы будзеце ўдзельнічаць у сацыяльных праектах і ў нашай краіне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Трэба дапамагаць людзям там, дзе працуеш». Адначасова Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што Беларусь «не збіраецца ўзнімаць планку». «У нас ёсць практыка аказання такой дапамогі. У Беларусі працуе шмат расійскіх кампаній, і мы не маем намеру забіраць у іх прыбытак. Нам лішняе не трэба. Галоўнае, каб народ быў перакананы, што сюды прыходзяць людзі, якія не толькі свае багацці тут будуць прыбаўляць, але і не будуць забываць пра людзей, якія жывуць у гэтай краіне», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гэта «ўжо другая сустрэча наконт інвестыцый ААТ «Альфа-Банк» у эканоміку краіны і набыцця кантрольнага пакета ЗАТ «Міжгандальбанк». У першы раз бакі практычна дамовіліся аб асноўных умовах супрацоўніцтва, заставалася толькі ўзгадніць пазіцыі па асобных пытаннях.

Паводле слоў Міхаіла Фрыдмана, ААТ «Альфа-Банк» з вялікай цікавасцю і жаданнем разглядае магчымасць пашырэння работы ў Беларусі. Цяпер ААТ «Альфа-Банк» актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным банкам Беларусі, ААБ «Беларусбанк». У цэлым Альфа-Банк разлічвае на доўгатэрміновую, стабільную прысутнасць у Беларусі.

ААТ «Альфа-Банк» уваходзіць у склад кансорцыума «Альфа-Груп». Гэта адзін з самых буйных банкаў Расіі па велічыні актываў і ўласнага капіталу. Паводле даных на 1 студзеня 2007 года, актывы групы «Альфа-Банк», куды ўваходзяць ААТ «Альфа-Банк», даччыныя банкі і фінансавыя кампаніі, склалі $13,2 млрд, сукупны капітал — $1,5 млрд. Чысты прыбытак за 2006 год склаў $186,1 млн. Закрытае акцыянернае таварыства «Міжгандальбанк» зарэгістравана Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 1999 года. На пачатак 2007 года структура банка ўключала галаўны банк і пяць філіялаў і аддзяленняў — у Брэсце, Мінску, Наваполацку, Гомелі і Магілёве. Асноўнымі акцыянерамі ЗАТ «Міжгандальбанк» з'яўляюцца Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь — 38,94 працэнта акцый, Daltotrade Limited (Вялікабрытанія) — 42,70 працэнта, Vikash Investments Limited — 9,33 працэнта, ААТ Банк «Адраджэнне» — 6,41 працэнта, РУП «Беларускі металургічны завод» — 1,98 працэнта. Фізічным асобам належыць 0,64 працэнта акцый. У ліку буйных крэдытаатрымальнікаў ЗАТ «Міжгандальбанк» — ААТ «Нафтан», СТАА «БелБауПласт», СП ЗАТ «Інтэрфорэст», ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат», ТДА «Тэхнатэкс».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў ордэнам Маці больш як 100 шматдзетных жанчын

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў больш як 100 жанчын ордэнам Маці.

У ліку ўзнагароджаных — хатняя гаспадыня з в. Альшаны Столінскага раёна Наталля Андрусевіч, сацыяльны работнік Маларыцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Галіна Валошчык, аператар машыннага даення сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Новая Прыпяць» Столінскага раёна Алена Ермакевіч, аператар камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Бярэзіна» Светлагорскага раёна Настасся Грэк, хатняя гаспадыня са Светлагорска Паліна Цой, індывідуальны прадпрымальнік з Гродна Таццяна Чумакова.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З бюджэту Беларусі ў 2007 годзе будуць праведзены даплаты 80 акадэмікам і 121 члену-карэспандэнту

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 19 красавіка падпісаў Указ № 188 «Аб даплатах за акадэмічныя вучоныя званні ў 2007 годзе».

Указ зацвярджае рашэнне Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб назначэнні даплат правадзейным членам (акадэмікам) і членам-карэспандэнтам за акадэмічныя вучоныя званні ў 2007 годзе. Усяго даплаты ўстаноўлены 80 акадэмікам і 121 члену-карэспандэнту па выніках іх навуковай дзейнасці ў 2006 годзе. Плацяжы будуць праведзены Нацыянальнай акадэміяй навук за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на фінансаванне навукі ў гэтым годзе.

БЕЛТА.

«Самапальнае» паліва

Як нас дураць

Высокія кошты на бензін і дызпаліва — выгадныя не толькі для здабытчыкаў і перапрацоўшчыкаў «чорнага золата», але і для аферыстаў, якія займаюцца падробкай нафтапрадуктаў. А вось уласнікі транспартных сродкаў нясуць вялізныя страты, бо тэхніка хутка псуецца пасля ўжывання сурагату.

Паводле звестак МУС Беларусі, у нашай краіне прайдзісветы найчасцей пракручваюць махінацыі з пастаўкамі дзяржпрадпрыемствам «самапальнага» дызпаліва. Тэхналогія «вытворчасці» сурагатнай саляркі даволі простая. Аферысты набываюць пячное альбо рэактыўнае паліва, дадаюць туды крыху салярки, афармляюць фіктыўныя дакументы і прадаюць яго пад выглядам дызпаліва. Некаторыя махінатары не рупяцца рабіць і памянёны «кактэйль», а трансфармуюць пячное і рэактыўнае паліва ў салярку толькі на паперы. І гэта ім удаецца. Выявіць «фальшыўку» без спецыяльных лабараторных даследаванняў цяжка. Зрэшты, некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія набываюць «ілжэ-салярку», і падманваць не трэба. Яны самі за пэўную суму не заўважаюць, што іх дураць. Супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Мінскага аблвыканкама, напрыклад, выяўлена група, якую ўзначальвалі азербайджанцы. «Паўднёвыя госці» набывалі на нафтаперапрацоўчых заводах нашай краіны пячное паліва і пастаўлялі яго пад выглядам салярки дзяржпрадпрыемствам, размешчаным у Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай абласцях, а таксама ў сталіцы. Усяго ўстаноўлена больш за 60 такіх фактаў. Паводле папярэдніх падлікаў, прадпрыемствам нанесены ўрон больш чым на 2 мільёны долараў. Трое з шасці аферыстаў затрыманы. Для кампенсацыі ўрону ў іх арыштавана маёмасці больш чым на 200 тысяч долараў. Увогуле, за мінулы год і сёлета па фактах гандлю некандыцыйным палівам было ўзбуджана 27 крымінальных спраў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сувязіст г. Васілевічы Рэчыцкага раёна Фёдар МАЛІЖОНАК у вольны ад працы час шмат гадоў упрыгожваў свой дом. Ён заўсёды марыў, каб яго дом выглядаў незвычайна. І сапраўды, у гэтым горадзе другой такой сядзібы не знойдзеш.

Слова — міністру

БЕЛАРУСАЎ — 9,7 МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК

Паводле даных на пачатак сакавіка, у нашай краіне пражывае 9 мільёнаў 708,3 тысячы чалавек. Аб гэтым журналістам учора паведаміў міністр статыстыкі і аналізу Уладзімір ЗІНОЎСКІ.

Для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ўказам кіраўніка дзяржавы была зацверджана Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Летась упершыню ў нашай краіне павялічылася нараджальнасць і паменшылася смяротнасць. За два першыя месяцы гэтага года нарадзілася на 1,4 тысячы дзяцей больш у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам, а смяротнасць паменшылася на 1,8 тысячы чалавек.

Паводле слоў Уладзіміра Зіноўскага, сёлета ў краіне будзе пабудавана 4,7 мільёна квадратных метраў жылля. За першыя тры месяцы года ў эксплуатацыю ўведзены 1 мільён 121 тысяча квадратных метраў жылля, што на 170 тысяч квадратных метраў больш, чым у першым квартале летась. Па жыллёваму будаўніцтву выдатна спрацавалі ўсе рэгіёны краіны, за выключэннем сталіцы, дзе за першы квартал пабудавана толькі 163 тысячы квадратных метраў жылля, што на 20 працэнтаў менш, чым за адпаведны мінулагодні перыяд.

Ацэньваючы знешнегандлёвую дзейнасць краіны, міністр адзначыў, што сёлета больш чым у два разы павялічылася цана на расійскі газ. Амаль на трэць паменшыліся пастаўкі нафты з Расіі, таму на 30 працэнтаў упалі аб'ёмы экспарту нафтапрадуктаў у трэція краіны. Нягледзячы на гэта, за студзень—люты агульны аб'ём знешняга гандлю таварамі павялічыўся на 13 працэнтаў у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. Разам з тым за першыя два месяцы года адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі склала 659 мільёнаў долараў. Відавочна, што львіная доля імпарту ў сённяшніх умовах прыпадае на энерганосьбіты. Так, адмоўнае сальда знешняга гандлю з Расіяй складае 795,2 мільёна долараў.

Працягвае павялічвацца налічаная сярэднямесячная заработная плата. Самыя вялікія заробкі ў работнікаў нафтаперапрацоўчай прамысловасці і чорнай металургіі, у лютым яны былі ў межах 1,1 мільёна рублёў. У будаўніцтве заработная плата склала 746,8 тысячы рублёў, у арганізацыях аховы здароўя — 551, транспарту — 704,2, у сельскай гаспадарцы — 344,7, гандлі і грамадскім харчаванні — 499,4, фізкультуры і спорце — 784,8, сацыяльным забеспячэнні — 442,8 тысяч рублёў. Сярод краін СНД па велічыні сярэднямесячнай заработнай платы ў доларавым эквіваленце наша краіна займае 3-е месца пасля Расіі і Казахстана.

Паводле слоў міністра, сярэднямесячная пенсія сёння складае 278 тысяч рублёў. Як выглядае наша краіна ў параўнанні з іншымі краінамі ў гэтым аспекце? У сакавіку сярэднямесячная пенсія ў доларавым эквіваленце адпавядала 130 доларам, а ў Расіі ў лютым пенсіянеры атрымлівалі прыкладна 108 долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НАСТУПНЫМ ПАКАЛЕННЯМ — НОВЫ ЛЕС

Міністэрствам лясной гаспадаркі падведзены папярэднія вынікі агульнарэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Дзень лесу-2007», якая прайшла 14 красавіка.

Удзел у мерапрыемстве прынялі больш за 35 тысяч чалавек — ад школьніка да губернатара. Усяго было пасаджана каля 12 мільёнаў дрэў на плошчы 2,5 гектара, што аказалася нават больш, чым планавалася. Такім вынікам добраахвотнай акцыі спрыяла належная арганізацыя, у прыватнасці, забеспячэнне ўсіх жадаючых прыняць у ёй удзел як прыладамі працы, так і пасадачным матэрыялам. Больш за тое, ва ўдзельнікаў была нават магчымасць выбару, што пасадзіць — сасну, елку, бярозу ці дрэва іншай пароды. Найбольшая актыўнасць, паводле даных міністэрства, была адзначана ў Мінскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АЦЯПЛЯЛЬНЫ СЕЗОН У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ЗАВЕРШАНЫ ДА КАНЦА КРАСАВІКА

У Беларусі завяршаецца ацяпляльны сезон. Як паведамілі ў ДВА «Белэнерга», у гарадах рэспублікі адключана ацяпленне ў адміністрацыйных будынках і на прадпрыемствах. У жылым сектары масавае адключэнне ацяплення чакаецца на наступным тыдні. У бліжэйшыя выхадныя надвор'е будзе яшчэ дастаткова халодным. Таму, на думку спецыялістаў аб'яднання, «актыўна па ўсёй рэспубліцы» адключэнне ацяплення ў жылых дамах будзе праводзіцца з наступнага тыдня. Рашэнне аб адключэнні ацяплення па кожнаму гораду прымаюць мясцовыя органы ўлады з улікам паказчыкаў сярэднясутачнай тэмпературы паветра. У апошнюю чаргу ацяпленне адключаецца ва ўстановах сацыяльнай сферы. У цэлым да канца красавіка ацяпляльны сезон у Беларусі будзе завершаны, лічаць у ДВА «Белэнерга».

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

КАЛІ БУТЭЛЬКІ НА СЕМЯРЫХ МНОГА

У вёсцы Лобча Лунінецкага раёна сямёра мужчын выпілі пляшку настойкі і трапілі ў бальніцу. Гаспадар хаты знайшоў гаршэлку, якую прыхавала яго маці, і пачаставаў гасцей. Толькі ён не ведаў, што гаршэлка для лячэння настоена на беладоне. Выпілі па кроплі і атруціліся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЖЫХАРКА АЛЖЫРА НАРАДЗІЛА СЕМЯРЫХ

Жыхарка алжырскай правінцыі Бумердэс нарадзіла семярых дзяцей — хлопчыка і шэсць дзяўчынак, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы. На жаль, хлопчык нарадзіўся мёртвым. Астатнія шасцёра блізнятак, якія знаходзяцца пакуль пад наглядам урачоў, адчуваюць сябе добра. Вага нованароджаных складае ад 700 г да 1,4 кг. Для іх 27-гадовай маці гэта была першая цяжарнасць. Апошнія тры месяцы перад родамі яна была вымушана правесці ў бальніцы. Вядома таксама, што раней алжырка на працягу паўгода праходзіла курс лячэння ад бясплоднасці.

Кар. БЕЛТА.

З першых вуснаў

Усім выпускнікам ВНУ гэтага года будуць прапанаваны першыя рабочыя месцы

Усім выпускнікам ВНУ гэтага года, незалежна ад формы навучання — бюджэтнай або платнай, будуць прапанаваны першыя рабочыя месцы. Аб гэтым паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Косінец.

Такая тактыка выбрана беларускімі ВНУ упершыню, і як адрэагуюць на гэтыя прапановы студэнты выпускных курсаў, пакажа час. Аднак ужо цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што колькасць заявак ад студэнтаў-платнікаў, якія хочуць атрымаць гарантаванае першае рабочае месца, з кожным годам усё больш павялічваецца. «Калі чалавек вучыўся ўсе пяць гадоў за свой кошт і вучыўся на «выдатна», то чаму б дзяржаве не прапанаваць яму першае рабочае месца», — сказаў Аляксандр Косінец.

Сёння працэс размеркавання выпускнікоў ідзе лёгка, падкрэсліў віцэ-прэм'ер, бо большасць студэнтаў разумеюць і ўсведамляюць выгаду, якую яны атрымліваюць пры размеркаванні. Акрамя таго, дзяржава затрацілa сродкі на падрыхтоўку пэўнага спецыяліста, а, значыць, выпускнік, які браў на сябе гэтыя абавязацельствы, проста абавязаны прыбыць да месца свайго размеркавання.

Аляксандр Косінец таксама паведаміў, што згодна з законам студэнты, якія вучыліся за свой кошт, могуць атрымаць накіраванне на першае рабочае месца толькі пасля таго, як будуць размеркаваны студэнты-бюджэтнікі. Але нават пры такім становішчы многія «платнікі» ўсё ж хочуць мець гарантыі першага рабочага месца, а не адпраўляцца ў «свабоднае плаванне».

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

БЕЛАГРОПРОМБАНК
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»
ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2006»

220036 г. Минск, пр-т Жукова, 3
Контакт-центр банка: 8-8011-00-8011(звонок бесплатный на территории РБ), (017) 218-57-77, 8-029-198-5-777(Velcom), 8-029-888-5-777(МТС), 8-025-918-5-777 (БеСТ)

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 АПРЕЛЯ 2007 ГОДА

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	79 096,7	65 819,1
3	Средства в Национальном банке	1102	2	102 537,4	144 859,3
4	Ценные бумаги:	1103		594 396,4	414 736,4
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.2	594 396,4	414 736,4
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	39 844,9	45 782,3
6	Кредиты клиентам	1106	5	4 787 166,3	2 886 470,9
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	1 391,2	641,2
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	227 256,2	175 823,8
9	Прочие активы	1109	8	64 051,8	58 776,3
10	**ИТОГО активы**	110		5 895 740,9	3 792 909,3
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	551 994,0	531 494,6
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	962 455,0	190 610,0
14	Средства клиентов	1206	11	2 399 831,0	1 651 629,8
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		40 199,1	34 709,1
16	Прочие обязательства	1209	12	77 700,7	84 647,9
17	**ВСЕГО обязательства**	120		4 032 179,8	2 493 091,4
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	1 578 635,0	1 106 617,7
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		22 442,6	22 442,6
22	Накопленная прибыль	1214	14	108 634,4	48 049,2
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	153 849,1	122 708,4
24	**ВСЕГО капитал**	121		1 863 561,1	1 299 817,9
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	12		5 895 740,9	3 792 909,3
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	4 009 825,6	1 804 227,0
28	Обязательства	1302	17	989 378,3	190 723,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ НА 1 АПРЕЛЯ 2007 ГОДА

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		143 532,2	76 676,3
2	Процентные расходы	2012		85 959,1	45 654,0
3	Чистые процентные доходы	201	18	57 573,1	31 022,3
4	Комиссионные доходы	2021		29 555,6	25 401,3
5	Комиссионные расходы	2022		1 744,3	1 648,3
6	Чистые комисионные доходы	202	19	27 811,3	23 753,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	2 104,0	4 993,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	(-866,7)	(-96,6)
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	20 453,2	2 338,0
11	Прочие доходы	207	23	4 104,3	2 560,1
12	Операционные расходы	208	24	54 569,0	42 322,1
13	Прочие расходы	209	25	1 418,6	726,7
14	Налог на прибыль	210		5 623,9	6 331,6
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ОТЧЕТНОГО ГОДА	2		8 661,3	10 514,0

Председатель Правления С.Н. Румас
Главный бухгалтер М.А. Шаповалова

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 2 от 27.10.2006 г.

БЕЛАРУСБАНК

21 апреля 2007 года
республиканский субботник!

В рамках президентской программы «Дети Беларуси»
средства, заработанные на субботнике,
будут перечислены на расчетные счета детских домов,
в помощь детям-сиротам и детям,
оставшимся без попечения родителей.

В ваших силах поддержать детей,
лишенных родительской помощи и защиты.

Денежные средства можно перечислить
в любом учреждении АСБ "Беларусбанк"
до 22 апреля 2007 года
на счета местных финансовых органов.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ N 1 от 27.10.2006.

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 20.04.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 144,00
1 еўра	2 912,62
1 латвійскі лат	4 139,40
1 літоўскі літ	843,58
1 чэшская крона	104,00
1 польскі злоты	763,19
1 расійскі рубель	83,21
1 украінская грыўня	426,50

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	25,7657
10 UAH	50,9163
1000 BYR	11,9952
EUR	34,9795

Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.04.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

СПАДЧЫНА

ГІСТОРЫЯ ЖЫВАЯ, КАЛІ ЯЕ

ПОМНІКІ ДАЛУЧАНЫ ДА ЖЫЦЦЯ

18 красавіка мы адзначылі Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных месцаў.

Больш за 100 мільярдаў беларускіх рублёў выдаткавана сёлета з дзяржбюджэту на рэканструкцыю гісторыка-культурных аб'ектаў. Пад увагай дзяржавы — аднаўленне Мірскага замка, рэстаўрацыя Нясвіжскага палаца, палаца Пацёмкіна ў Крычаве, цэркваў у Полацку і Сынкавічах.

Усяго ў Беларусі больш за 4700 аб'ектаў гісторыі і культуры, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Савет Міністраў вызначыў 50 аб'ектаў, да якіх будзе прыкавана ўвага дзяржаўных структур у бліжэйшыя гады. Але больш за 400 аб'ектаў у краіне рэканструюецца ўжо зараз. На 18 аб'ектах вядуцца працы за кошт рэспубліканскіх сродкаў, але яшчэ шэраг помнікаў аднаўляюцца дзякуючы абласным і мясцовым бюджэтам.

Можна пагадзіцца, што ўсё добра, і цалкам даверяць спецыялістам. Але час ад часу ў прэсе і на розных Інтэрнэт-сайтах з'яўляецца інфармацыя пра тое, што да планаў аднаўлення таго ці іншага гістарычнага аб'екта трэба было б прыгледзецца больш пільна. Адзін з такіх знаходзіцца ў Мінску, дзе ўвогуле адзінкі гістарычных будынкаў дажылі да нашага часу. У Верхнім горадзе па вуліцы Кірылы і Мяфодзія захаваўся будынак кляштара Бернардынцаў, помнік культуры XVII стагоддзя, да якога цяпер прыкавана ўвага грамадскасці.

Ліст, падпісаны архітэктарамі Сарайкіным і Навумікам, атрымала і наша рэдакцыя. У ім гаворыцца, што ёсць планы рэканструкцыі будынка былога кляштара, згодна з якімі ён будзе прыстасаваны пад гасцінічны комплекс з размяшчэннем паркінгу, шэрагу забаўляльных аб'ектаў. Гэтыя планы супярэчаць першапачатковаму прызначэнню былога манастыра, дзе людзі клапаціліся найперш пра духоўнае жыццё, а не пра забавы. Аўтараў непакоіць, што «вялізныя аб'ёмы зямельных прац пацягнуць за сабою вываз на сметнік у выглядзе будаўнічага смецця культурнага пласта, які фарміраваўся з часоў сярэднявечча, знішчэнне ўнікальнага дэкору будынкаў, што захаваўся да нашых дзён». Гэта «буйны помнік архітэктуры XVII стагоддзя гістарычнага цэнтра Мінска з багатай гісторыяй і ўнікальным культурным пластом», што павінна быць улічана пры распрацоўцы канцэпцыі яго аднаўлення.

Васіль Абламскі, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, быў здзіўлены чуткамі вакол рэканструкцыі былога манастыра, таму што пра нейкія планы і канцэпцыі пакуль размаўляць увогуле рана. Ён пракаментаваў сітуацыю так: «У студзені 2007 года ўпраўленне дало ўнітарнаму прадпрыемству «Мінскпраект» дазвол на правядзенне навукова-даследчых прац. Эскізных планаў мы яшчэ не бачылі. Калі яны з'явяцца, то будуць разгледжаны на пасяджэнні рады. Эксперты ацэняць ініцыятывы па аднаўленню і прыстасаванню аб'ектаў да сучасных умоў».

Ларыса ЦІМОШЫК.

«Вясёлка» святкуе юбілей

Учора ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі адбылося ўручэнне ўзнагарод аўтарам і сябрам дзіцячага беларускамоўнага часопіса, якому споўнілася 50 гадоў.

«Сімвалічна, што юбілей вашага часопіса супаў з Годам дзіцяці, які праводзіцца сёлета ў Беларусі, — адзначыў у вітальным слове юбілярам Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. — Гэта перыядычнае выданне для самых маленькіх чытачоў адыгрывае значную ролю ў выхаванні, навучанні дзяцей роднай мове і культуры».

Ганаровыя знакі, граматы, дыпломы ад міністэрстваў інфармацыі, адукацыі, культуры, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускага дзіцячага фонду былі ўчора ўручаны Міхасю Пазнякову, Паўлу Місько, Алене Лось, Васілю Макарэвічу, Івану Муравейку, Алесю Марціновічу, Віктару Гардзею і многім іншым пісьменнікам, мастакам, паэтам, а таксама супрацоўнікам рэдакцыі, кіраўнікам дзіцячых устаноў і нават чыноўнікам, якія падтрымліваюць часопіс, садзейнічаюць яго папулярызацыі.

— Мы ставім перад сабой тры галоўныя задачы — навучыць дзяцей любіць Беларусь, паважаць родную мову і тых дарослых людзей, якія цярпліва вядуць іх, трымаючы за ручкі, да дарослага жыцця, — сказаў на ўручэнні ўзнагарод Уладзімір Ліпскі, галоўны рэдактар «Вясёлкі».

Рэдакцыя часопіса ў сваю чаргу ўзнагародзіла медалём Васіля Віткі міністра інфармацыі Беларусі Уладзіміра Русакевіча за падтрымку і дапамогу ў справе выхавання маленькіх беларусаў.

За гады свайго існавання «Вясёлка» здолела згуртаваць вакол сябе лепшыя літаратурныя сілы, лепшых мастакоў і лепшых кампазітараў. Але самае галоўнае — з «Вясёлкі» выросла сучасная беларуская літаратура для дзяцей. Часопіс і сёння ўтрымлівае высокую планку якасці, з'яўляецца не толькі павучальнай, але і цікавай, любімай кніжкай для малых, першым іх падручнікам, першай энцыклапедыяй і слоўнікам, і канешне, сябрам. Свята «Вясёлкі» толькі пачынаецца — яно будзе доўжыцца ўвесь год. Сёння, 20 красавіка, а палове дванаццатай дня ў Доме літаратара ў Мінску адбудзецца канцэрт, дзе галоўнымі ўдзельнікамі будуць самі дзеці — тыя, дзеля каго часопіс існуе.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Кватэрнае пытанне

А Ў НАС У ДОМЕ ГАЗ... БУДЗЕ!

Мы жывём у вёсцы і вельмі хацелі б правесці ў свой дом газ. Напішыце, ці можна на гэтыя мэты ўзяць крэдыт на 10 гадоў пад 3 працэнты гадавых? Ці дадуць яго, напрыклад, пенсіянеру або сям'і з двух чалавек, дзе працуе толькі муж?

Н. МАТУКОЙЦЬ, *Астравецкі раён.*

Як патлумачыў член грамадскага аб'яднання «Веды» В.В. Савіцкі, указаныя крэдыты, паводле палажэння зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 лістапада 2006 года № 1554 і распрацаванага ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2006 года № 368, выдаюцца ва ўстаноўленым парадку грамадзянам, у тым ліку непрацаздольным (пенсіянерам і інш.), якія маюць патрэбу ў іх атрыманні. Спісы грамадзян, якія маюць патрэбу ў атрыманні такіх крэдытаў, зацвярджаюцца рашэннем райвыканкама (гарвыканкама) з выкананнем чарговасці ў адпаведнасці з датай звароту.

Ільготныя крэдыты выдаюцца грамадзянам ва ўстаноўленым парадку Ашчадным банкам «Беларусбанк» у памеры да 70 працэнтаў кошту работ згодна з пералікам затрат, які рыхтуецца (на падставе заявак гарвыканкамаў і райвыканкамаў) арганізацыяй, што забяспечвае газам. Максімальны тэрмін, на які выдаюцца такія крэдыты, не павінен перавышаць двух гадоў. Працэнтная стаўка за карыстанне льготнымі крэдытамі ўстаноўлена ў памеры 3 працэнтаў гадавых.

Канкрэтны памер ільготнага крэдыту вызначаецца пры заключэнні крэдытнага дагавора з уласнікам жылога памяшкання зыходзячы з велічыні яго даходаў і кошту работы згодна з пералікам затрат і дагаворам падраду на іх выкананне. Выдача льготных крэдытаў непрацаздольным грамадзянам ажыццяўляецца пры наяўнасці дагавораў паручыцельства па выкананню імі абавязацельстваў па гэтых крэдытах.

Што да льготных крэдытаў у памеры 90 працэнтаў кошту затрат на тэрмін да 10 гадоў і пад 3 працэнты гадавых, то яны выдаюцца ва ўстаноўленым парадку працаздольным грамадзянам (якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах да 20 тыс. чалавек) на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылых памяшканняў, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў (або на асобныя віды работ па капітальнаму рамонту і рэканструкцыі жылога памяшкання, будаўніцтву інжынерных сетак або толькі на ўзвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў).

Крымінал, здарэнні

У ЗАБОЙСТВЕ ДЗІЦЯЦІ ПРЫЗНАЎСЯ ЯГО БАЦЬКА

У Магілёве на Вялікдзень быў забіты хлопчык, якому не споўнілася яшчэ і 2,5 года. Бацька дзіцяці, яго бабуля і яе муж адзначалі свята, уся кампанія была моцна п'яная, і як загінула дзіця — нецвярозыя сваякі не здолелі растлумачыць. Аднак у гвалтоўнасці яго смерці не ўзнікла сумненняў: на целе былі знойдзены траўматычныя пашкоджанні.

Паводле інфармацыі з пракуратуры Кастрычніцкага раёна горада Магілёва, якая расследуе гэтую крымінальную справу, у забойстве прызнаўся 23-гадовы бацька хлопчыка. Дарослыя былі занятыя застоллем, а ныццё малога ім перашкаджала святкаваць. Бацька ўдарыў сына, і не адразу зразумеў, што зрабіў. Толькі потым, калі заўважылі, што дзіця ляжыць і не рухаецца, звярнуліся ў «хуткую дапамогу». Але позна: хлопчык быў нежывы. Лёс забойцы ўласнага сына вызначыць суд.

Ілона ІВАНОВА.

70-ГАДОВЫ «БІЗНЭСМЕН»

У адной з вёсак Мінскага раёна праваахоўнікамі выяўлены факт незаконнай скупкі лому каляровых металаў. Што цікава, незаконным бізнэсам займаўся 70-гадовы мясцовы жыхар. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у гаражы пенсіянера было знойдзена і канфіскавана 11 тон 830 кілаграмаў лому алюмінію.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРАТЭРМІНАВАНАЕ МАРОЖАНАЕ

У Брэсце кампетэнтнымі органамі спынена дзейнасць прадпрыемства, што каля паўгода «карміла» спажыўцоў прадуктам, на які скончыўся тэрмін спажывання.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Ленінскага РАУС сумесна з аддзелам аховы і падаткавікамі ўстаноўлена, што адно з унітарных прыватных гандлёвых прадпрыемстваў з кастрычніка мінулага года займалася вытворчасцю вафельнай прадукцыі, не маючы на гэта ліцэнзіі. Больш за тое, сыравіна, што выкарыстоўвалася пры вытворчасці, была пратэрмінаванай. Між іншым, прадукцыя потым пастаўлялася на два прадпрыемствы, якія вырабляюць марожанае. На плошчах, што арандавала прадпрыемства, знойдзена і канфіскавана 4416 кілаграмаў сыравіны на суму больш за 26 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

НАРАБАВАНАЕ КАНФІСКАВАНА

Узброены нажом рабаўнік завалодаў выручкай магазіна ў вёсцы Альшаны, што ў Столінскім раёне.

Каля чатырох гадзін дня невядомы злачынца зайшоў у вясковы магазін і пад пагрозай халоднай зброі завалодаў 730 тысячамі рублёў. Пасля таго, як прадавец паведаміла аб здарэнні ў міліцыю, праваахоўнікі выйшлі на след падазронага. Затрыманы мясцовы непрацуючы жыхар, раней судзімы за крадзеж, у якога канфіскавана выкрадзенае.

Аляксей ЦІТОЎ.

НЕЛЕГАЛЫ КРАЛІСЯ. ЦЭЛЫМ АТРАДАМ

Іх было дваццаць сем чалавек. З Афганістана, Ірака і Бангладэш, у тым ліку і пяць жанчын.

Жаданне было адно: перайсці беларуска-ўкраінскую мяжу, а там ужо і да Захаду недалёка. Ды вось няўдача: Гомельскі пагранічны атрад паўстаў на іх шляху і затрымаў. У пастку, што здараецца рэдка, трапілі і чатыры праваднікі нелегалаў — два з Расіі і два з Украіны. Развязка вядомая: праваднікі будуць прыцягнуты да адказнасці па беларускіх законах, а нелегалаў адправяць у Расію, адкуль яны і прыехалі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Конкурс
Твор на вынас

Аўтарам новага ўваходнага білета ў Нацыянальны мастацкі музей стаў дызайнер Дзмітрый Мурашоў.

Журы спыніла выбар на адным з яго варыянтаў, таму што ён працягвае тэматыку мінулых білетаў, захоўваючы карпаратыўныя колеры музея і яго партнёраў. Пераможца конкурсу на ўваходны білет атрымае 500 тысяч беларускіх рублёў прызавых. 100 тысяч заслужыла студэнтка хімфака БДУ Ніна Пятроўская — яе праект выклікаў сімпатыі гледачоў, якія прагаласавалі за яго. Аб конкурсе Ніна даведалася з Інтэрнэта і вырашыла паспрабаваць сябе. Трэці конкурс быў адметны тым, што ўдзел у ім узялі не толькі жыхары Беларусі: былі варыянты з-за мяжы, у прыватнасці з Германіі. Журы тым часам адзначыла, што мастацкі ўзровень прац, якія прапануюцца да разгляду, становіцца больш высокім год ад году.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку міністра Слабадчуку Аляксандру Іванавічу і яго сям'і з прычыны вялікага гора — смерці бацькі жонкі.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС РЕСПУБЛИКАНСКОГО УНИТАРНОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «БЕЛОРУССКАЯ НАЦИОНАЛЬНАЯ ПЕРЕСТРАХОВОЧНАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ» ЗА 2006 ГОД

220039 г. Минск, ул. Чкалова, 14, тел. 2560711

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
Основные средства	13,3	Источники собственных средств — всего	54658,5
Нематериальные активы	0,3	В том числе: уставный фонд	54340,8
Финансовые вложения — всего	-	резервный фонд	-
В том числе: инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	13,3
облигации и другие долговые обязательства	-	фонд накопления	-
прочие финансовые вложения	-	фонд потребления	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	-	целевое финансирование	-
Дебиторы — всего	5,6	нераспределенная прибыль прошлых лет	-
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	-	нераспределенная прибыль отчетного года	304,4
		Страховые резервы и фонды – всего	20,7
		В том числе: страховые резервы	20,7
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	-
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	5,6	гарантийные фонды	-
		Кредиторы – всего	157,3
Прочие активы – всего	54896,5	В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	-
В том числе: незавершенное строительство	-	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
материальные ценности и затраты	11,4	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
денежные средства	54885,1	заемные средства	-
собственные акции (доли)	-	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	157,3
прочие активы	-	Прочие пассивы	79,2
Непокрытые убытки прошлых лет	-		
Непокрытые убытки отчетного года	-		
БАЛАНС	54915,7	БАЛАНС	54915,7

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОГО УНИТАРНОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «БЕЛОРУССКАЯ НАЦИОНАЛЬНАЯ ПЕРЕСТРАХОВОЧНАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ» ЗА 2006 ГОД

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
1. Страхование жизни. Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
2. Страхование иное, чем страхование жизни. Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	23,5
Изменение резерва незаработанной премии – нетто-перестрахование (+ или -)	067	-18,5
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто-перестрахование	082	-
Изменение резервов убытков – нетто-перестрахование (+ или -)	092	-2,2
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	-
Расходы на ведение дела	120	38,7
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	-
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	1,3
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	-37,2
3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2 Операционные доходы	140	659,9
Операционные расходы	145	-
Внереализационные доходы	150	-
Внереализационные расходы	155	4,0
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	304,4

Итоговая часть аудиторского заключения

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность республиканского унитарного предприятия «Белорусская национальная перестраховочная организация» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 год.

Директор «Промаудит» А.В. Анисович

МТС — АГРАГАРАДКАМ

«ЗАЛАТАЯ» ПРАЦА ТАРГУНОЎЦАЎ

У Докшыцкім раёне, куды завітала наша пастаянная рубрыка «МТС — аграгарадкам», каб расказаць чытачам, як аграгарадкі будуюцца і як яны «мабілізуюцца» кампаніяй МТС, павінны адкрыцца 12 сучасных пасёлкаў. Аграгарадкі немагчыма ўявіць без надзейнай сотавай сувязі, што забяспечвае вядучы аператар мабільных паслуг у нашай краіне — МТС.

Людзі, дзе б яны ні жылі, ведаюць, што МТС — гэта якасць і даступнасць. У гэтым упэўніліся і жыхары прыгожага Докшыцкага краю. Ад Докшыц, 600-гадовы юбілей якіх адсвяткуюць сёлета ў верасні, да Мінска нават бліжэй, чым да абласнога цэнтра — усяго 130 кіламетраў. І ў сезон водпускаў сюды з задавальненнем прыязджае шмат гараджан, у тым ліку і з-за мяжы. Ім ёсць што ўбачыць на свае вочы, чаму здзівіцца. Больш за 40 працэнтаў плошчы Докшыцкага раёна займаюць лясы. У краі знаходзяцца частка Бярэзінскага біясфернага запаведніка, рэспубліканскія гідралагічныя заказнікі... І для рыбакоў гэта месца запаведнае: 11 азёр з мноствам рыбы. Дарэчы, менавіта па тэрыторыі раёна праходзіць водападзел паміж Балтыйскім і Чорным морамі. А якое ўражанне пакідае стары дуб у вёсцы Сітцы, якому больш за 450 гадоў!

Усяго ў Докшыцкім раёне 276 населеных пунктаў. Пазалетась цэнтральная сядзіба СВК «Таргуны» стала першым аграгарадком у краі. «Таргуны» ўваходзяць у спіс самых моцных у эканамічным плане ў Беларусі так званых базавых гаспадарак. Больш за 30 гадоў яе ўзначальвае Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Новікаў **(на фота)**. Ён і яго падначаленыя, а ў калектыве больш за 530 чалавек, працуюць старанна. І, безумоўна, быць заўсёды на мабільнай сувязі такім працавітым людзям неабходна, каб вырашаць самыя розныя рабочыя пытанні.

Кіраўнік СВК «Таргуны» Уладзімір НОВІКАЎ — Герой Сацыялістычнай Працы.

Летась рэнтабельнасць у СВК «Таргуны» склала 17,7 працэнта, атрымалі прыбытак больш за 1,8 мільярда рублёў. Безумоўна, адзначаюць працаўнікі, без дзяржаўнай падтрымкі такіх поспехаў не дабіліся б. І заробак тут адпаведны. Напрыклад, механізатары, якія працуюць на сучасных пасяўных агрэгатах замежнай вытворчасці, падчас сяўбы могуць зарабіць больш за 1,5 мільёна рублёў. Добрыя грошы атрымліваюць даяркі. Ад каровы тут надойваюць у сярэднім больш за 5460 кілаграмаў у год, і амаль усё яно вышэйшай якасці. Высакаякасных кармоў заўсёды хапае. У «Таргунах» укараняюцца самыя перадавыя тэхналогіі. Займаюцца тут элітным насеннем, выкарыстоўваюць «ноў-хау» пры вырошчванні кукурузы і шматгадовых траў... Цяжка падлічыць, колькі разоў адзначалася «залатая» праца «таргуноўцаў».

У аграгарадку Таргуны цяпер жыць вельмі зручна. З раённага цэнтра да вяскоўцаў прыязджаюць адвакат, натарыус... На месцы дзейнічае сучасная «бытоўка», працуюць прыгожа афармленыя крамы, адрамантаваны Дом культуры. Юныя жыхары ходзяць ва ўтульную школу. Заўсёды пракансультуюць і паправяць здароўе ў фельчарска-акушэрскім пункце. У «сусветнае павуцінне» можна выйсці з бібліятэкі і аддзялення сувязі.

Дарэчы, на пошце, як і ў іншых аграгарадках, мясцовыя жыхары не толькі аплочваюць розныя паслугі, атрымліваюць грошы, выпісваюць газеты, але і падключаюцца да МТС. Нікуды для гэтага ехаць не трэба!

Сотавай сувяззю МТС на Віцебшчыне ахоплена каля 80 аграгарадкоў. Спецыялісты МТС устанаўліваюць новыя базавыя станцыі, якіх у Прыдзвінскім краі налічваецца ўжо за 200. У Віцебску працуе камутатар МТС ёмістасцю 750 тысяч нумароў. Такім чынам, зроблены важныя крокі да павышэння якасці сувязі і надзейнасці злучэння абанен-таў.

Вядучы рубрыкі Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БАСО

Бухгалтерский баланс ЗАСО «БАСО» за 2006 год

220020 г. Минск, ул. Пионерская, 2а, тел.: (017) 250-39-84

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	607,7	Источники собственных средств — всего	656,4
Нематериальные активы	1,5	В том числе:	
Финансовые вложения — всего	-	уставный фонд	155,6
В том числе:	-	резервный фонд	30,5
инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	410,3
инвестиции в другие организации	-	фонд накопления	60,0
облигации и другие долговые обязательства	-	фонд потребления	-
прочие финансовые вложения	-	целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	194,8	нераспределенная прибыль прошлых лет	-
Дебиторы — всего	127,4	нераспределенная прибыль отчетного года	-
В том числе:		Страховые резервы и фонды — всего	2433,6
дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	28,0	В том числе: страховые резервы	2414,5
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	19,1
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	гарантийные фонды	-
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	99,4	Кредиторы — всего	67,4
Прочие активы — всего	2672,6	В том числе:	
В том числе:		кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	0,2
незавершенное строительство	-	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	19,4
материальные ценности и затраты	147,2	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
денежные средства	2502,0	заемные средства	21,4
собственные акции (доли)	23,4	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	26,4
прочие активы	-	Прочие пассивы	708,2
Непокрытые убытки прошлых лет	-		
Непокрытые убытки отчетного года	261,6		
БАЛАНС	3865,6	БАЛАНС	3865,6

Отчет о финансовых результатах ЗАСО «БАСО» за 2006 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
II. Страхование иное, чем страхование жизни Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	1437,7
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-246,8
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	468,4
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	-592,4
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	12,4
Расходы на ведение дела	120	493,3
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	45,9
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	80,2
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	-409,9
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II Операционные доходы	140	109,4
Операционные расходы	145	14,2
Внереализационные доходы	150	373,0
Внереализационные расходы	155	225,0
Использовано прибыли	156	94,9
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	-261,6

По данной отчетности составлено условно положительное аудиторское заключение.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «БАСО» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 г. и результата финансово-хозяйственной деятельности за 2006 г.

БЕЛВНЕШСТРАХ BELVNESHSTRAKH

Унитарное страховое предприятие Unitary Insurance Company

E-mail: belvs@nsys.by тел.: 209-24-16 факс: 209-25-65

Годовой баланс за 2006 год УСП «Белвнешстрах» ОАО «Белвнешэкономбанк»

г. Минск, ул. Скрыганова, 6 *млн. рублей*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**138,1**	**Источники собственных средств, всего**	**184,8**
Нематериальные активы	**4,5**		
Финансовые вложения, всего	**271,9**	в том числе: уставный фонд	3,1
в том числе: инвестиции в дочерние общества		резервный фонд	52,1
инвестиции в другие организации	271,9	добавочный фонд	-13,5
облигации и другие долговые обязательства		фонд накопления	143,1
прочие финансовые вложения		фонд потребления	
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**162,2**	целевое финансирование	
		нераспределенная прибыль прошлых лет	
Дебиторы, всего	**74,5**	нераспределенная прибыль отчетного года	
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	42,5	**Страховые резервы и фонды, всего**	**1685,2**
		в том числе: страховые резервы	1600,8
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	84,4
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	32,0	гарантийные фонды	
		Кредиторы, всего	**67,0**
Прочие активы, всего	**2231,7**	в том числе:	
в том числе: незавершенное строительство		кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	29,2
материальные ценности и затраты	43,0	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	17,7
денежные средства	2188,7	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	
собственные акции (доли)		заемные средства	
прочие активы		кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	20,1
Непокрытые убытки прошлых лет		**Прочие пассивы**	**1436,3**
Непокрытые убытки отчетного года	**490,4**		
БАЛАНС	**3373,3**	**БАЛАНС**	**3373,3**

Отчет о финансовых результатах за 2006 год УСП «Белвнешстрах» ОАО «Белвнешэкономбанк»

г. Минск, ул. Скрыганова, 6 *млн. рублей*

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	010	
Страховые выплаты	020	
Изменение резерва по страхованию жизни, (+ или -)	030	
Отчисления в гарантийный фонд	040	
Расходы на ведение дела	041	
Результат от операций по страхованию жизни, (+ или -)	050	
II. Страхование иное, чем страхование жизни Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	3502,9
Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование, (+ или -)	067	-218,8
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	082	2328,5
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование, (+ или -)	092	-73,7
Изменение других технических резервов, (+ или -)	100	
Изменение иных страховых резервов, (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	38,1
Расходы на ведение дела	120	1533,3
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	64,8
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	9,5
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни, (+ или -)	130	-634,2
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	199,6
Операционные расходы	145	23,1
Внереализационные доходы	150	348,9
Внереализационные расходы	155	140,6
Финансовый результат	157	-249,4
Использовано прибыли	158	241,0
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода, (+или -)	170	-490,4

Прилагаемая к настоящему аудиторскому заключению бухгалтерская (финансовая) отчетность за 2006 год достоверна, т.е. подготовлена таким образом, чтобы обеспечить во всех существенных аспектах отражение активов и пассивов УСП «Белвнешстрах» на 1 января 2007 года и финансовых результатов его деятельности за 2006 год.

Аудитор — индивидуальный предприниматель Ткач С.И. Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя от 24 августа 2000 года № 955 выдано Минским горисполкомом. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0055589 от 3 февраля 2004 года выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

20

КРАСАВІКА
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 16 (15467)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ — ІНФАРМАЦЫЯ

навіны аб ходзе прыёму дакументаў будуць абнаўляцца кожныя тры гадзіны

Будучая прыёмная кампанія павінна прайсці на самым высокім арганізацыйным узроўні. І да работы ў прыёмных камісіях павінны прыцягвацца толькі прафесійна і псіхалагічна падрыхтаваныя спецыялісты. Падбор і расстаноўка кадраў у прыёмных камісіях — вельмі важны момант будучай уступнай кампаніі. Аб гэтым на нарадзе адказных сакратароў прыёмных камісій заявіў *першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК.*

Аляксандр Жук падкрэсліў, што база для стабільнай арганізацыі прыёмнай кампаніі была закладзена год таму. А па выніках мінулагодняй кампаніі кіраўніком дзяржавы было прынята рашэнне не ўносіць у Правілы прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ніякіх змяненняў. Аднак ёсць шэраг рабочых момантаў, на якія трэба звярнуць увагу. Для прыкладу, будучым летам 43 з 53 ВНУ будуць ажыццяўляць прыём толькі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання, за выключэннем філалагічных, творчых і спартыўных спецыяльнасцяў, а таксама прыёму на скарочаныя тэрміны навучання. Такім чынам асноўная нагрузка прыёмнай кампаніі зменшыцца на цэнтралізаванае тэсціраванне.

— Але не ўсе кіраўнікі навучальных устаноў разумеюць да канца, што ўступная кампанія — справа не толькі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Гэта агульная справа. Частка ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў вызначаны ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і павінны забяспечыць адпаведныя ўмовы для абітурыентаў. Летась дзяржаўная камісія па кантролю за ходам уступных іспытаў звяртала ўвагу ў сваёй справаздачы кіраўніку дзяржавы на недастатковую дакладную арганізацыю ЦТ у некаторых ВНУ і стварэнне недастаткова камфортных умоў для тэсціруемых: дзесьці не хапала святла, дзесьці было вельмі спякотна. Быў нават выпадак, калі пад правядзенне цэнтралізаванага тэсціравання была задзейнічана кіназала. Гэта, звяртаю ўвагу, не павінна паўтарыцца. Ёсць міністэрскі загад, згодна з якім кіраўнікі навучальных устаноў, якія вызначаны пунктамі правядзення ЦТ, павінны стварыць камісію і правесці да 2 чэрвеня атэстацыю аўдыторый, дзе будзе праходзіць цэнтралізаваны тэст-экзамен, на іх адпаведнасць патрабаванням, вызначаным Палажэннем аб арганізацыі цэнтралізаванага тэсціравання. Хачу заўважыць, што на навучальныя ўстановы ў Маладзечне, Салігорску і Барысаве кладзецца нават большая нагрузка, чым на сталічныя пункты правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

Начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Юрый Міксюк засяродзіў увагу адказных сакратароў на некалькіх важных момантах.

— Як сведчыць леташні вопыт, абітурыенты аддаюць пры паступленні перавагу тым ВНУ, дзе залічэнне ажыццяўляецца толькі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Таму ВНУ, якія збіраюцца праводзіць свой унутрывузаўскі экзамен, павінны правесці маштабную прафарыентацыйную работу, каб знайсці «свайго» абітурыента і пераканаць яго паступаць менавіта да іх, — папярэдзіў Юрый Міксюк. Інакш яны рызыкуюць застацца ўвогуле без конкурсу. Не кожны вырашыцца здаваць экзамен у ВНУ, тым больш, што маючы на руках тры сертыфікаты, можна выбіраць ВНУ ці спецыяльнасць, дзе шанцы быць залічаным істотна ўзрастаюць.

Шмат праблем узнікае з так званымі «льготнікамі», калі яны канцэнтруюцца на нейкай адной спецыяльнасці. Каб папярэдзіць магчымыя канфлікты, члены прыёмных камісій павінны праводзіць з імі тлумачальную работу, дапамагчы зарыентавацца, даць параду, куды лепш падаць свае дакументы.

Паводле слоў Юрыя Міксюка, даволі вялікая колькасць скаргаў абітурыентаў і іх бацькоў былі выкліканы недаступнасцю патрэбнай інфармацыі ці несвоечасовым інфармаваннем. Ва ўмовах вельмі высокага конкурсу, асабліва калі за наплыву розных катэгорый ільготнікаў для звычайных абітурыентаў месцаў увогуле не застаецца, любая інфармацыя аб ходзе прыёму заяў — для маладых людзей надзвычай каштоўная. Абітурыенты павінны ажыццяўляць свядомы выбар, заснаваны на максімальна поўнай інфармацыі. На жаль, летась былі выпадкі, калі прыёмныя камісіі свядома затрымлівалі інфармацыю, каб захаваць дастаткова высокія конкурсы. Каб папярэдзіць у будучыні падобныя праблемы, Міністэрства адукацыі распрацавала адзіную для ўсіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў форму прадастаўлення інфармацыі аб ходзе прыёму дакументаў. У адпаведным міністэрскім загадзе прапісана перыядычнасць, а таксама спосабы інфармавання. У прыватнасці, прыёмныя камісіі абавязаны будуць інфармаваць абітурыентаў на сайтах навучальных устаноў у Інтэрнэце, на папяровых носьбітах, а таксама калі ёсць такая магчымасць — на электронных табло і абнаўляць інфармацыю не радзей чым адзін раз у тры гадзіны. Можна, зразумела, і часцей. Тры гадзіны — гэта максімальны тэрмін. Апошні дзень прыёму дакументаў у ВНУ другога патоку (29 ліпеня) асабліва адказны. Маючы на руках тры сертыфікаты, абітурыенты бегаюць паміж ВНУ літаральна да апошняга моманту. У 18 гадзін прыём дакументаў павінен завяршыцца, але пасля 18 гадзін перад прыёмнымі камісіямі выстройваюцца чэргі з дзесяткаў і нават сотняў прэтэндэнтаў на залічэнне. І што з імі рабіць? Якім прынцыпам кіравацца: магазінным ці банкаўскім? У магазіне пакупнік мае права за хвіліну да яго закрыцця зайсці ў гандлёвую залу і правесці там роўна столькі часу, колькі яму спатрэбіцца для ажыццяўлення пакупкі. А ў банках перад кліентамі зачыняюць акенца, пасля чаго дзверы ўстановы працуюць толькі на выхад.

— Ва ўсіх ВНУ павінна быць агульная пазіцыя па гэтаму пытанню, — звярнуўся да членаў нарады **адказны сакратар Дзяржаўнай камісіі па кантролю за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў Валерый Аўсянікаў.** — У тым ліку і ў прыватных ВНУ, якія любым спосабам імкнуцца прыцягнуць да сябе абітурыентаў.

Трэба заўважыць, што меркаванні членаў нарады падзяліліся. Многія выказваліся за тое, каб спыняць у 18 гадзін прыём дакументаў. Маўляў, колькі б часу ні было дадзена абітурыентам, але тыя ўсё роўна будуць браць «штурмам» прыёмныя камісіі ў апошні дзень, асабліва калі інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў пастаянна змяняецца, як змяняецца і сітуацыя з конкурсам. Летась быў выпадак, калі ў адной ВНУ прыёмная камісія працягвала працаваць у 12 гадзін ночы. Але ўсе кропкі над «і» расставіў Аляксандр Жук.

Фота Пятра ФАМІНА.

— Мы ўсё ж такі арыентуем вас на закрыццё дзвярэй, але прыёмныя камісіі павінны працаваць і пасля 18 гадзін, пакуль апошні абітурыент не падасць свае дакументы, — падкрэсліў ён, — інакш нам не пазбегнуць сацыяльнага выбуху. Па майму асабістаму меркаванню, вельмі многае ў гэтым пытанні будзе залежаць ад членаў прыёмнай камісіі. Ад таго, наколькі актыўна яны будуць весці тлумачальную работу з абітурыентамі. Абнаўляйце інфармацыю ў апошні дзень часцей. Пасадзіце на прыём дакументаў больш людзей. Падрыхтуйце рэзервовыя кадры, каб пасля 18 гадзін хуценька ліквідаваць чаргу. Гэта ўсё пытанні граматнай арганізацыі работы прыёмнай камісіі, яе праблемы, але ні ў якім разе не праблемы абітурыентаў.

Яшчэ адзін востры момант — гэта залічэнне на вучобу на ўмовах аплаты. Тэрмін падачы дакументаў у ВНУ другога патоку і на бюджэтную, і на платную форму навучання завяршаецца 29 ліпеня, і далейшае перасоўванне дакументаў можа быць толькі для асобаў, якія не прайшлі па конкурсу на бюджэтныя месцы. Ім прадастаўляецца права быць залічанымі на платную форму навучання або паспрабаваць са сваімі дакументамі паступіць у прыватную навучальную ўстанову пры ўмове супадзення ўступных іспытаў. Але абітурыент абавязкова павінен удзельнічаць у конкурсе. Тыя маладыя людзі, якія першапачаткова зарыентаваныя на платнае навучанне, усё роўна павінны падаваць дакументы да 29 ліпеня і ўдзельнічаць у агульным конкурсе. І прыёмныя камісіі павінны давесці інфармацыю аб тэрмінах і парадку заключэння дагавораў на навучанне на ўмовах аплаты да кожнага абітурыента, каб не было пакрыўджаных. У членаў прыёмных камісій летась узнікалі праблемы з трактаваннем некаторых палажэнняў Правілаў прыёму, у прыватнасці, які дакумент аб адукацыі прымаць у маладых людзей, якія закончылі сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову: атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі ці дыплом ССНУ.

— На маю думку, гэта адназначна павінен быць школьны атэстат, — падзяліўся сваім меркаваннем Валерый Аўсянікаў. — Калі абітурыент паступае нароўні з выпускнікамі сярэдніх школ на першы курс, значыць усе павінны быць у аднолькавых умовах. І гэты конкурс павінен быць празрыстым і справядлівым. А калі абітурыент паступае пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы на скарочаныя тэрміны навучання, там ён нароўні канкурыруе з іншымі выпускнікамі ССНУ, вось там і трэба браць пад увагу аднакі ў дыпломе аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Я ўвогуле хацеў бы папрасіць усіх членаў прыёмных камісій вельмі адказна ставіцца да любых кансультацый, якія яны даюць абітурыентам і іх бацькам. Вывучыце літаральна кожны радок Правілаў прыёму. Ад дакладнасці прадастаўленай інфармацыі нярэдка можа залежыць лёс канкрэтнага чалавека. Памятайце аб гэтым. Нельга даваць некваліфікаваныя тлумачэнні. Я хачу таксама папярэдзіць кіраўнікоў тых ВНУ, якія збіраюцца праводзіць свой унутрывузаўскі экзамен — рыхтуйцеся да рэзервовых экзаменацыйных камісій, у тым ліку і на творчых спецыяльнасцях. Майце на ўвазе, што вузаўскі экзамен нельга праводзіць у тэставай форме ці спалучаць уступныя іспыты з элементамі тэсціравання. Чытайце Правілы прыёму, дзе дакладна запісана, што тэсціраванне можа праводзіць толькі Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Вузаўскі экзамен можа праходзіць у вуснай ці пісьмовай форме або ў некалькі этапаў. Але толькі не ў тэставай форме.

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў праінфармаваў аб тым, што цэнтралізаванае тэсціраванне пройдзе сёлета ў больш сціслыя тэрміны і завяршыцца раней. Рэзервовы дзень для тых абітурыентаў, якія па ўважлівай прычыне прапусцілі цэнтралізаваны тэст-экзамен, таксама перанесены на больш ранні тэрмін — 4 ліпеня. Гэта дасць магчымасць абітурыентам, якія ўдзельнічаюць у ЦТ у рэзервовы дзень, падаць свае дакументы ў ВНУ першага патоку. Летась такой магчымасці ў іх не было. Сёння ў інстытуце працуюць над новым праграмным забеспячэннем, каб яго сайт змог справіцца з любой нагрузкай. У мінулым годзе за адну гадзіну рэгістравалася да 20 тысяч зваротаў, у выніку чаго сайт «завісаў». Аператыўна атрымаць інфармацыю аб выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання можна будзе некалькімі спосабамі: на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, на сайце пункта правядзення тэсціравання, а таксама па мабільнаму тэлефону, заключыўшы дагавор з аператарам мабільнай сувязі.

Самыя гарачыя спрэчкі паміж абітурыентамі і арганізатарамі цэнтралізаванага тэсціравання правакуе штогод выкарыстанне калькулятараў.

— У Расіі, дарэчы, аналагічныя праблемы, — падзяліўся набалелым Мікалай Фяськоў. — Сучасныя тэхналогіі дазваляюць у прыстасаванне, памерам з мініяцюрны калькулятар, запісаць шпаргалку памерам з энцыклапедыю, усе формулы па хіміі і фізіцы. І нам вельмі складана дыферэнцыраваць такія тэхнічныя сродкі па аб'ёму памяці і вылічальных аперацыях. На тэсціраванні па матэматыцы выкарыстанне калькулятараў катэгарычна забараняецца. На хіміі і фізіцы мы не можам іх забараніць, таму што ў гэтым выпадку давядзецца спрашчаць змест тэстаў, адпаведна зменшыцца іх дыферэнцыруючая здольнасць. Таму ў аўдыторыю, дзе будзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, можна будзе пранесці толькі калькулятар з расцейшымі функцыямі, які нельга выкарыстоўваць для захоўвання, перадачы і прыёму інфармацыі. Менавіта, калькулятар, а не электронную запісную кніжку ці міні-камп'ютар. Пры ўваходзе ў аўдыторыю гэта праблематычна вызначыць, але падчас тэсціравання заўважыць можна. «Вынаходлівыя» ўдзельнікі тэсціравання будуць выдаляцца з аўдыторыі і пазбаўляцца права пераздаць цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэзервовы дзень. Лепшым выйсцем з гэтай сітуацыі была б закупка прасцейшых калькулятараў ВНУ. Іх можна было б выкарыстоўваць некалькі гадоў запар і канфліктныя сітуацыі можна было б папярэдзіць. З улікам прапаноў дзяржаўнай камісіі, у гэтым годзе будзе дзейнічаць іншы падыход пры пераводзе балаў са стобальнай тэставай шкалы ў дзесяцібальную сістэму ацэнкі. Атрыманыя балы будуць аўтаматычна дзяліцца на 10. Скажам, абітурыент набраў на тэсціраванні 75 тэставых балаў — па дзесяцібальнай шкале гэта будзе 7,5 бала, 43 балы — 4,3, 59 балаў — 5,9 бала і гэтак далей. Мінімальны прахадны тэставы бал па ўсіх дысцыплінах — 15 балаў. У вышэйшых навучальных установах, якія не праводзяць уласных іспытаў, залічэнне будзе весціся па 100-бальнай сістэме.

Узнімалася на нарадзе таксама яшчэ адно важнае пытанне — арганізацыя ўступных іспытаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

— Нельга прымушаць іх праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, — папярэдзіў Юрый Міксюк. — Форма ўступных іспытаў павінна адпавядаць фізічным магчымасцям гэтых людзей. Іх зусім мала, і ім трэба ісці насустрач. Па кожнай дысцыпліне ўступных іспытаў у навучальнай установе павінна быць створана экзаменацыйная камісія. Галоўнае, каб хвароба не была перашкодай для вучобы і далейшага працаўладкавання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МАТЭРЫЯЛЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ТЭСЦІРАВАННЯ — НА CD

Сёння «Звязда» з дапамогай спецыялістаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў працягвае адказваць на пытанні, якія найбольш часта задаюць абітурыенты.

— Падкажыце, калі ласка, ці будзе ў абітурыентаў магчымасць напярэдадні цэнтралізаванага тэсціравання яшчэ раз паўдзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні?

У сувязі са шматлікімі просьбамі маладых людзей было прынята рашэнне падоўжыць трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання. Абітурыенты, якія па нейкіх прычынах не змаглі прыняць удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні ў сакавіку—красавіку, змогуць зрабіць гэта ў маі на базе наступных навучальных устаноў:

Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі: г. Мінск, вул. П.Броўкі, 4, тэл. 8 (017) 293-86-49, 293-80-40;

Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы: г. Гродна, вул. Кастрычніцкая, 5, тэл. 8 (0152) 73-03-14;

Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.Сухога: г. Гомель, вул. Кастрычніка, 48, тэл. 8 (0232) 47-52-74;

Беларуска-Расійскага ўніверсітэта: г. Магілёў, пр-т Міру, 43, тэл. 8 (0222) 25-36-03;

Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта: г. Віцебск, пр-т Маскоўскі, 72, тэл. 8 (0212) 47-72-34;

Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта: г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, тэл. 8 (0162) 42-04-92, 42-70-11.

— Пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове я сутыкнулася з праблемай напісання некаторых слоў. Напрыклад, у розных зборніках прыводзяцца розныя варыянты напісання такіх слоў як «экзэмпляр», «бізнэс» ці «ёгурт». На якую літаратуру трэба арыентавацца? І ці многа было летась на ЦТ па беларускай мове вышэйшых адзнак?

Калі ў розных крыніцах напісанне адных і тых жа слоў дазваляецца па-рознаму, то ў тэставыя заданні на правапіс такія словы не ўключаюцца. Лепш за ўсё пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання карыстацца акадэмічнымі слоўнікамі беларускай мовы.

Самым лепшым вынікам на ЦТ па беларускай мове аказаўся летась вынік у 98 тэставых балаў — іх набралі толькі 2 чалавекі з больш чым 75 тысяч удзельнікаў. На 97 балах «спыніліся» 3 абітурыенты, 10 чалавек набралі 96 тэставых балаў, 11 чалавек — 95 балаў, 21 чалавек — 94 балы і 25 чалавек — 93 балы.

— Хацелася б даведацца, ці ўносіліся нейкія змяненні ў праграмы ўступных іспытаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы на гэты год?

Сапраўды, некаторыя змяненні ў праграмы ўступных іспытаў уносіліся. Новыя праграмы можна знайсці ў даведніку для абітурыентаў вышэйшых навучальных устаноў, які быў падрыхтаваны выдавецтвам «Вышэйшая школа».

— Я збіраюся паступаць на філалагічны факультэт. І трэці экзамен (літаратуру) буду здаваць непасрэдна ў ВНУ. Ці магу я здаць на ўсякі выпадак яшчэ і цэнтралізаванае тэсціраванне па матэматыцы для таго, каб калі не пашанцуе ў ВНУ, можна было падаць дакументы ў сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову?

Абітурыенты ВНУ маюць права здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па трох дысцыплінах. Таму запасціся сертыфікатам па матэматыцы вы зможаце.

— Растлумачце, як вылічваецца сярэдні бал дакумента аб адукацыі? У маім школьным атэстаце замест адзнакі па фізкультуры стаіць залік...

— Сярэдні бал вылічваецца па 10-бальнай шкале з дакладнасцю да сотых, якія затым акругляюцца да дзесятых. Для прыкладу, 6,79 бала — гэта 6,8 бала, а 6,72 — гэта 6,7 бала. Калі аднакі ў дакументе аб адукацыі выстаўляліся па 5-бальнай шкале, то сярэдні бал будзе пераводзіцца ў 10-бальную сістэму. А калі ўсе ўступныя іспыты праводзяцца ў форме цэнтралізаванага тэсціравання, то для прывядзення ўсіх адзнак у адну сістэму сярэдні бал атэстата будзе пераводзіцца ў 100-бальную шкалу шляхам памнажэння на 10.

У некаторых выпускнікоў, якія па стану здароўя былі вызвалены ад заняткаў фізкультурай, у атэстаце замест адзнакі стаіць залік. У гэтым выпадку сума балаў будзе дзяліцца не на агульную колькасць прадметаў, а на колькасць прадметаў, па якіх маецца адзнака.

Перавод сярэдняга бала дакумента аб адукацыі з пяцібальнай у дзесяцібальную сістэму:

3,0 — 3,0 4,0 — 6,5
3,1 — 3,4 4,1 — 6,9
3,2 — 3,7 4,2 — 7,2
3,3 — 4,0 4,3 — 7,6
3,4 — 4,4 4,4 — 7,9
3,5 — 4,8 4,5 — 8,3
3,6 — 5,1 4,6 — 8,6
3,7 — 5,5 4,7 — 9,0
3,8 — 5,8 4,8 — 9,3
3,9 — 6,2. 4,9 — 9,7
5,0 — 10,0

— Чаму ў тэстах па розных дысцыплінах прадугледжваецца розная колькасць заданняў? На тэсціраванне па хіміі адводзіцца 120 хвілін, на матэматыку — 150, а на фізіку — 180 хвілін?

Сапраўды, прапановы ўніфікаваць па ўсіх дысцыплінах колькасць заданняў у тэсце і час, які адводзіцца на іх выкананне, гучалі. Але стваральнікі тэстаў настойваюць на тым, што такая практыка абавязкова прынясе адмоўны вынік. Умоўна кажучы, расставіць кропкі ці націскі ў тэсце па мове прасцей, чым рашыць задачку па матэматыцы, таму і заданняў у тэстах па дзяржаўнай мове прапануецца 40, а не 25. Між іншым, тэст павінен максімальна поўна ахопліваць змест вучэбнага курса. Тэсты абавязкова праходзяць апрабацыю ў ходзе пробнага і рэпетыцыйнага тэсціравання. Час для іх выканання падбіраецца доследным шляхам, з улікам працягласці найбольш прадуктыўнага часу працы. Пры гэтым цалкам тэст павінны выканаць не больш за 5 працэнтаў удзельнікаў тэст-экзамену.

У педагагічных тэстах вытрымліваюцца суадносіны паміж складанымі і простымі заданнямі. Наяўнасць больш складаных заданняў у тэсце дае магчымасць дыферэнцыраваць абітурыентаў з высокім узроўнем падрыхтоўкі.

Ёсць меркаванне, што правільны адказ з некалькі прапанаваных можна проста ўгадаць, але, напрыклад, летась на ЦТ па матэматыцы 1700 чалавек «не ўгадалі» ўвогуле ні аднаго правільнага рашэння.

— Я чула, што матэрыялы цэнтралізаванага тэсціравання можна набыць не толькі ў зборніках, але і на кампакт-дысках..

У мінулым годзе спецыялісты Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў упершыню выпусцілі праграму падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання на CD. Дата яе выпуску — 2006 год. Гэта праграма абараняецца Законам «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» і прызначана выключна для індывідуальнай падрыхтоўкі абітурыентаў. Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў на тэндарнай аснове прадаставіў права на вытворчасць CD-версіі прыватнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Хіт компані». Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце інстытута.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ»
объявляет прием абитуриентов в 2007 году
по следующим специальностям:
очная форма обучения (на бюджетной и платной основе)

ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ
Специальности — актерское искусство драматического театра и кино, режиссура художественного фильма, режиссура телевидения, звукорежиссура, телеоператорство, кинооператорство,
ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ФАКУЛЬТУТ
Специальности — станковая живопись, графика, монументально-декоративное искусство, скульптура.
ФАКУЛЬТЕТ ДИЗАЙНА И ДЕКОРАТИВНО-ПРИКЛАДНОГО ИСКУССТВА
Специальности — декоративно-прикладное искусство (художественное стекло, художественная керамика; художественное ткачество, моделирование костюма), дизайн средств производства и транспорта, дизайн мебели, дизайн интерьеров, экспозиционный дизайн, графический дизайн, дизайн виртуальной среды, телереклама.
На платной основе:
Специальность — фотографика.
Заочная форма обучения (на бюджетной и платной основе)
ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ
Специальности — режиссура телевидения, звукорежиссура, телеоператорство, искусствоведение (театроведение)
На платной основе:
Специальности — актерское искусство драматического театра и кино, режиссура драмы.
Прием заявлений на очную и заочную форму обучения проводится с 5 по 11 июля включительно, вступительные испытания — с 12 по 22 июля.
Поступающие в Академию представляют сертификаты о результатах централизованного тестирования по белорусскому или русскому языку и истории Беларуси и сдают экзамены по дисциплине «Творчество».
В академии действуют подготовительные курсы по рисунку, живописи, композиции, актерскому мастерству, режиссуре.
Консультации для абитуриентов проводятся:
- на театральном факультете — по вторникам с 17.00 до 19.00 и воскресеньям с 12.00 до 14.00 в аудиториях.
- на художественном факультете и факультете дизайна и декоративно-прикладного искусства — на кафедрах ежедневно, кроме субботы и воскресенья.
Адрес Академии:
220012, г. Минск, пр. Независимости, 81.
Справки по телефонам: 292-12-21 — театральный факультет,
231-34-78 — художественный факультет,
292-51-53 — факультет дизайна и декоративно-прикладного искусства.

ИНФОРМАЦИЯ О ПОРЯДКЕ ПРИЕМА В УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «БОБРУЙСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АВТОТРАНСПОРТНЫЙ КОЛЛЕДЖ» НА 2007 ГОД
Колледж проводит прием учащихся по специальностям:

Дневное отделение
— техническая эксплуатация автомобилей;
— организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте;
— бухгалтерский учет, анализ и контроль;
— автосервис.

Заочное отделение
— техническая эксплуатация автомобилей;
— организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте;
— бухгалтерский учет, анализ и контроль.

Граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, которые постоянно проживают в Республике Беларусь, лица белорусской национальности, являющиеся гражданами иностранных государств и проживающие на их территории, граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики, Республики Таджикистан имеют право участвовать в конкурсе на получение среднего специального образования в колледже за счет средств бюджета, если данный уровень образования они получают за счет средств бюджета впервые либо на конкурсной основе поступают в колледж на обучение на условиях оплаты физическими или юридическими лицами.

На дневное отделение на бюджетной основе принимаются заявления от лиц, которые окончили базовую школу по специальностям: «Техническая эксплуатация автомобилей» (квалификация — техник-механик), «Организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте» (квалификация — техник по организации и управлению), «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» (квалификация — бухгалтер).

На платной основе принимаются заявления от лиц, которые окончили базовую школу, по специальности «Автосервис» (квалификация — техник-механик), по специальности «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» (квалификация — бухгалтер).

На бюджетной основе по специальностям «Техническая эксплуатация автомобилей», «Автосервис», «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» заявления принимаются от лиц, которые имеют общее среднее образование либо профессионально-техническое образование с общим средним образованием.

В конкурсе на заочную форму получения образования за счет средств бюджета могут участвовать лица, имеющие общее среднее образование, которые работают по профилю избранной специальности, а также лица, имеющие профессионально-техническое образование с общим средним образованием и поступающие на соответствующие или родственные специальности. Остальные поступающие участвуют в конкурсе по заочной форме на условиях оплаты.

СРОКИ ОБУЧЕНИЯ НА ДНЕВНОМ ОТДЕЛЕНИИ
На базе средней школы по специальности «Техническая эксплуатация автомобилей» — 2 года 10 месяцев; «Автосервис» — 2 года 10 месяцев; «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» — 1 год 10 месяцев.
На основе базовой школы по специальностям «Техническая эксплуатация автомобилей» — 3 года 10 месяцев; «Организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте» — 3 года 10 месяцев, «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» — 2 года 10 месяцев, «Автосервис» — 3 года 10 месяцев.

СРОКИ ОБУЧЕНИЯ НА ЗАОЧНОМ ОТДЕЛЕНИИ
По специальностям «Техническая эксплуатация автомобилей» — 3 года 6 месяцев; «Организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте» — 2 года 10 месяцев, «Бухгалтерский учет, анализ и контроль» — 2 года 7 месяцев.
В приемную комиссию абитуриенты подают следующие документы:
1. Заявление на имя директора колледжа по установленной форме.
2. Оригиналы документа об образовании и приложения к нему.
3. Оригиналы сертификатов централизованного тестирования, проведенного в Республике Беларусь в 2006 году.
4. Медицинская справка по форме, установленной Министерством здравоохранения.
5. Документы, подтверждающие право абитуриента на льготы при приеме на обучение.
6. Шесть фотографий размером 3х4 см.
7. Выписка из трудовой книжки (для абитуриентов, поступающих на заочную форму получения образования за счет средств бюджета).
8. Заключение врачебно-консультационной или медико-реабилитационной экспертной комиссии об отсутствии противопоказаний для обучения по выбранной специальности (для лиц, закончивших учреждения, обеспечивающие получение специального образования, детей-инвалидов в возрасте до 18 лет, инвалидов I, II, III групп).
9. Справка сельского исполнительного комитета о постоянном (не менее 2 лет) проживании на момент получения образования в сельском населенном пункте, либо населенном пункте, расположенном на территории радиоактивного загрязнения (для выпускников учреждений образования, расположенных в указанных населенных пунктах).
10. Документы, подтверждающие белорусскую национальность (для белорусов, являющихся гражданами иностранных государств и проживающих на их территории).
11. Паспорт или заменяющий его документ предъявляется абитуриентом лично.

СРОКИ ПОДАЧИ ДОКУМЕНТОВ И ПРОВЕДЕНИЯ ВСТУПИТЕЛЬНЫХ ИСПЫТАНИЙ:
На дневную форму обучения на основе общего базового образования:
прием документов — с 1 июля по 5 августа;
проведение вступительных испытаний — с 6 августа по 15 августа;
зачисление — по 17 августа, на условиях оплаты по 20 августа.
На дневную и заочную форму обучения на основе общего среднего образования:
прием документов — с 1 июля по 13 августа (на условиях оплаты с 18 по 19 августа);
вступительные испытания в форме ЦТ за счет средств бюджета проводятся с 12 июня по 15 июля;
регистрация абитуриентов для участия в ЦТ проводится со 2 мая по 1 июня на основании заявления и документа, удостоверяющего личность, в колледже или в одном из учебных заведений, определенном пунктом проведения ЦТ;
рассмотрение документов — с 14 августа по 16 августа;
зачисление за счет средств бюджета — по 17 августа, на условиях оплаты по 20 августа.

ПОСТУПАЮЩИЕ ПРОХОДЯТ ВСТУПИТЕЛЬНЫЕ ИСПЫТАНИЯ
Для абитуриентов, которые поступают на основе общего базового образования, вступительное испытание по белорусскому либо русскому языку проводится в форме диктанта по централизованным заданиям в дни, определенные Министерством образования, а экзамен по математике проводится по экзаменационным билетам и заданиям, составленным в соответствии с программами вступительных экзаменов, утвержденными Министерством образования Республики Беларусь. Абитуриенты имеют право сдавать вступительные испытания на белорусском или русском языке (по выбору).
Для абитуриентов дневной формы обучения и заочной по специальности «Бухгалтерский учет, анализ и контроль», которые поступают на основе общего среднего образования, вступительные испытания по белорусскому или русскому языку и математике проводятся в форме обязательного централизованного тестирования.
Абитуриенты, поступающие на дневную форму обучения на основе общего базового образования по специальности «Автосервис» и на основе общего среднего образования на заочную форму обучения по специальностям «Техническая эксплуатация автомобилей», «Организация перевозок и управление на автомобильном и городском транспорте», зачисляются в колледж по конкурсу среднего балла документов об образовании, в которых отметки не ниже 3 (трех) баллов.
Выпускникам дневного отделения после сдачи экзаменов в Госавтоинспекции выдается свидетельство водителя транспортных средств категории «В» и «С» (кроме специальности «Бухгалтерский учет, анализ и контроль»), а также присваивается квалификация слесаря по ремонту автомобилей при обучении по специальностям «Техническая эксплуатация автомобилей», «Автосервис».
Стипендия назначается учащимся, которые успевают по всем предметам и активно участвуют в общественной жизни.
Иногородние учащиеся, которые имеют потребность, обеспечиваются общежитием. В общежитии и в учебном корпусе работают буфеты.

ДОКУМЕНТЫ НАПРАВЛЯТЬ ПО АДРЕСУ:
213819 Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Интернациональная, 48. Бобруйский государственный автотранспортный колледж, приемная комиссия.
Телефоны для справок: (8-0225) 52-04-34, 52-27-49, 52-26-41, 52-29-03, 52-30-03, 52-06-16, 52-28-09.

ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЕ КУРСЫ:
6-недельные — со 2 мая по 9 июня, для 11-х классов, подготовка к ЦТ.
3-недельные — с 5 июля по 25 июля, для 9-х классов, подготовка к экзаменам.

Лепшы сярод першых

Генадзь Караткевіч, вучань шостага класа гомельскай гімназіі № 56 стаў абсалютным пераможцам заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы. З 600 магчымых балаў хлопчык набраў 550 і больш чым на 70 балаў апярэдзіў сваіх старэйшых таварышаў. Трэба заўважыць, што на алімпіядзе па інфарматыцы яе ўдзельнікі не падзяляюцца на класы. Акрамя Гены Караткевіча ўладальнікамі дыпломаў I ступені рэспубліканскай алімпіяды сталі яшчэ 10 чалавек — вучні 10—11-х класаў і адзін дзевяцікласнік.

Спаборніцтвы праходзілі ў два туры, і на кожным з іх удзельнікам прапаноўвалася рашыць па тры задачы на праграмаванне. Кожная задача ацэньвалася максімум у 100 балаў. Па прызнанню членаў журы, заданні былі вельмі складаныя, максімальна набліжаныя да ўзроўню задач, якія прапануюцца на міжнароднай алімпіядзе, і былі разлічаны на неардынарнасць мыслення падлеткаў. Выказвалася нават меркаванне, што не кожны прафесійны праграміст здольны з імі справіцца. Між іншым, сёлетнія паказчыкі выступлення юных праграмістаў аказаліся намнога лепшыя, чым у папярэднія гады: калі летась максімальная колькасць балаў, набраных прызёрамі, была 410, то сёлета — 550. Дарэчы, у 2006 годзе Генадзь Караткевіч стаў сярэбраным прызёрам міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы, якая праходзіла ў Мексіцы.

Усяго ўдзел у заключным этапе рэспубліканскіх алімпіяд па 16 агульнаадукацыйных прадметах узялі 1461 чалавек. Найбольшую колькасць дыпломаў (125) заваявала каманда навучэнцаў сталічных навучальных устаноў.

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Шайбу, шайбу!

Андрэй МЕЗІН: «Я АДДАЮ ЎСЯГО СЯБЕ ЗБОРНАЙ»

Яго гульня ў варотах даўно стала гарантам якасці. Адсутнасць ураджэнца Чалябінска ў складзе каманды ставіць пад сумненне выступленне зборнай. Яго клас пацвярджае хоць бы той факт, што, напрыклад, на мінулым чэмпіянаце свету ў Рызе галкіпер адбіў 225 кідкоў з 239, а каэфіцыент яго надзейнасці склаў 94,14 працэнта.

Гледзячы на дзеянні варатара ўфімскага «Салавата Юлаева» падчас трэніроўкі ў Мінску, галоўны трэнер беларускай зборнай Курт Фрэйзер сказаў, што гульня Андрэя яму настолькі падабаецца, што ён не лічыць вартым запрашаць спецыяльнага трэнера для варатароў, а на чэмпіянаце свету-2007 зробіць стаўку менавіта на Мезіна. У прынцыпе, гэта не дзіва. Якія ўражанні ў Андрэя Мезіна ад першай трэніроўкі пад кіраўніцтвам новага трэнера, ці будзе галкіпер гуляць у наступным сезоне за «Салават Юлаеў», даведаемся з першых вуснаў.

— Я задаволены працай і гляджу ў будучыню з аптымізмам, — гэта былі першыя словы варатара пасля заканчэння першай трэніроўкі ў сталічным Палацы спорту.

— Не так даўно вы заяўлялі, што шанц вашага з'яўлення ў зборнай — 50 працэнтаў. Што ж паўплывала на рашэнне прыняць запрашэнне ў каманду?

— Я сапраўды не ведаў, ці змагу прыехаць: усё ж такі ўзрост, назапашваецца стома, ды і каманда аднаўляецца — трэба даваць дарогу маладым. Аднак мяне падкупіла тое, што я патрэбны камандзе: мяне не забывалі нават, калі быў траўмаваны — званіў трэнер, званілі з федэрацыі хакея. Менавіта такое стаўленне да мяне і прадвызначыла мой выбар і, канешне ж, я раіўся з сям'ёй.

— Чаму вы не пажадалі пабыць разам з камандай у Гомелі на «Кубку Палесся»? Курт Фрэйзер выклікаў вас...

— Гэта ад мяне не залежала, бо на той момант я належаў клубу, а трэнеры вырашылі, што мне лепей застацца ў «Салаваце». За чатыры дні я правёў 4 трэніроўкі. Тое ж самае, у прынцыпе, мог бы зрабіць і ў Гомелі. Аднак я не мог выбіраць.

— Як ацэньваеце сваю гульню ў сезоне? Вы гулялі з Вадзімам Тарасавым па чарзе, былі траўмаваны...

— Зразумела, што гэта не лепшы варыянт — гуляць па чарзе з іншым галкіперам. Асабіста я лічу, што вароты павінен абараняць той, хто «на хаду». Пачатак сезона ў мяне не залажыўся, а ў Тарасава гульня пайшла, потым пачало атрымлівацца ў мяне, быў на пад'ёме і — атрымаў траўму. Патрэбна было лячыцца два месяцы, а на справе выйшаў на лёд праз месяц. Пачакаў бы яшчэ крыху, але мяне падганялі. У выніку — тое ж самае месца надарваў, і ў гэты тэрмін гуляў Тарасаў. Калі «Салават» вярнуўся з «Кубка Палесся», у Тарасава прыхапіла шыю, таму я быў вымушаны гуляць і мы выйгралі. За 8 матчаў да плэй-оф я правёў 5 у варотах, таму стартаваць у плэй-оф трэнер даверыў мне. Калі мы прайгралі ЦСКА (не думаю, што я падвёў каманду), мяне замяніў Тарасаў, які гуляў далей тры матчы запар. У мяне няма задаволенасці ад сезона ў сувязі з гэтым вылетам з каманды. Давер і быў, і не быў. Калі ўся справа ў маёй траўме, то яе можа атрымацца кожны ў любы момант. Тады ўсіх ігракоў трэба разагнаць? Напрыклад, возьмем Косцю Кальцова. Ён дапамог камандзе, але атрымаў траўму — была трэшчына, а зараз палец ледзь не адрываецца. Загубілі чалавека на месяц. Я ж лячыўся амаль да апошняга, і стаўку зрабілі на Тарасава, які гуляў цудоўна.

Фота БЕЛТА

— Магчыма, пры такім стаўленні да вас ў «Салаваце» ў наступным сезоне вы будзеце выступаць за іншы клуб суперлігі?

— Уфімцы прапанавалі мне застацца толькі ў канцы сезона. Я ж лічу, што калі ты патрэбны клубу, то з табой гутараць на гэты конт яшчэ значна раней, у сярэдзіне сезона. Гэта мінус для «Салавата», які буду ўлічваць падчас прыняцця рашэння: зараз вяду перагаворы з некалькімі клубамі, якія зацікавіліся мной, нягледзячы на тое, легіянер я, ці не. Я схіляюся да таго, каб застацца ў Расіі, але пакуль не дам вам дакладнага адказу, за якую каманду буду гуляць. Прыкладна праз месяц даведаецеся. Усё вырашыцца на чэмпіянаце свету.

— Чым вы растлумачыце, што некаторыя нашы ігракі не прыязджаюць у зборную. У прыватнасці, лепшы бамбардзір суперлігі, форвард омскага «Авангарда» Аляксей Калюжны прапускае ўжо каторы выклік у каманду...

— Я магу зразумець гэта: у нашай зборнай і ў расійскай таксама чалавека хакеіста, не разабраўшыся, могуць папракаць. І нават не папрасіць прабачэння. Нехта можа гэта перажыць, хтосьці — не. Да мяне ўвесь год ставіліся цудоўна, таму я з радасцю прыехаў гуляць за зборную. Аднак да кожнага павінен быць індывідуальны падыход. Я ні ў якім разе не стану асуджаць чалавека, які не захацеў выступаць за зборную. Толькі не трэба хавацца, бегаць, а лепей растлумачыць прычыну, шчыра аб усім расказаць. Што ж датычыцца Калюжнага... Гэта яго права. У свой час з ім абышліся не зусім прыгожа. Канешне, зараз ён вельмі дапамог бы камандзе. Аднак з такім настроем, калі ён маральна стаміўся, наўрад ці варта выходзіць на лёд. Гэта можа выклікаць негатыў. Іншыя ігракі стануць браць прыклад.

— Усе балельшчыкі ведаюць, якое значэнне мае для зборнай наяўнасць у складзе каманды Андрэя Мезіна. Цікава, а што значыць зборная менавіта для вас?

— Зборная для мяне зрабіла вельмі шмат, таму я заўжды аддаю ўсяго сябе ў гульні за зборную. З задавальненнем буду выступаць за каманду, каб дапамагчы ёй.

Ірына ПРЫМАК.

КАМЕНТАРЫЙ ДА ПРАЕКТА ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«АБ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ»

(Працяг. Пачатак у нумарах за 13 і 19 красавіка.)

Да дэпутатаў часта звяртаюцца людзі з просьбамі знайсці ім работу або іх дыпламаваным родзічам, якія не атрымалі размеркавання па спецыяльнасці. Знайсці работу не проста, усюды патрабуюцца спецыялісты са стажам. Для многіх выпускнікоў абавязковае размеркаванне дае шанц атрымаць работу і набыць вопыт практычнай дзейнасці. Таму ў Законе прадугледжваецца падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасцях Агульнадзяржаўнага класіфікатара Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі». Гэта свайго роду спосаб прыцягнення выпускнікоў у рэальны сектар эканомікі і сацыяльна-культурную сферу.

Законам таксама прадугледжана дзяржаўнае рэгуляванне колькасці абітурыентаў, якія залічваюцца ў ВНУ абедзвюх формаў уласнасці на вызначаныя спецыяльнасці. Разлік рэальнай патрэбнасці народнай гаспадаркі краіны ў кадрах з вышэйшай адукацыяй на перспектыву будзе весціся міністэрствам адукацыі. З аднаго боку, гэта вельмі добра, што маладыя людзі імкнуцца да ведаў, а з другога — дрэнна, калі вялікая іх колькасць, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, можа быць не працаўладкавана ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Дарэчы, у сувязі з наяўнасцю дзвюх ступеняў вышэйшай адукацыі выразна праглядваюцца ўсе перавагі размеркавання. У прыватнасці, калі дыпламаваны спецыяліст размеркаваны, то ён зможа пры жаданні працягваць вучобу ў магістратуры. Калі скончыў магістратуру, але не збіраецца вучыцца ў аспірантуры, то такога магістра, які раней навучаўся на першай ступені за бюджэтныя сродкі, размяркуюць на работу згодна з атрыманай спецыяльнасцю. Аднак не трэба думаць, што дзяржава аднолькава жорстка ставіцца да выпускнікоў-бюджэтнікаў, якія не з'явіліся да месца размеркавання або не адпрацавалі ўстаноўлены двухгадовы тэрмін. Законам прадугледжана, што ўрадам Рэспублікі Беларусь вызначаюцца ўмовы вызвалення ад кампенсацыі затрачаных за вучобу грашовых сродкаў. І такіх умоў больш за дзесяць: ад сямейных абставінаў да пераходу на выбарную пасаду. Выпускнікі, якія вучыліся за ўласныя грошы, не размяркоўваюцца, хоць пры наяўнасці свабодных вакансій вышэйшая навучальная ўстанова па жаданню такога выпускніка можа даць яму накіраванне на працу.

Эфектыўнае функцыянаванне вышэйшай школы вызначаецца многімі фактарамі — як унутранымі, так і знешнімі. Сярод унутраных — **фінансаванне** ВНУ і іх навукова-педагагічны патэнцыял. Як адзначалася вышэй, толькі дзяржаўным ВНУ будуць выдзяляцца сродкі з рэспубліканскага бюджэту. Прыватныя вышэйшыя навучальныя ўстановы фінансуюцца за кошт сродкаў заснавальніка. Разам з тым, усе ВНУ, незалежна ад формы ўласнасці, маюць права атрымліваць прыбытак ад платных адукацыйных паслуг, вытворчай, навуковай і прадпрымальніцкай дзейнасці, прымаць ахвяраванні ад фізічных і юрыдычных асобаў, а таксама выкарыстоўваць любыя не забароненыя заканадаўствам спосабы атрымання прыбытку. Дзяржаўныя ВНУ пасля ўступлення ў сілу Закона абавязаны будуць выкарыстоўваць сродкі, атрыманыя з дадатковых крыніц фінансавання, строга па мэтаваму назначэнню ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Навукова-педагагічны патэнцыял ВНУ на сёння з улікам сумяшчальнікаў складае 26 388 выкладчыкаў, з якіх 1334 — дактары навук і 8498 — кандыдаты навук. А студэнтаў — амаль 400 тысяч. Дэпутаты, нягледзячы на супраціўленне асобных міністэрстваў, вырашылі абмежаваць **суадносіны выкладчыкаў і студэнтаў** на дзённай форме навучання лічбай, якая не перавышае 1:10. Гэта вельмі важна для нашых ВНУ. Адсутнасць такой нормы ў Законе магла б прывесці і ўжо прывяла да зніжэння якасці навучання студэнтаў і скарачэння прафесарска-выкладчыцкага складу (з 20 тысяч гэтых работнікаў ужо зараз каля 12 працэнтаў працуе толькі на палову і чвэрць стаўкі), зніжэння яго навуковага і метадычнага патэнцыялу. Пры гэтым творчыя ВНУ, у якіх вядзецца падрыхтоўка мастакоў або артыстаў, вобразна кажучы «адзінкавага тавару», могуць дазволіць іншае суаднясенне выкладчык — студэнт — 1:1. А вось устанаўліваць Законам жорсткія межы гадзіннай нагрузкі выкладчыкаў мы не сталі, паколькі яны будуць уплываць на памер зарплаты педагогаў ВНУ.

У. ЗДАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

(Заканчэнне будзе.)

ГРОШЫ СВАЯКОЎ І СЯБРОЎ — НЕ ЧУЖЫЯ

Новыя тэндэнцыі ў сферы банкаўскіх паслуг — тэма сустрэчы журналістаў у Мінскім адукацыйным цэнтры імя Іаганеса Рау з прадстаўнічай групай кіраўнікоў ААБ «Беларусбанк».

Дырэктар дэпартамента крэдытавання Уладзімір Раманчук, зразумела, засяродзіўся на праблематыцы крэдытаў. Тут, трэба сказаць, банк безумоўны лідар. Сёння на долю ААБ «Беларусбанк» прыходзіцца 77 працэнтаў выдачы крэдытаў для насельніцтва. Колькасць крэдыта-атрымальнікаў перавышае ўжо 900 тысяч. Хутка іх будзе мільён. І гэта лічба мае тэндэнцыю росту. Банк выдае як звычайныя, так і льготныя крэдыты, у пераважнай большасці на набыццё новага і рэканструкцыю старога жылля, скажам, на газіфікацыю дома.

Паводле слоў Уладзіміра Канстанцінавіча, гэтая катэгорыя крэдытаатрымальнікаў — самая дысцыплінаваная і адказная. Сярод іх зусім нязначны працэнт невяртання грошай банку, пратэрміноўкі з выплатай запазычанасці ці ўвогуле невяртання крэдытаў. Больш праблем узнікае з тымі, хто бярэ чужыя грошы на спажывецкія мэты, напрыклад, набыццё новай машыны, а потым не спяшаецца ці «забывае» вяртаць свае. Усяго на пачатак года сума пратэрміноўкі аплаты крэдытаў склала 105 мільёнаў ад агульнай сумы запазычанасці ў чатыры трыльёны рублёў.

Аднак банк імкнецца зрабіць больш разнастайнымі мэты і формы выдачы крэдытаў. Скажам, раней узятыя грошы на вучобу ў ВНУ ці на ўладкаванне маладога спецыяліста па месцы працы, можна ўжо вяртаць (пагашаць крэдыт) праз мясцовае аддзяленне сувязі. Вядома, пры ўмове, што па месцы новага жыхарства маладога спецыяліста няма прадстаўніцтва ААБ «Беларусбанк».

Апошнім часам банк мэтанакіравана развівае сістэму безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем пластыкавых картак. Іх сёння выпускаюць і абслугоўваюць усе яго 109 філіялаў. На 1 красавіка гэтага года зарэгістравана ў абароце 2 169 265 пластыкавых картак ААБ «Беларусбанк».

Цікавае наваўвядзенне: цяпер у заяўцы на атрыманне буйнога крэдыту, напрыклад, на жыллё, наш малазабяспечаны суайчыннік можа ў паказчык свайго сукупнага даходу ўключыць і заробкі блізкіх сваякоў і сяброў. Прыкладна трох-пяці чалавек. Гэта наваўвядзенне істотна аблягчае атрыманне буйнога крэдыту на будаўніцтва кватэры для людзей з невысокімі заробкамі.

Сёння, нагадаем, толькі на агульных умовах банк выдае 14 відаў розных крэдытаў, кожны з якіх мае, так бы мовіць, свае падвіды. Важная акалічнасць, працэнтная стаўка для вяскоўцаў крыху ніжэйшая, чым для гараджан. Ігар Руды, дырэктар дэпартамента рознічнага бізнэсу, падрабязна расказаў пра новую сістэму будаўнічых зберажэнняў, якая дазваляе за некалькі гадоў сабрать патрэбную суму на жыллё.

Сёлета ААБ «Беларусбанк», паводле слоў яго супрацоўнікаў, будзе працягваць развіццё новых паслуг. У прыватнасці, будуць пашыраны магчымасці такой сучаснай паслугі, як SMS-банкінг. Яе перавагі: эканомія часу і камфорт безнаяўных разлікаў. SMS-банкінг дазваляе круглыя суткі незалежна ад месцазнаходжання аплачваць паслугі Белтэлекама (хатні тэлефон, камунальныя разлікі ў Мінску і шэрагу абласных цэнтраў), таксама паслугі аператараў сотавай сувязі VELCOM і MTC, шматканальнага тэлебачання «Космас ТБ».

Леанід ТУГАРЫН.

«Рубеж» — пераможца НХЛ

Мацнейшай камандай НХЛ сярод васьмі ўдзельнікаў стаў мінскі «Рубеж». Не палохайцеся, паважаныя аматары хакея, калі не зможаце ўзгадаць такую каманду ў Нацыянальнай хакейнай лізе, ды і барацьба за Кубак Стэнлі яшчэ працягваецца. Я ж вяду гаворку аб іншым турніры НХЛ — начной хакейнай лізе, чэмпіянаце горада Мінска сярод аматараў.

У фінале «Рубеж» выйграў у «Эко» з лікам 6:4. «Пагранічнікі» (так называюць хакеістаў «Рубяжа») занялі першае месца і па выніках рэгулярнай стадыі, дзе ўступілі толькі аднойчы. У складзе пераможцаў выступалі вядомыя ў беларускім спартыўным свеце асобы — старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання Прэзідэнцкі спартыўны клуб Дзмітрый Лукашэнка, генеральны дырэктар хакейнага клуба «Дынама» Аляксандр Белы, дырэктар рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» Андрэй Асташэвіч, гуляў і старэйшы брат «зоркі» беларускага хакея Руслана Салея — Вадзім, які, дарэчы, устаў на канькі толькі ў 35 гадоў. У матчы за «бронзу» не змог паказаць байцоўскі характар «Характар», які ўступіў «МТМ» — 4:9.

Лепшымі ігракамі 6-га чэмпіянату горада Мінска па хакею з шайбай сярод аматарскіх каманд сталі: галкіпер «Эко» Вадзім Пекарскі, абаронца «Сталіцы» Аляксей Гіро, нападаючы «Атланта» Юрый Карпенка, бамбардзір «Рубяжа» Андрэй Асташэвіч, які закінуў звыш 50 шайбаў у 17 матчах, а ў фінале зрабіў покер — адправіў у вароты 4 шайбы. Лепшым арбітрам турніру прызнаны Максім Сідарэнка, а лепшай арэнай названы сталічны Палац спорту. Прыз «За вернасць хакею» атрымалі Андрэй Белы і Уладзімір Мелянчук.

На цырымоніі закрыцця турніру намеснік старшыні «Прэзідэнцкага спартыўнага клуба» Яўген Цярноўскі заўважыў, што ў наступным годзе аматарскі чэмпіянат выйдзе яшчэ на больш высокі арганізацыйны ўзровень, павялічыцца колькасць каманд-удзельніц.

Ірына ПРЫМАК.

Муз-news

АПОШНІ ШТРЫХ

Гурт «НЕО» спыніў сваё існаванне. Ва ўсякім выпадку, менавіта ў гэтым складзе — творчы дуэт кампазітара Андрэя Маркуца і саліста Вадзіма Касалапава. Як адзначыў сам стваральнік і кіраўнік гурта Маркуц, «рашэнне прадыктавана творчымі разыходжаннямі». Калі гаварыць прасцей, то за апошні год калектыў выпусціў толькі дзве песні ўласнага сачынення, увесь астатні час перапяваючы чужыя хіты.

Усяго ў актыве «НЕО» — паўнафарматны альбом «Чуеш, Зямля» (2002 год), сінгл «Душа» (2004 год) і праект з сімфанічным аркестрам «Дзікае паляванне» (2005 год). Апошняй сумеснай работай стануць здымкі кліпа на песню «Сентыментальны», пасля чаго ўдзельнікі канчаткова разбягуцца. Невядома, чым зойметься саліст, а аўтар музыкі абвясціў, што працуе адразу над некалькімі праектамі, якія стануць «бомбай».

З ЛЮБОЎЮ — ПА БЕЛАРУСІ

Спявачка Алена Грышанава пачынае вялікі гастрольны тур па Беларусі. Акрамя ўласна новых песень, у канцэртнай справаздачнай праграме «Яе Вялікасці Любові...» будзе прэзентаваны танцавальны калектыў «Ellit Bitt» — шоў-балет, які працуе ў накірунках R'n'B, хіп-хоп, эстрадны танец, брэйк-данс.

Дарэчы, і сама Алена пры падтрымцы танцораў Вадзіма Астроўскага, Майка Пастэрнака, Юрыя Шаўцова і Кірыла Калчынскага паспрабуе сябе ў новай стылістыцы R'n'B — дзеля гэтага запісана зусім новая кампазіцыя «Money». Увогуле ж канцэртная праграма складаецца з дзвюх частак — папулярныя хіты і навінкі, якія пазней трапяць у новы альбом спявачкі. Плануецца таксама зняць відэа, але пакуль не вядома, на якую дакладна кампазіцыю.

Гастролі Алены Грышанавай стартавалі 18 красавіка ў Гродне — горадзе, дзе прайшло дзяцінства спявачкі. Далей на чарзе Карэлічы, Ашмяны, Ліда, Іўе і г.д. Тур працягнецца з красавіка па кастрычнік і завершыцца, па традыцыі падобных творчых паездак, вялікім канцэртам у Мінску.

ПЕСНЮ ЗА ПАШПАРТ

Той факт, што ў жыцці светлыя і цёмныя палосы чаргуюцца, адчуў на сабе саліст «The Project» Яўген Чалышаў. Калектыў толькі паспеў вярнуцца з Ізраіля, дзе на міжнародным фестывалі «Эйлат» заняў 3-е месца, і перажываў эйфарыю. Чалышава ж напаткала непрыемнасць — дзесьці па дарозе з банка, паміж плошчамі Перамогі і Я. Коласа, артыст згубіў пашпарт.

«З банка выходзіў з пашпартам, а ў маршрутцы ўжо не знайшоў яго, — засмучаецца Жэня. — Доўга шукаў, вяртаўся ў банк, тройчы прайшоў гэты ж маршрут — усё адно не знайшоў. Вельмі спадзяюся ўсё ж, што пашпарт удасца вярнуць. Я гэтаму чалавеку нават песню гатовы прысвяціць!». У артыста ёсць усе падставы для перажыванняў — у сярэдзіне мая праект удзельнічае ў фінале адбору на фестываль «Новая хваля» і ў балгарскім фестывалі «Discovery», а без пашпарта саліст нікуды не зможа выехаць — давядзецца пабегаць, каб аднаўляць. Ці ўсё ж... напісаць песню таму, хто знайшоў такі патрэбны дакумент?

ПАРЫЖ — ДОБРА, А МІНСК ЛЕПЕЙ

Дзмітрый Даукш вярнуўся з гастрольнага туру па Еўропе. На працягу 20 дзён адбылося 11 канцэртаў — у Германіі, Бельгіі і Францыі. Развіць такую мабільнасць музыкантам дапамагалі аўтобусы, хуткасныя паязды і самалёты — здаралася, што за дзень даводзілася праехаць 600 км ад адной канцэртнай пляцоўкі да другой.

Тур пачаўся з выступлення ў нямецкім Дортмундзе, а фінішаваў у французскай сталіцы. Акрамя Дзмітрыя Даукша і музыканта гурта «Новы Іерусалім» Ігара Сарокіна, у праграме прымалі ўдзел барабаншчык Эрых Грундман і саксафаністка Наталля Марчанка, якую артысты сустрэлі ў Германіі.

Пасля вяртання ў Беларусь выканаўца працягвае працаваць над сваёй новай пласцінкай, выхад якой арыенціровачна запланаваны на другую палову гэтага года.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

У АБАРОНУ ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ ДЗЯТВЫ

У Мінску на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (вул. Кірава, 16) пачынае працаваць прыёмная Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці. Рашэнне аб яе адкрыцці было прынята на першым у гэтым годзе пасяджэнні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, якую ўзначаліў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Аляксандр КОСІНЕЦ.

У прыёмнай Нацыянальнай камісіі будзе весціся прыём грамадзян, у тым ліку дзяцей і іх законных прадстаўнікоў па пытаннях абароны законных інтарэсаў непаўналетніх. Работа аналагічных прыёмных будзе арганізаваная ў бліжэйшы час аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам у кожным абласным цэнтры і ў сталіцы. Прыём у іх будуць весці ўпаўнаважаныя Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці ў абласцях і горадзе Мінску.

Аляксандр Косінец падкрэсліў, што прыёмныя павінны быць поўнасцю абсталяваныя ўсёй неабходнай тэхнікай, каб грамадзяне маглі атрымаць любую інфармацыю аб дзейнасці прыёмнай, а члены камісіі мелі магчымасць зносіцца з бацькамі і дзецьмі не толькі на асабістым прыёме, але і пры дапамозе тэлефона і электроннай пошты.

Пры зваротах грамадзян у прыёмную Нацыянальнай камісіі будзе весціся рэгістрацыя ўсіх заяў і адсочвацца вынікі іх разгляду. У прыёмнай будзе сканцэнтраваны вялікі аб'ём даведачна-кансультацыйнай інфармацыі: адрасы ўсіх сацыяльных прытулкаў, што маюцца ў краіне, тэрытарыяльных цэнтраў абслугоўвання насельніцтва, іншых карысных кансультацый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВУЧНЁЎСКАЯ РУКА ДАПАМОГІ

Добрую славу аднавіў аддзел адукацыі Веткаўскага раёна, успомніўшы пра даўно забыты цімураўскі рух. Тут стала правілам арганізоўваць шэфства вучняў гарадскіх і сельскіх школ над адзінокімі і састарэлымі людзьмі. Яны дапамагаюць ім ва ўборцы двароў і памяшканняў, нарыхтоўцы дроў, выконваюць іншыя іх просьбы. І чуюць ад паважаных людзей у свой адрас словы падзякі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«МАБІЛЬНЫЯ» ГУЛЬНІ З НЕБЯСПЕКАЙ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

Звышвысокачастотнае выпраменьванне, электрычнае і магнітнае палі, мяккае рэнтгенаўскае выпраменьванне, элементы бачнага спектра ад маніторaў, інфрачырвонае і ўльтрафіялетавае выпраменьванне... Пералічаныя вышэй фактары — то паасобку, то разам — уздзейнічаюць на нас літаральна кожную хвіліну. Бытавая тэхніка, камп'ютары, мабільныя сотавыя тэлефоны зрабілі наша жыццё камфортным, прадаставілі больш магчымасцяў для кантактавання, атрымання інфармацыі, навучання, аднак яны адначасова з'яўляюцца крыніцай небяспекі для нашага здароўя (пра што мы часта забываемся). А пагроза, прынамсі, самая рэальная, асабліва для дзяцей і падлеткаў, людзей з паслабленым здароўем. Падрабязней пра «адваротны бок» уздзеяння бытавых электрапрыбораў і мабільнікаў на наш арганізм мы папрасілі расказаць загадчыка аддзела комплексных праблем фізічных фактараў асяроддзя пражывання чалавека РНПЦ гігіены Станіслава Худніцкага.

— Печы ЗВЧ, халадзільнікі, тэлевізары, персанальныя камп'ютары (ПК) пажадана размяшчаць у асобных кутках пакоя, — расказвае Станіслаў Станіслававіч. — Аднак у нашых малагабарытных кватэрах такое, на жаль, не заўсёды магчыма. Асабліва актуальна гэта для кухань, дзе бытавую тэхніку часта размяшчаюць у адну зону — халадзільнік, на яго печку ЗВЧ, а зверху яшчэ і тэлевізар. Пры такім раскладзе адбываецца павелічэнне электрамагнітных палёў, што вельмі небяспечна для чалавека. У ідэале ў кожную разетку трэба ўключаць толькі адзін прыбор.

— Печку ЗВЧ называюць «бытавым кілерам». Яе выпраменьванне адпавядае сумарнаму выпраменьванню халадзільніка, пылесоса, пральнай машыны, міксера, кавараркі, электраплітты, праса і люмінісцэнтнай лямпы. Мо ад печкі ЗВЧ ўвогуле трэба адмовіцца?

— Гісторыя печкі ЗВЧ налічвае 80 гадоў (не так даўно яна святкавала свой юбілей). Звышвысокачастотнае выпраменьванне зварочвае любыя бялкі за вельмі кароткі тэрмін. Яно смажыць, варыць, разаграе, але пры гэтым — аказвае ўздзеянне і на чалавека. У мадэлях печак ЗВЧ новага пакалення ёсць таймер, які дазваляе ўстанавіць сістэму на пэўны час, раней такога не было. Аднак распрацоўшчыкі печкі ЗВЧ зараз адышлі ад гэтага спосабу прыгатавання ежы ў сувязі з высокай рызыкай неспрыяльнага ўздзеяння ЗВЧ-выпраменьвання і пераключыліся на больш перадавыя сістэмы сумяшчэння ЗВЧ-выпраменьвання з хвалевым электрычным нагрэвам. Гэта — хажарапаветранага абагрэву — кшталту паветраных грыляў. Яны дазваляюць прыгатаваць ежу гэтак жа хутка, але не даюць ЗВЧ-выпраменьванне.

— Пра небяспечнасць камп'ютараў сказана шмат. Ёсць даныя, што да 60 працэнтаў карыстальнікаў ПК пакутуюць ад хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы, каля 40 працэнтаў — ад расстройстваў страўнікава-кішачнага тракта. І тым не менш без камп'ютараў мы не абыдземся.

— Безумоўна, але мы можам прытрымлівацца правілаў карыстання і мераў бяспекі. Так, для дарослага здаровага чалавека час неадрыўнай працы з камп'ютарам не павінен перавышаць 2 гадзін. Потым — абавязковы перапынак. Агульная сутачная нагрузка (нават у прафесіяналаў) не можа быць большай за 4 гадзіны. Для дзяцей і падлеткаў гэтыя нормы яшчэ меншыя. Увогуле, работа з камп'ютарам патрабуе ад чалавека вялікага нервова-эмацыянальнага напружання, у працэсе якой карыстальнік падвяргаецца яшчэ і ўздзеянню электрамагнітнага выпраменьвання (ЭМВ) у вельмі шырокім дыяпазоне (ад 5 Герц да 300 Гіга-Герц). Дадайце сюды ж электрастатычнае выпраменьванне, УФ, інфрачырвонае выпраменьванне і выпраменьванне бачнага спектра ад відэаманіторaў з электрапрамянёвай трубкай — тады карціна будзе поўнай.

— Зараз шырокае распаўсюджанне атрымліваюць манітораў на вадкакрышталічных панэлях. Яны больш бяспечныя для здароўя?

— Так. Яны, як правіла, не з'яўляюцца крыніцамі павышанага ўзроўню электрамагнітных палёў, пры ўмове, што дадзеныя сістэмы правільна выкананы і падключаны да электрычных сетак з адпаведнымі контурамі зазямлення. Сёння ў большасці жылых дамоў пакуль адсутнічаюць контуразазямляльныя нейтралі (трохполюсныя альбо еўрапейскія разеткі), якія значна памяншаюць уздзеянне нізкачастотных электрамагнітных палёў сетак электрахарчавання і відэаманітораў. Хоць пры рэканструкцыі і рамонце пабудоў, згодна з існуючымі нормамі і правіламі, старыя разеткі цяпер замяняюцца на еўрапейскія. Толькі рабіць гэта павінен прафесіянал. У народзе ж практыкуецца падключэнне контураў зазямлення на радыятары, што нічога акрамя шкоды не прыносіць. Зарад можа накоплівацца і прывесці да паражэння чалавека.

Вяртаючыся да вадкакрышталічных манітораў, адзначу, што многія людзі выкарыстоўваюць свае ноўтбукі і лэптопы як сістэмы для работы пры харчаванні ад электрычнай сеткі. У такім выпадку нават ЖВманіторы не ўратуюць ад павышанага ўзроўню ЭМВ. Дадзеныя сістэмы павінны эксплуатавацца выключна ад акумулятараў. Тады яны бяспечныя — пры захаванні рэжымаў работы.

— Ужо некалькі гадоў не сціхае так званы мабільны бум: сотавыя тэлефоны сёння маюць не толькі дарослыя, але і многія школьнікі. І мала хто з іх ведае пра правілы карыстання сваёй «мабілай»...

— Гэта сапраўды так. У нас як у спецыялістаў выклікае занепакоенасць шырокае распаўсюджанне сотавай сувязі сярод дзяцей і падлеткаў. Малады арганізм у працэсе росту асабліва адчувальны да ЭМВ. Сёння яшчэ цяжка дакладна ацаніць рэальную рызыку неспрыяльных наступстваў ад выкарыстання мабільных тэлефонаў, аднак ужо даказана, што падчас размовы па сотаваму тэлефону тармозяцца ўсе рэакцыі цэнтральнай нервовай сістэмы. Гэтым тлумачыцца забарона на выкарыстанне мабільніка падчас руху ў аўто.

Сур'ёзную небяспеку для здароўя маладога арганізма выклікаюць гульнявыя элементы, якія ёсць літаральна ў кожным тэлефоне. Па-першае, трэба сказаць пра спецыфічны рэжым пульсацыі экрана — «мерцающий свет» (ад 5 да 8 Герц), які прыводзіць да блакіроўкі цэнтральнай нервовай сістэмы. У дзяцей і падлеткаў, якія захапляюцца гульнямі мабільных тэлефонаў, могуць развівацца эпілептычныя сутаргі, страта прытомнасці. Таму, шаноўныя бацькі, калі вы заўважылі ў свайго сына ці дачкі дрыжанне павекаў, закатванне вачэй, — хутка вядзіце дзіця да ўрача. Па-другое, мабільны тэлефон — гэта невялікая партатыўная сістэма, дзе ўсе гульнявыя элементы пабудаваны на хуткасных рэакцыях. Падлетку даводзіцца трымаць тэлефон у руках і двума пальцамі ціснуць на клавішы, у выніку чаго развіваецца так званы тунэльны сіндром. Упершыню ён быў зафіксаваны ў амерыканскіх аператараў буйных газет у 80-я гады. Праяўляецца ён болем у кісці і перадпляччы. Буйныя вытворцы сотавых тэлефонаў абавязкова папярэджваюць аб усіх вышэйазначаных рызыках у інструкцыі. Калі ж набываць тэлефон на рынку ці з рук, падрабязнай інструкцыі можна не атрымаць. Дарослыя павінны адказна падыходзіць да выбару мабільніка для свайго дзіцяці і дзесяць разоў узважыць — ці патрэбна непаўналетняму такая дарагая і небяспечная цацка.

— Станіслаў Станіслававіч, назавіце, калі ласка, правілы бяспекі пры выкарыстанні сотавай сувязі.

— Падрабязна яны прапісаны ў міждзяржаўных (расійска-беларускіх) санітарных нормах дапушчальных узроўняў фізічных фактараў пры прымяненні тавараў народнага спажывання ў бытавых умовах, прынятых у 1995 годзе. Сёння ўсе ведаюць, што нельга насіць мабілу ў кішэні кашулі, на поясе. Нават калі тэлефон знаходзіцца ў рэжыме чакання, яго лепш трымаць далей ад цела. Працягласць размовы па мабільнаму тэлефону не павінна перавышаць 3 хвілін, перапынкі паміж званкамі — 15—30 хвілін. Прынамсі, узровень вашага апраменьвання падчас размовы будзе залежаць ад розных прычын: ад адлегласці ад базавай станцыі, ад перашкаджаючых фактараў. У такіх умовах тэлефон аўтаматычна выходзіць на максімальны ўзровень магутнасці.

— Напрыклад, у вагоне метро?

— А таксама ў аўтобусе, тралейбусе і ў любой іншай закрытай металічнай сістэме. Спецыялісты Японіі, Скандынавіі, Карэі правялі шэраг даследаванняў, якія паказалі: калі 10 чалавек размаўляюць па сотаваму тэлефону ў вагоне метро, то ўзровень ЗВЧ-выпраменьвання там можа перавышаць гэты паказчык на прамысловых прадпрыемствах, адбываецца сумацыя ўзроўняў і вагон становіцца своеасаблівай камерай ЗВЧ, дзе апраменьванне атрымліваюць усе пасажыры. Гэта так званая вымушаная рызыка. Ёсць яшчэ рызыка добраахвотная — калі вы самі набываеце тэлефон, добра ведаючы, што ён нясе пэўную небяспеку для арганізма. Між іншым, у тэлефонаў новага пакалення ўзровень выпраменьвання значна большы, чым у старых мадэляў. Хутчэй за ўсё гэта звязана з большым наборам функцый і аперацый, якімі валодаюць сучасныя апараты.

— Якую рэальную небяспеку для здароўя ўяўляе сотавая сувязь?

— Сотавая сувязь неспрыяльна ўплывае на цэнтральную нервовую і сардэчна-сасудзістую сістэмы, на імунітэт. У шэрагу выпадкаў гавораць аб сувязі ЭМВ з анкалагічнымі хваробамі крыві і галаўнога мозга. Каля 15 працэнтаў людзей увогуле маюць павышаную адчувальнасць да электрамагнітных палёў, хоць спецыфічных органаў іх успрымання

ПАНЯДЗЕЛАК, 23 КРАСАВІКА

6.05, 16.40 Серыял «Набярэжная Арфеўр, 36».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.20, 8.20 Ты ўбачыш Першы!
7.25, 8.25 Дзелавое жыццё.
7.45, 8.45 Зона Х.
9.05, 19.55 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
9.50 «Панарама тыдня».
11.00, 17.40 Серыял «Каханне як каханне».
12.15 Камедыя «Хросныя бацькі».
14.00 У свеце матораў.
14.30 Вакол планеты.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 ЕўраФэст. Дзень за днём.
15.40 Культурныя людзі.
16.10 Фігуры.
18.50, 0.30 Зона Х.
19.35 Час спорту.
21.00 Панарама.
21.40 «Крывая ніва». Відэафільм АТН.
22.05 Баявік «Банда Келі».
0.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
1.05 Усе стыхіі.

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40 «Ералаш».
11.05 «Службовы раман Святланы Немаляевай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 «Дзве зоркі».
15.15 «Жарт за жартам».
16.10 Серыял «Тайны Смалвіля».
17.05 «Гісторыя песні».
18.15, 21.00, 23.20 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.00 Серыял «Застацца ў жывых».
23.25 Камедыя «Чорны шар».

Няма на свеце больш кансерватыўнай гульні, чым любімая ў Еўропе гульня ў шары. Але вось у клубе джэнтльменаў, якія ў яе гуляюць, з'яўляецца сарвігалава. Ён дасканала валодае шарам, і яго нахабнасць не ведае межаў.

1.05 Серыял «Байцоўскі клуб».

Тэхнічная прафілактыка з 9.05 да 15.00 (Касцюковічы).
7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00 16.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Сёстры па крыві».
10.00, 22.10 Серыял «Застацца ў жывых. II-і сезон».
10.50 «Ералаш».
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Аляксандраўскі сад».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Хлопчыкі і дзяўчынкі».
17.10 «Няхай гавораць».
18.15, 21.00, 23.30 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
20.00 Час.
23.35 «Выйграць мільён і не звар'яцець».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».
8.50, 15.50 Навіны культуры.
9.00 У гэты дзень.
9.05 Дак. фільм «Узбекістан. Ферганская даліна».
9.55, 21.15 Серыял «Крутыя павароты».

9.30 Любімыя акцёры: Армен Джыгарханян.
9.45 Казка «Смак халвы».
12.00, 22.25 Студыя 60—90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Вечны муж».
13.45 Урокі англійскай мовы.
14.00 Дзіцячы сеанс «Летні атрад».
15.00 «Хіт-экспрэс».
16.00 Серыял «Максімо ў маім сэрцы».
17.00 Запуск карабля «Саюз».
18.00 Акцэнты.
18.15 Серыял «Хрыстафор Калумб».
19.15 «Цік-так».
19.30 Кірава, 17.
21.00 Серыял «Высакародныя махляры».
22.00 Акцэнты+.

7.00 «Сад і агарод».
7.05, 21.05, 23.30 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Магія простага жыцця».
8.45 «К-гульня».
9.00 «Клуб 700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 18.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
11.00 Маст. фільм «На адлегласці ўдару».
13.00 «Лаві момант!».
13.15 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
16.55 Навіны кіно.
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 «Мультпарад».
19.00 Дак. серыял «Гісторыя жывапісу».
19.20 «Топ-8».
19.30 «Сад і агарод плюс».
19.40, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.45 Серыял «Лічбы».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.15 Маст. фільм «Зорная пяхота».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 «Няспетая песня Ганны Герман».
10.05 Пакой смеху.
11.00, 14.00, 17.00,19.00 Весткі.
11.30, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50 Ток-шоў «Прыватнае жыццё».
12.45 Серыял «Прыгоды мага».
13.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Драма «Іншае жыццё».
16.25 «ХА». Маленькія камедыі.
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Серыял «Кулагін і партнёры».
17.45 Серыял «Анёлахоўнік».
18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
19.45 Добрай ночы, малышы!
22.00 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.25 «Гістарычныя хронікі». «1957. Іў Мантан супраць Мікіты Хрушчова».
0.20 Маст. фільм «Прыватная асоба».

6.00 «Сёння раніцай».
9.05 «Наша ўсё!».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
10.20 «Пакой адпачынку». Сяргей Міронаў.
10.50 «Крымінальная Расія».
11.15 Серыял «Усё ўключана».
12.10 «Дзве праўды».
13.25 Серыял «Ідыёт».
14.15, 20.55 Серыял «Свой-чужы».
15.10 «Жаночы погляд». Эма Шаплін.
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Мангуст-2».
19.45 Серыял «У крузе першым». 1-я серыя.
Паводле аднайменнага рамана А. Салжаніцына. Глеб Нержын, матэматык, прыняў рашэнне адмовіцца ад работы ў «Шарашцы» і зноў пагрузіцца ў кашмар ГУЛАГа, але не здрадзіць свайму сумленню.

22.40 Серыял «Спадары прысяжныя».

5.00 Канал «Настрой».
7.10, 17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
8.05. 13.45. 17.15, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.10 Маст. фільм «Не забудзь... Станцыя Лугавая».
10.15, 23.30, 4.45 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 «У цэнтры ўвагі». «Дамскі ўгоднік».
11.20, 2.00 «Адна справа на дваіх». Серыял.
12.25, 21.00 «Маё вялікае армянскае вяселле». Камедыя.
13.50 Без рэпетыцый.
14.30, 20.05 «Фаворскі». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 «Рэзананс».
17.20 «21 кабінет».
18.55 «У цэнтры ўвагі». «А казачок жа засланы!».
22.05 «Вуліца твайго лёсу». «Калі дзіця — інвалід».
23.00 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.50 Маст. фільм «Уцёкі».



Пасля ўдачнага абрабавання спецыялісту па ўзлому сейфаў і яго жонцы здраджваюць саўдзельнікі.

2.50 Маст. фільм «Чарговы рэйс».
4.25 «Першая скрыпка». Мультфільм.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00 Тэніс. Спецвыпуск.
10.15 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Францыі.
11.00, 17.30, 22.30 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
15.00 Веласпорт.
19.30, 22.20 Парусны спорт.
19.35, 22.25 Выбранае па серадах.
19.40 Конны спорт. Кубак свету ў ЗША.
20.40 Навіны коннага спорту.
20.45 Гольф.
0.00 «Алімпійскія гульні». Тэлечасопіс.
0.30 Байцоўскі клуб.

ФІЛЬМ ДНЯ

«ПЕРШЫ» 22.05 «БАНДА КЕЛІ» (АЎСТРАЛІЯ—ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ФРАНЦЫЯ, 2003 г.)

Узнагароды: прэміі Аўстралійскага кінаінстытута, прыз глядацкіх сімпатый па галасаванню ў Інтэрнэце і ў кіначасопісах (Аўстралія, 2003 г.).

Фільм расказвае пра «аўстралійскага Робін Гуда» Неда Келі. Для ўладаў ён быў самым вышукваемым злачынцам ва ўсёй Аўстраліі, для народа — герой, пра якога да гэтага часу складаюцца легенды.

Рэжысёр — Грэгар Джордан. **У ролях:** Хіт Леджэр, Арландо Блум, Наомі Уотс.

АЎТОРАК, 24 КРАСАВІКА

6.10, 16.45 Серыял «Набярэжная Арфеўр, 36».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.20, 8.20 Ты ўбачыш Першы!
7.25, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
7.45, 8.45 Зона Х.
9.10, 19.55 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
10.00 Раніцняя хваля.
10.25, 17.45 Серыял «Каханне як каханне».
11.25 «Крывая ніва». Відэафільм АТН.
12.10 Час спорту.
12.35 Дэтэктыў «Крымінальны талент».
13.55 Галерэя вобразаў.
14.25 Алімпійская віза. На шляху да Пекіна-2008.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Дак. фільм «Перыяд паўраспаду».
15.40 Серыял «Старшакласнікі».
16.15 Серыял «Дзядуля маёй мары».
18.50 Зона Х.
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 Панарама.
21.40, 0.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Паўфінал.
0.05 Дзень спорту.

Тэхнічная прафілактыка з 9.05 да 15.00 (Брагін, Гродна).
7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
9.55, 22.10 Серыял «Застацца ў жывых».
10.45 «Ералаш».
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Аляксандраўскі сад».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Тайны Смалвіля».
17.05 «Няхай гавораць».
18.15, 21.00, 23.30 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
18.55 Серыял «Сёстры па крыві».
20.00 Час.
23.35 Тэорыя неверагоднасці. «Нанова народжаныя».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 16.55 Серыял «Салодкі плод».
8.50, 15.50 Навіны культуры.
9.00 У гэты дзень.
9.05, 18.30 Серыял «Гарадскі раманс».
9.55 Серыял «Крутыя павароты».
10.50 Серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
11.20, 19.30 Ядзім дома.
11.50 ПРАсоўванне+.
12.10 Жансавет.
12.40 Меладрама «Душа мая, Марыя».
14.05 «Плошча мастацтваў».
14.30 Гаспадар.
14.55 Шклозавод «Нёман».
15.15 Хакей. Формула гульні.
16.05 Мультсерыял «Калекцыя падарункаў».
16.30 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
17.55 Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія—Беларусь.
20.15 Калыханка.
20.30 Беларуская часінка.
22.35 Хакей. НХЛ. Матч тура.
0.30 «Шок-О-ЛАД».

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15, 7.40 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
8.40 «Добро пожаловаться».
9.00, 20.50 «Прапаршчык». Серыял.
10.00 «Сталічны футбол».
10.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.00, 18.25 «Пяць мінут да метро». Серыял.
12.00 «Турысты». Серыял.
13.00 «Рэпарцёр СТБ»:
13.50, 22.55 «Студэнты 2». Серыял.
14.50 «Братц». Мультсерыял.
15.15 «Надзвычайныя гісторыі»: «Смерць пад вадой. Пастка для дайвера».
16.05 «Наш дом».
16.50 «Бабскі бунт». Ток-шоў.
17.30 «Званая вячэра 3».
20.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, малыш».
20.30 «Аўтапанарама».
22.00 «Зоркі спорту»: «Марыя Шарапава. Нараджэнне зоркі».
23.50 «Гарачы лёд».
0.20 «Тэма дня».
0.25 «Цвет нацыі». Серыял.
1.15 «Ніна». Серыял.

6.00 Зараджайся!
7.30, 18.15 Серыял «Хрыстафор Калумб».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Сямейны альбом.
9.00 Спецыяльны рэпартаж.
9.30 Любімыя акцёры: Станіслаў Садальскі.
9.45 Камедыя «Унікум».
12.00, 22.25 Студыя 60—90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Вечны муж».
13.45 Урокі англійскай мовы.
14.00 Дзіцячы сеанс «Лётны атрад».
15.00 Ведаем рускую.
16.00 Серыял «Максімо ў маім сэрцы».
17.00 Дак. серыял «Цацкі для дарослых».
18.00 Акцэнты.
19.15 «Цік-так».
19.30 «Спрэчная тэрыторыя».
21.00 Серыял «Высакародныя махляры».
22.00 Акцэнты+.

7.00, 19.30 «Сад і агарод».
7.05, 10.55, 21.05, 23.30 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Кароль-алень».
8.45 «К-гульня».
9.00 «Клуб 700».
9.30 «Каралі муай тай».
9.50, 18.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
10.50, 21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Зорная пяхота».
13.00 «Лаві момант!».
13.15 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
16.55, 23.25 «Навіны кіно».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 «Мультпарад».
19.00 Дак. серыял «Гісторыя жывапісу».
19.40, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.45 Серыял «Справядлівая справа».
20.45 «Вечарніца».
21.15 Маст. фільм «У зімовай спячцы».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 «Гітлер, Сталін і Гурджыеў».
10.00, 19.55 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Паварот ключа».
12.45 Серыял «Прыгоды мага».
13.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Ток-шоў «Прыватнае жыццё».
15.30 Суд ідзе.
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Серыял «Кулагін і партнёры».
17.45 Серыял «Анёлахоўнік».
18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
19.45 Добрай ночы, малышы!
22.00 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.25 Эксперт.
23.35 «Узарваць ката. Аперацыя «Адплата».
0.30 Маст. фільм «Прыватная асоба».

6.00 «Сёння раніцай».
9.05 «Наша ўсё!».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
10.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Крымінальная Расія».
11.15 Серыял «Усё ўключана».
12.10 «Дзве праўды».
13.25, 19.45 Серыял «Ідыёт».
14.20, 20.50 Серыял «Свой-чужы».
15.10 «Прафесія — рэпарцёр».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Мангуст-2».
22.40 Серыял «Спадары прысяжныя».

5.00 Канал «Настрой».
7.10, 17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
8.05, 13.45, 17.15, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.10 Маст. фільм «Падарожжа будзе прыемным».
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Па следу бадзягі».
10.15, 23.30 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.50 Падзеі.
10.45 Лінія абароны.
11.20, 1.55 «Адна справа на дваіх». Серыял.
12.00, 16.30, 21.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
15.00, 1.15 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Францыі.
19.30, 0.00 Футбол. Еўрагалы.
20.15 Вось гэта дзіва!!!
20.45, 2.15 Тэніс. Спецвыпуск.
0.45 «Eurosport Buzz».

ФІЛЬМ ДНЯ

«ПЕРШЫ» 12.35 «КРЫМІНАЛЬНЫ ТАЛЕНТ» (СССР, 1988 г.)

У горадзе ўчыняецца некалькі злачынстваў, падобных па почырку і настолькі незвычайных, што следчая група дапускае наяўнасць у злачынкі своеасаблівага крымінальнага таленту. Псіхалагічны падыянак вопытнага следчага, сумленнага, прыстойнага і сціплага ў жыцці чалавека, і юнай авантурыстки трымае гледача ў пастаянным напружанні.

Рэжысёр — Сяргей Ашкеназі. **У ролях:** Аляксей Жаркоў, Аляксандра Захарава, Ігар Няфёдаў.



СЕРАДА, 25 КРАСАВІКА

5.50, 16.40 Серыял «Набярэжная Арфеўр, 36».
6.45, 0.05 Дзень спорту.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.20, 8.20 Ты ўбачыш Першы!
7.25, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
7.45, 8.45 Зона Х.
9.10, 19.55 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
9.55 Здароўе.
10.30, 17.40 Серыял «Каханне як каханне».
11.25 Дак. цыкл «Чарнобыльскія джунглі. 20 гадоў без чалавека...». Фільмы «Суседзі», «Даліна чарапах».
12.10 Зямельнае пытанне.
12.35 Дэтэктыў «Крымінальны талент».
14.15 ЕўраФэст. Дзень за днём.
14.25 Час кіно.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Дак. фільм «Перыяд паўраспаду».
15.40 Серыял «Старшакласнікі».
16.15 Серыял «Дзядуля маёй мары».
18.50 Зона Х.
19.35 Nota Bene.
21.00 Панарама.
21.40, 0.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Паўфінал.

Тэхнічная прафілактыка з 9.05 да 15.00 (Касцюковічы).
7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00 16.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Сёстры па крыві».
10.00, 22.10 Серыял «Застацца ў жывых. II-і сезон».
10.50 «Ералаш».
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Аляксандраўскі сад».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Хлопчыкі і дзяўчынкі».
17.10 «Няхай гавораць».
18.15, 21.00, 23.30 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
20.00 Час.
23.35 «Выйграць мільён і не звар'яцець».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».
8.50, 15.50 Навіны культуры.
9.00 У гэты дзень.
9.05, 18.55 Дак. фільм «Узбекістан. Ферганская даліна».
9.55, 21.15 Серыял «Крутыя павароты».
10.55. Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
11.25, 19.30 Ядзім дома.
11.55 ПРАсоўванне+.
12.10 Дэталі. «Асцярожна — Інтэрнэт!».
12.35 «Бусляня». Тэлефільм.
13.15 Шок-О-ЛАД.
14.10 Слова пісьменніка.
14.40 Сезон у дачи.
15.10 Як гэта робіцца.
16.05 Мультсерыял «Калекцыя падарункаў».
16.30 Серыял «Незямная госця».
16.55 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
18.30 Серыял «Гарадскі раманс».
20.05 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
22.15 Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
23.55 «Проста праграма».

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15, 7.40 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
8.40 «Аўтапанарама».
9.00 «Прапаршчык». Серыял.
10.00 «Гарачы лёд».
10.40 «Тэма дня».
10.45 «Урокі англійскай».
11.00, 18.25 «Пяць мінут да метро». Серыял.
12.00 «Фірменная гісторыя». Серыял.
13.00 «Вялікія надзеі».
13.50. 22.55 «Студэнты 2». Серыял.
14.50 «Братц». Мультсерыял.
15.15 «Горад дзяцінства».
15.30 «Ecce homo».
16.00 «Новыя падарожжы дылетанта».
16.50 «Бабскі бунт». Ток-шоў.
17.30 «Званая вячэра 3».
20.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, малыш!».
20.30 «Закон і крымінал».
20.50 «Салдаты 12». Серыял, 1-я серыя.
22.00 «Мінск і мінчане».
23.50 «Рэактыўны бокс».
0.20 «Цвет нацыі». Серыял.
1.10 «Ніна». Серыял.

6.00 Зараджайся!
7.30, 18.15 Серыял «Хрыстафор Калумб».
8.30,11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Паэзія Арменіі.
9.00 Мар, дзейнічай, будзь!
9.30, 19.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Дак. серыял «Гісторыі злачынстваў».
12.00, 22.25 Студыя 60—90.
12.15, 22.30 Драма «Вазьму твой боль».
13.45 Урокі англійскай мовы.
14.00 Дзіцячы сеанс «Лётны атрад».
15.00 Дак. серыял «Вы гэта бачылі?».
16.00 Серыял «Максімо ў маім сэрцы».

17.00 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
18.00 Акцэнты.
19.15 «Цік-так».
21.00 Серыял «Чорны спіс». 1-я серыя.
22.00 Акцэнты+.

7.00, 19.30 «Сад і агарод».
7.05, 10.55, 21.05, 23.30 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Ідыёт».
8.45 «Топ-8».
9.00, 17.30 «Мультпарад».
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50, 18.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
10.50, 21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «У зімовай спячцы».
13.00 «Лаві момант!».
13.15 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
16.55 «К-гульні».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
19.00 «Гурман-клуб».
19.20 «Навіны кіно».
19.40, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.45 Серыял «Справядлівая справа».
20.45 «Вечарніца».
21.15 Маст. фільм «Выкрадальнікі карцін».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 «Вар'яцтва Барыса Андрэева».
10.00, 19.55 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Паварот ключа».
12.45 Серыял «Прыгоды мага».
13.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Ток-шоў «Прыватнае жыццё».
15.30 Суд ідзе.
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Серыял «Кулагін і партнёры».
17.45 Серыял «Анёлахоўнік».
18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
19.45 Добрай ночы, малышы!
22.00 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.25 Эксперт.
23.35 «Чарнобыль. Хроніка маўчання».
0.30 Маст. фільм «Прыватная асоба».

6.00 «Сёння раніцай».
9.05 «Наша ўсё!».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Крымінальная Расія».
11.15 Серыял «Усё ўключана».
12.10 «Дзве праўды».
13.20, 19.45 Серыял «У крузе першым».
14.20, 20.50 Серыял «Свой-чужы».
15.10 «Авіятары».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Мангуст-2».
22.40 Ток-шоў «Да бар'ера!».

5.00 Канал «Настрой».
7.10, 17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
8.05, 13.45, 17.15, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.10 Маст. фільм «Падарожжа будзе прыемным».
9.50 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
10.50, 21.10 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Выкрадальнікі карцін».
13.00 «Лаві момант!».
13.15 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
18.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
19.00 «Мой любімы гадавалец».
19.20 «Сад і агарод плюс».
19.35 «К-гульня».
19.40, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.45 Серыял «Справядлівая справа».
20.45 «Вечарніца».
21.15 Маст. фільм «Зламаная страла».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 «Валерый Абадзінскі. Невядомая споведзь».
10.00, 19.55 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Паварот ключа».
12.45 Серыял «Прыгоды мага».
13.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Ток-шоў «Прыватнае жыццё».
15.30 Суд ідзе.
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Серыял «Кулагін і партнёры».
17.45 Серыял «Анёлахоўнік».
18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
19.45 Добрай ночы, малышы!
22.00 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.25 Эксперт.
23.35 «Чарнобыль. Хроніка маўчання».
0.30 Маст. фільм «Прыватная асоба».

6.00 «Сёння раніцай».

12.25, 21.00 «Маё вялікае армянскае вяселле». Камедыя.
13.50 Мультпарад.
14.30, 20.05 «Фаворскі». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.20 Сялянская застава.
18.55 Тварам да горада
22.05 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Паляванне на пасажыра».
23.00 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.50 Маст. фільм «Бінгабонга».

Чалавек-малпа, знойдзены ў джунглях Конга, перавезены ў Мілан. Адна толькі вучоная-антраполаг верыць у чалавечыя якасці гэтай неўтаймаванай паўжывёлы.

2.45 Дэтэктыў «Немезіда».
4.30 «Мыйдадзір». Мультфільм.

9.30 «Eurosport Buzz».
10.00 Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал.
11.15 Футбол. Еўрагалы.
12.00, 16.30, 21.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
15.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу.
19.30 Вось гэта дзіва!!!
20.00 Сумо.
0.00 Покер. Еўратур.
1.00 Бокс.

ФІЛЬМ ДНЯ

«ПЕРШЫ» 12.35 «КРЫМІНАЛЬНЫ ТАЛЕНТ» (СССР, 1988 г.)

У горадзе ўчыняецца некалькі злачынстваў, падобных па почырку і настолькі незвычайных, што следчая група дапускае наяўнасць у злачынкі своеасаблівага крымінальнага таленту. Псіхалагічны падыянак вопытнага следчага, сумленнага, прыстойнага і сціплага ў жыцці чалавека, і юнай авантурыстки трымае гледача ў пастаянным напружанні.

Рэжысёр — Сяргей Ашкеназі. **У ролях:** Аляксей Жаркоў, Аляксандра Захарава, Ігар Няфёдаў.

ЧАЦВЕР, 26 КРАСАВІКА

6.00, 16.40 Серыял «Набярэжная Арфеўр, 36».
6.45, 0.40 Дзень спорту.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.20, 8.20 Ты ўбачыш Першы!
7.25, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
7.45, 8.45 Зона Х.
9.10, 19.55 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
9.55 КампаС.
10.25, 17.45 Серыял «Каханне як каханне».
11.20 Дак. цыкл «Чарнобыльскія джунглі. 20 гадоў без чалавека...». Фільм «Зубры Чарнобыля», «Драпежнікі».
12.10 Nota Bene.
12.35 Маст. фільм «Рэйнджар з атамнай зоны».
14.05 «Чарнобыльскі крыж». Дак. фільм.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Дак. фільм «Перыяд паўраспаду».
15.40 Серыял «Старшакласнікі».
16.15. 0.55 Серыял «Дзядуля маёй мары».
18.50, 0.50 Зона Х.
19.35 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Фігуры.
22.10 Меладрама «Аўрора».

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Сёстры па крыві».
10.00, 22.10 Серыял «Застацца ў жывых. II-і сезон».
10.50 «Ералаш».
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Аляксандраўскі сад».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Хлопчыкі і дзяўчынкі».
17.10 «Няхай гавораць».
18.15, 21.00, 23.30 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
20.00 Час.
23.35 Спецрасследаванне. «Лекары супраць народа».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».
8.50, 15.50 Навіны культуры.
9.00 У гэты дзень.
9.05, 18.30 Серыял «Гарадскі раманс».
9.55 Серыял «Крутыя павароты».
10.50 Серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
11.20, 19.30 Ядзім дома.
11.50 ПРАсоўванне+.
12.10 Дак. фільм «Чарнобыльскія джунглі».
12.35 «Прысвячэнне». Мікаэл Тарывердзіеў. Сімфонія «Чарнобыль».
13.15 Смачная раніца.
13.45 «Лёс чалавека». Казімір Жыліс.
14.10 Проста праграма.
14.50 Сама сабе гаспадыня.
15.20 Святло далёкай зоркі. Кузьма Чорны.
16.10 Мультсерыял «Калекцыя падарункаў».
16.35 Серыял «Незямная госця».
17.00 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
20.05 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.10 Дак. фільм «Адкрытае люстэрка».
21.40 Футбол. Кубак УЕФА. Паўфінал.
23.40 «Алімпійская гісторыя». Сапора 1972 г.

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15, 7.40 «З чаго пачынаецца раніца».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.

КЛІМАВІЦКАЯ МАРКА — ГОНАР БЕЛАРУСІ

1

«Не пакаштуеш — праўды не напішаш, — жартавалі сябры і дадавалі, — хоць не пакаштуеш — таксама не шмат страціш». Маўляў, Клімавічы, — правінцыя, а значыць і якасць гарэлкі там нізкая. Між тым, пісаць пра смак клімавіцкай гарэлкі я і не збіраўся. І не таму, што пісаць пра гэта забараняе закон. Хацелася самому разабрацца ў тым, наколькі чуткі адпавядаюць праўдзе. Не верылася, што клімавіцкі завод, старэйшы ў рэспубліцы, сапраўды сышоў на нішто.

Зірнём на карту. На лініі Брэст—Мінск—Клімавічы размешчаны тры буйнейшыя лікёра-гарэлачныя заводы рэспублікі. Прычым адлегласць паміж імі прыблізна роўная. Здавалася б і ўмовы для гаспадарання павінны быць аднолькавымі. Але, калі першыя два размешчаны ў буйных гарадах, то апошні — у правінцыі. У Мінску ці Брэсце збыт прадукцыі куды большы, чым у Клімавічах. Кіраўнікам у абласных цэнтрах лягчэй дайсці і да прэсы, і да тэлебачання, лягчэй весці перамовы з гарадскімі ўладамі. Удзел іх марак у фэстах рэспубліканскага ўзроўню — гарантаваны. Клімавіцкія вытворцы (якія застаюцца вытворцамі правінцыйнымі) нясуць дадатковыя страты там, дзе сталічныя не трацяць і капейкі. Цяжка ўявіць, скажам, каб Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод ці мінскі «Крышталь» правяралі чатырыста разоў на год. Клімавіцкіх жа вытворцаў «трэслі» летась менавіта столькі: штодзень — адна-дзве праверкі. Калі разабрацца — чаго трэсці? Ахову завода ажыццяўляе ўзброеная міліцыя, а каб разабрацца ў паперах, і адной кваліфікаванай камісіі дастаткова. На маю (не бясспрэчную) думку «прэсінг» для таго, каб не дазволіць працаваць кіраўніцтву і калектыву завода ўпэўнена, каб выбіць канкурэнта з рынку.

Прыпамінаю тэлефонную размову, якая адбылася два гады таму з дырэктарам прадпрыемства Дзмітрыем Бонахавым. Ён толькі што быў прызначаны на гэту пасаду і быў у роспачы ад таго, наколькі складаным аказаўся клубок праблем. Нават яму (а ён карыстаўся даверам у Прэзідэнта краіны) шмат давялося папрацаваць, каб вырашыць пытанні «знешняй» палітыкі прадпрыемства і даць магчымасць калектыву ўздыхнуць з палёгкай.

Новага дырэктара на завод пакуль не прызначылі. Таму пра сучасны стан прадпрыемства я размаўляў з «пастаянным часовым» — галоўным інжынерам, які часова выконвае абавязкі генеральнага дырэктара, Аляксандрам Іванавічам Арэхавым. Аляксандру Іванавічу сорак чатыры гады, ён выдатны спецыяліст сваёй справы, скончыў Магілёўскі тэхналагічны інстытут харчовай прамысловасці, на прадпрыемстве з 1985 года, на пасадзе галоўнага інжынера працуе апошніх шаснаццаць гадоў. З першых слоў адчуваецца шырыня душы, шчырасць гэтага чалавека. Не хлусіла сетка Інтэрнэт, у якой давялося прачытаць, што Арэхаў не ідзе на здзелку з сумленнем, гарой за калектыў, паслядоўна адстойвае яго інтарэсы. Займеннік «я» ў яго гутарцы не існуе. «Мы» — і толькі. Мы — значыць калектыў у 1200 чалавек. Лічба вялікая. Палову з яе складаюць працуючыя непасрэдна на заводзе, другая палова — штат спіртзаводаў. Да гонару кіраўніцтва Клімавіцкага ЛГЗ яно здолела захаваць сыравінную базу. Спірт-сырэц пастаўляюць: Бялынкавіцкі спіртзавод з Касцюковіцкага раёна, Забялышынскі — з Хоціцкага, Міхалінскі — з Клімавіцкага, Грудзінаўскі — з Быхаўскага. Спірт-рэктыфікат пастаўляе Касцюковіцкі спіртзавод.

— Аляксандр Іванавіч, Каўгарскі спіртзавод, размешчаны ў Асіповіцкім раёне той жа Магілёўскай вобласці, даўно спыніў вытворчасць. Яго работнікі імкнуліся перабіцца хоць якімі заробкамі, але так і засталіся ля разбітага карыта — лёс калектыву нікога не ўсхваляваў, людзям патлумачылі, што спірт, маўляў, краіне больш не патрэбны. Дык ці патрэбны краіне спірт?

— Калі не нашай, то іншым — безумоўна,— жартаўліва адказвае ён. Ацаніце самі тэмпы развіцця, мы выйшлі на другое месца па аб'ёмах вытворчасці ў краіне. Летась на прадпрыемстве было выраблена 1569 тыс. дал* гарэлкі і 559 тыс. дал пладова-ягадных вінаў!

Зразумела, спірт патрэбен. І з Каўгарскага спіртзавода, пра які вы сказалі, таксама патрэбен. Патрэбен краіне, як прадукт экспарту. Танная гарэлка ў нашай краіне — сацыяльная заваёва, цана на яе за мяжой вышэй у разы. Таму лагічна і абсалютна па-дзяржаўнаму развіваць гэту галіну. Іншая справа, што некаторыя вытворцы не зацікаўлены ў гэтым. Куды прасцей працаваць не на экспарт, а трымаць у руках унутраны рынак. Тут усе ігракі вядомыя і кропкі над «і» даўно расстаўлены.

— Ці падзелены?

— Хай будзе па-вашаму. Хоць мы таксама абгрунтавана прэтэндуем на частку гэтага рынку. І не толькі з-за вялікага аб'ёму вытворчасці, а і на падставе высокай якасці. У сталіцы кажуць: «Клімавіцкая гарэлка — дрэнь». Зусім іншага меркавання аб ёй спецыялісты-дэгустатары традыцыйнай выстаўкі «United Vodka» ў французскіх Канах. У мінулым годзе наша гарэлка «СССР» першая ў Беларусі была адзначана там залатым брэндам Еўропы. Як тут не сказаць, што землякі — дзівакі. І мы не будзем пераконваць іх у адваротным. Наш выбар — шлях невялікага гарадка Нямігаў ва Украіне: сусветная вядомасць — толькі за якасць.

— І ўсё ж, калі закрануліся тэму ўнутранага рынку, як рэагуюцца на ім вытворчасць і збыт гарэлкі?

— Спачатку вытворцы падаюць свае прапановы па аб'ёмах яе вытворчасці і рэалізацыі. Упаўнаважаныя органы аналізуюць іх, прапануюць свае лічбы, затым урад зацвярджае квоты на выраб і рэалізацыю гарэлкі з разбіўкай па абласцях, гораду Мінску, Мінсельгасхарчу, канцэрну «Белдзяржхарчпрам», канцэрну па рэалізацыі фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прадукцыі. Апошнія і вызначаюць каму і колькі дазволіць. Хто і колькі тысяч дэкалітраў дазволіў нам рэалізаваць у сакавіку гэтага года бачна з наступнай табліцы:

Магілёўская вобл.— 80,13
Мінская вобл. — 39,1
г. Мінск — 1,3
Гомельская вобл. — 5,12
Віцебская вобл. — 13,55
Брэсцкая вобл. — 0,2
Гродзенская вобл. — 2,9.

Каментарый не патрэбны — Мінск і Брэсцкая вобласць не пускаюць нас на свае рынкі, што не мае ніякага дачынення да якасці нашых вырабаў. Нас проста баяцца. Спажыўцы Брэсцкай вобласці, відаць, і не ведаюць, што існуе наш завод, другі па магутнасці ў краіне. У размеркаванні квот неабходны новыя падыходы, якія б больш поўна адпавядалі густу спажыўцоў.

— На вашым прадпрыемстве ідэальная чысціня і парадак. А што ж усё-такі ляжыць у аснове высокай якасці клімавіцкіх вырабаў, чым вашы тэхналогіі адрозніваюцца ад іншых?

— У нас вялікія традыцыі. 149 гадоў таму пан Карл Карлавіч Камінскі заклаў у Клімавічах завод, які ажыццяўляў ачыстку спірту-сырца, што выраблялі мясцовыя вытворцы. І да цяперашняга часу на тэрыторыі завода захавалася памяшканне, дзе ў дарэвалюцыйныя часы месцілася ўстаноўка па ачыстцы спірту, які Камінскі адпраўляў гужавым транспартам на гарэлачны завод у г. Чэрыкаў. Такая спецыялізацыя завода захоўвалася аж да 1935 года, пакуль не быў наладжаны выраб гарэлкі. «Маскоўскую» пачалі вырабляць у 1939 годзе, завод у той час уваходзіў у склад саюзнага аб'яднання «Цэнтрспірт». Дарэчы, амаль да распаду СССР наш завод пастаўляў прадукцыю ў маскоўскі Крэмль.

Зараз у аб'яднанні працуюць дзве ўстаноўкі па вытворчасці спірту рэктыфікаванага класа «Люкс». Гэта спірт найвышэйшай якасці, прыгатаваны са збожжа. Выдатнай якасці ваду мы атрымліваем з


2

3

4

5

6

7

8

9

10

11


12

13

НАГРАДЫ, ПОЛУЧЕННЫЕ РУП «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД» НА МЕЖДУНАРОДНЫХ ВЫСТАВКАХ-КОНКУРСАХ ЗА 2006—2007 гг.

1. Выставка **«Высокий градус» г. Одесса** (04.02.2006):
   — водка «Старославянская Люкс» — золотая медаль (внешнее оформление);
   — водка «Старославянская Люкс» — серебряная медаль;
   — бальзам «Старославянский» — золотая медаль.
2. Выставка **«Продэкспо 2006» г. Москва** (17.02.2006):
   — водка «Старославянская Люкс» — золотая медаль;
   — водка «Кристальная Люкс» — бронзовая медаль.
3. Участие в выставке **«Брест. Содружество 2006» г. Брест** (03—07.04.2006).
4. Участие в выставке **«Кольский партнериат» г. Мурманск** (19—21.05.2006).
5. Выставка **«Петербургская ярмарка вин и водок» г. Санкт-Петербург** (07—10.06.2006):
   — водка «Старославянская Люкс» — Гран-при;
   — водка «Климовичская Люкс» — золотая медаль.
6. Выставка **«United Vodka 2006» г. Канны** (23.05.2006):
   — бальзам «Старославянский» — золотая медаль;
   — водка «СССР» — золотая медаль;
   — водка «Царская охота» — серебряная медаль;
   — водка «Старославянская Люкс» — бронзовая медаль.
7. Выставка **«Ялта. Золотой грифон 2006» г. Ялта** (26—30.07.2006):
   — водка «Старославянская Люкс» — золотая медаль;
   — бальзам «Старославянский» — золотая медаль;
   — настойка «Черная смородина на коньяке» — золотая медаль.
8. Участие в выставке **«Дни Могилевской области в г. Звенигороде»** (15—17.09.2006).
9. Участие в выставке **«Riga Food 2006»** (06—09.09.2006).
10. Участие в Национальной выставке Республики Беларусь в Республике Казахстан **«БеларусьЭкспо 2006» г. Астана** (16—22.10.2006).
11. Участие в Межгосударственной выставке **«15 лет СНГ: сотрудничество и интеграция» г. Москва** (23—29.11.2006).
12. Участие в Международной специализированной выставке-ярмарке **«Продэкспо 2006» г. Минск** (14—17.11.2006).
13. **Национальная выставка Республики Беларусь в Латвийской Республике г. Рига** (13—16.12.2006).
14. Международный дегустационный конкурс **«Золотые брэнды Европы» г. Брюссель** — водка «СССР».
15. Участие в конкурсе **«Лучшие товары Республики Беларусь»** (2006 г.):
   — водка «Золотая корона Люкс» — лауреат конкурса;
   — водка «Климовичская Люкс» — лауреат конкурса;
   — водка особая «Золотой колос Люкс» — лауреат конкурса.
16. Участие в IX дегустационном конкурсе по алкогольной продукции на Международной ярмарке **«Продэкспо», г. Москва** (12—16.02.2007):
   — наливка «Старославянская Клюквенная» — золотая медаль;
   — водка «Старославянская Люкс» — бронзовая медаль;
   — водка «Казенная № 1» — почетный диплом;
   — ликер «Старославянский Черносмородиновый» — почетный диплом.
17. **7-й международный конкурс-дегустация ликеро-водочных изделий г. Минск** (05.04.2007):
   — ликер десертный «Старославянский вишневый» — золотая медаль;
   — бальзам «Старославянский» — золотая медаль;
   — водка «Старославянская Люкс» — серебряная медаль;
   — водка «Казенная № 1» — бронзовая медаль;
   — бальзам «Старославянский» — диплом за лучший дизайн и фирменный стиль.

** Дал — дэкалітр (старажытная мера ёмістасці гарэлачных вырабаў роўная 10 літрам ці аднаму вядру).*

ца пакаштаваць клімавіцкую, ведайце, што «спраектавалі» яе і выпусцілі ў свет выключна жаночыя рукі.

Таццяна тлумачыць: нягледзячы на якасць вады яна праходзіць дадатковую апрацоўку. Гэты працэс уключае некалькі аперацый. Спачатку вада фільтруецца цераз фільтр з крэмневай загрузкай, што забяспечвае стабілізацыю гарэлкі пры захоўванні. Потым вада «змякчаецца» цераз слой іонаабменнай смалы, якая ўтрымлівае іоны натрыю (аперацыя дазваляе пазбегнуць выпадзенне асадку ў гатовай гарэлцы, выкліканага ўтрыманнем у вадзе мікраэлементаў). Нарэшце, вада апрацоўваецца на спецыяльнай устаноўцы, якая дазваляе знізіць утрыманне растваных соляў, выдаліць арганічныя прымесі і мікрафлору. З дапамогай гэтай устаноўкі растваныя ў вадзе прыродныя кампаненты выдаляюцца амаль на сто працэнтаў. «Клімавіцкай вадзе, як і спірту, з гарантыяй можна прысвоіць марку «Люкс»,— зазначае мой гід.

Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод гэта, па сутнасці, стэрыльная біяхімічная вытворчасць. Вытворчасць, дарэчы, пажаранебяспечная. Таму казаць пра нейкія парушэнні працоўнай дысцыпліны, звязаныя са «спецыфікай» вытворчасці, не даводзіцца. Заўважаныя ва ўжыванні спіртных напояў звальняюцца неадкладна.

Мой гід заводзіць у памяшканне. У ім вялізны вертыкальны рэзервуар і некалькі — меншых. Гэта аддзяленне па прыгатаванню водна-спіртавога раствору (так на мове вытворцаў гучыць слова «гарэлка»). У рэзервуар паступаюць вызначаныя аб'ёмы вады і спірту. Іх сумесь — амаль гатовы канчатковы прадукт. Мая спадарожніца пакрыўдзілася, калі гэты самы «прадукт» я назваў гарэлкай. «Што вы!— усклікнула Таццяна, — так робяць толькі падробкі. Асноўнае, што вызначае сапраўднага вытворцу — гэта яго магчымасць давесці да ладу, найчысцей прафільтраваць атрыманую сумесь». Аказваецца смакавую якасць гарэлцы надае менавіта фільтрацыя. На Клімавіцкім ЛГЗ яе ажыццяўляюць у паслядоўнасці: пясочны фільтр — вугальны фільтр — пясочны фільтр. У нашай рэспубліцы гэта адзінае прадпрыемства, якое абцяжарвае вытворчасць гарэлкі такой высакаякаснай ачысткай. За актываваным вугалем даводзіцца ездзіць у няблізкую Пермскую вобласць Расіі, але канчатковы вынік таго варты.

«Ну, а калі аб'ектыўна, дзе можна памацаць, убачыць у лічбах гэту вашу хвалёную якасць», — даймаў я свайго гіда. Таццяна павяла мяне ў заводскую лабараторыю. «Дзіва,— думаў я, — тут табе намалюють што заўгодна, усё ж у адных руках». Аказалася, што не ўсё так проста. Якасць гатовага вырабу вызначаецца аўтаматычна на газавым храматографе вытворчасці ЗША. Яго канструкцыя прадугледжвае толькі загрузку ўзору, астатняе — за камп'ютарнай тэхнікай, чалавек у працэс аналізу не ўмешваецца. На рукі мне далі аналіз гарэлкі «Клімавіцкая арыгінальная Люкс» па стану на дзень наведвання. Хоць нашы чытачы і не спецыялісты ў хіміі, але яго я прыведу поўнасцю.

Воцатны альдэгід: норма — 3 міліграмы на літр, утрымліваецца — 0,79 міліграма,

сівушнае масла: норма — 6 мг на літр, утрымліваецца — 5,4 мг,

складаныя эфіры: норма — 10 мг на літр, утрымліваецца — менш за 0,5 мг,

метылавы спірт — норма 0,03 працэнта, утрымліваецца — 0,0048 працэнта.

Рэальнае ўтрыманне шкодных рэчываў значна ніжэй патрабаванняў стандарту СТБ 978-2003. Дарэчы, з дапамогай гэтага прыбора даволі проста вызначыць падробку. Таццяна зазначыла, што клімавіцкую прадукцыю да нядаўняга часу падраблялі ў вялікіх аб'ёмах. Спрыяла гэтаму блізкасць да расійскай мяжы. Праз яе пад выглядам парфумернай і іншай прадукцыі з утрыманнем спірта завозіўся у рэспубліку сурагатны спірт, тут жа, недалёка ад мяжы, змешваўся з вадой, разліваўся, на бутэлькі наклейвалася этыкетка Клімавіцкага ЛГЗ. Такую «гарэлку» дзялкі прадавалі аж да заходняй мяжы. Падатковымі органамі краіны за 9 месяцаў мінулага года было выкрыта каля сямі соцень парушэнняў існуючага заканадаўства ў сферы абароту прадукцыі, якая ўтрымлівае спірт, каля 230 тысяч літраў такой прадукцыі было канфіскавана. Таму клімавіцкія вытворцы, імідж якіх пацярпеў ад падробак вельмі значна, вітаюць апошнія захады ўрада па навядзенню парадку ў гэтым пытанні.

А вось клімавіцкі бальзам падрабіць вельмі цяжка. Ды і ніхто не стане гэтым займацца — вельмі клопатная рэч, у яго склад уваходзяць аж дваццаць сем кампанентаў! У падвалах, якія захаваліся з часоў пана Камінскага і куды мяне ветліва запрасіла майстар участка па вырабу вінаў і лікёра-гарэлачных вырабаў Галіна Акімава, у ёмістасцях з нержавеючай сталі накрытыя накрыўкамі томяцца-настойваюцца на водна-спіртавым растворы травы. Ёмістасцяў няшмат і па аб'ёму яны невялікія, так што той, хто набудзе клімавіцкі бальзам, можа сапраўды лічыць сябе шчасліўцам. Адсоўваецца ў рэспубліцы ўкраінская гарэлка «Неміраў», але тое, што ўвесь пералік напояў гэтай фірмы яны здольны вырабіць з нягоршай якасцю — запэўнілі. Для гэтага ёсць усе падставы: выдатнае абсталяванне, кадры, тэхналогіі.

— Мы не збіраемся стаяць на месцы, — запэўніў Аляксандр Іванавіч Арэхаў, калі я зазірнуў у яго кабінет другі раз, — на заводзе ідзе пастаянная рэканструкцыя. Не так даўно пабудавалі і пусцілі сучасны цэх па перапрацоўцы садавіна-ягаднай сыравіны. Сокі ідуць не толькі на выраб вінаў, канцэнтраты з іх выказалі жаданне купляць краіны далёкага і блізкага замежжа. Нядаўна набылі нямецкую лінію па разліву напояў, плануем паставіць новую калону па ачыстцы спірту, заказалі прэс-формы для вырабу фірмовай бутэлькі на Ялізаўскім шклозаводзе. Дапамагае ісці ў нагу з часам, падтрымлівае фінансамі канцэрн «Белхарчпрам». Дарэчы, рэнтабельнасць прадпрыемства за мінулы год склала 13 працэнтаў.

— Ці пастаўляеце гарэлку ў Расію? — запытаў я яго.

— Крыху пастаўляем, дагаворная праца працягваецца... — адказаў ён.

Затое пра праект скарэння далёкага замежжа ён апавядаў з задавальненнем, назваў канкрэтныя лічбы і фірмы, але папрасіў іх не прыводзіць да пэўнага часу. Аказваецца, клімавіцкім вытворцам удалося выйсці на непасрэдных вытворцаў каньяку з Францыі. Тлумачыць не трэба, наколькі гэты напітак запатрабаваны ў Беларусі, попыт на яго неабмежаваны, таму камерцыйны поспех здзелкі не выклікае сумненняў. Схема такая: за першую партыю ў 1000 дэкалітраў кан'яку французам ужо заплачана, кан'як будзе пастаўлены аўтацыстэрнамі і будзе разліты ў ліпені. Назад аўтамашыны пустымі не пойдуць, яны павязуць у Францыю клімавіцкую гарэлку. Далей гэты канал так і будзе развівацца: кан'як у абмен на гарэлку.

— Калі гэта ажыццявіцца, вам дадуць ордэн, — пажартаваў я.

— Гэта адказ на вашы сумненні па прыездзе на прадпрыемства кшталту таго, што «клімавіцкая — дрэнная». Можаце сабе ўявіць, як правяралася наша прадукцыя, перш чым быў заключаны кантракт. Ну а ў смакавых тонкасцях французы даследчаныя не менш за беларусаў. Між тым, не выключана, што жыхары сталіцы гэтага сапраўднага французскага кан'яку зноў жа не пакаштуюць. Там на паліцах вырабы з Арменіі, Грузіі, Малдовы...

Гэта добра, што ў краіне працэс вытворчасці і рэалізацыі алкаголю рэгулюемы. Але вытворчасць яго трэба нарошчваць для захавання рабочых месцаў і выхаду на замежныя рынкі. Гадоў дваццаць таму гарэлкі не хапала гэтак, як цукру ці сметанковага масла. Зараз — гэта харчовыя тавары нашага экспарту. У вытворчасці гарэлкі Клімавічы — далёка не правінцыя. Па маштабах вытворчасці, узроўню тэхналогій Клімавіцкі ЛГЗ сярод лідараў на постсавецкай прасторы. Нават у такім вялікім артыкуле не апісаць, як рупяцца пра якасць, варожаць над новымі рэцэптамі яго спецыялісты. Разнастайныя міжнародныя атэстацыі пацвярджаюць развіццё сацыяльнай базы, да паслуг работнікаў — выдатны фізкультурна-аздараўленчы камбінат.

Мы і надалей будзем задавальняць інтарэсы нашага ўласніка шляхам добрасумленнай прыбытковай працы.

Я пакідаў прадпрыемства з пачуццём удзячнасці. Выдатны працуе тут калектыў, выдатныя спецыялісты, пра якіх я яшчэ спадзяюся напісаць у будучым. Ну а для тых спажыўцоў, хто сумняваецца ў якасці алкагольных напояў, я б раіў стварыць незалежны дзяржаўны цэнтр экспрэс-аналізу накшталт таго, які існуе на сталічнай Камароўцы для праверкі прадукцыі харчавання на ўтрыманне радыенуклідаў. Розныя прымесі, якія ўтрымліваюцца ў гарэлцы, такія ж нябачныя і не менш шкодныя, чым радыяцыя. Калі б такі цэнтр існаваў, то, упэўнены, ён, як і міжнародныя эксперты, паставіў бы клімавіцкім вытворцам самую высокую адзнаку за якасць.

Віктар ХУРСІК.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Выконваючы абавязкі дырэктара завода, галоўны інжынер прадпрыемства Аляксандр Іванавіч АРЭХАЎ — абаронца клімавіцкай маркі.
2. Агульны выгляд новай нямецкай лініі па разліву гатовай прадукцыі.
3. Мікрабіёлаг Ніна ШКРЭДАВА.
4. Аператар лініі Вольга МАЦЮХІНА і афарміцель гатовай прадукцыі Святлана ГРЭБЕНЮКОВА.
5. Інжынер-радыёлаг Раіса КУРАПАТКІНА.
6. Штампоўшчыца Валянціна ГРЫШКІНА.
7. У старажытных скляпеннях пана Камінскага. Майстар участка па вырабу вінаў і лікёра-гарэлачных вырабаў Галіна АКІМАВА (злева) і галоўны тэхнолаг прадпрыемства Таццяна УМЕЦКАЯ адбіраюць пробы сусветна вядомага бальзама «Старославянскі».
8. Купажыст участка разліву Святлана САФРАНКОВА і фільтравальшчыца Алена БАРТУСЕВА.
9. Аператар цэха разліву Мальвіна ЛАБАНАВА.
10. Майстар цэха разліву Вікторыя КАМКОВА.
11. Адміністратар заводскага ФОКа Альбіна ПРАКУДЗІНА.
12. Інжынер-тэхнолаг Таццяна ДАЛГУН.
13. Не кожнае прадпрыемства можа пахваліцца вырабам тары. Клімавіцкі ЛГЗ самастойна ажыццяўляе выраб пластмасавых скрынь для бутэлек. Ля прэса ліцейшчыкі Вадзім КАВАЛЁЎ і Аляксей ЧЫГРЭЦКІ.

Ведай нашых!

УДАЛЫ СТАРТ БЕЛАРУСКІХ РАКЕТАК

З перамогі стартавала беларуская жаночая зборная па тэнісу на турніры Кубак федэрацыі ў першай групе Еўраафрыканскай зоны (аналаг мужчынскага Кубка Дэвіса). Нашы спартсменкі перамаглі венгерак з лікам 2:1. У складзе беларускай зборнай — Настасся Якімава, Вікторыя Азаранка, Таццяна Пучак, Ксенія Мілеўская. Каб выйсці ў наступную стадыю, трэба заняць першае месца ў аднакругавым спаборніцтве чатырох каманд.

ЦЯЖКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ

На чэмпіянаце Еўропы ў Францыі беларускія цяжкаатлеты працягваюць штампаваць медалі. Генадзь Махвяня (вага да 62 кг) асіліў 288 кілаграмаў (134 кг у рыўку і 154 кг у штуршку) і стаў сярэбраным прызёрам першынства. Ганна Бацюшка (63 кг) заваявала «бронзу» з паказчыкам 215 кілаграмаў (99 у рыўку і 116 у штуршку).

Ірына АНАТАВА.

Гульня № 1

ГЛЕБ РАЗДУМВАЕ НАД ВЫСТУПЛЕННЕМ ЗА ЗБОРНУЮ ЕЎРОПЫ

Беларусу Аляксандру Глебу разам з яго аднаклубнікамі па лонданскаму «Арсеналу», французам Цьеры Анры і чэхам Томашам Расіцкі, зрабілі прапанову згуляць за зборную «зорак» Еўропы ў трох таварыскіх матчах, якія пройдуць у ЗША. За ўдзел у кожнай сустрэчы футбалістам паабяцалі заплаціць па 20—30 тысяч долараў, але наш зямляк пакуль не даў згоды на сваё выступленне, бо тэрмін правядзення гульняў супадае з часам адпачынку яго каманды.

БЕЛАРУСЫ ЗРАБІЛІ ТРЫ КРОКІ, БАЛГАРЫ — АДЗІН

У новым рэйтынгу ФІФА нацыянальная зборная Беларусі паднялася на тры пазіцыі і зараз займае 63-е месца з 475 ачкамі. За месяц каманда Юрыя Пунтуса правяла адзін матч з Люксембургам, які выйграла. Красавіцкі рэйтынг узначалілі чэмпіёны свету італьянцы, на другой і трэцяй прыступках адпаведна Аргенціна і Бразілія. Лепшае месца, 11-е, сярод прадстаўнікоў постсавецкай прасторы — ва ўкраінцаў. Бліжэйшы сапернік нашай зборнай па адборачнай групе да Еўра-2008, балгары, на 38-й прыступцы (падняліся на адно месца). Галандцы — на 6-й, румыны — на 14-й, славенцы — 76-я, албанцы — 77-й, люксембуржцы — на 177-й.

Ірына ПРЫМАК.

Крымінал

Дырэктар злавіў «варону». Ды якую...

Размова, як паведаміў нам начальнік упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі стратэгічнага напрамку УУС Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Манжос, пра кіраўніка РУПП «Рагачоўская эксперыментальная сартавальная льнабаза». У леташнім чэрвені ён заключыў дагавор на пастаўку прадукцыі больш як на 192 мільёны беларускіх рублёў адной расійскай фірме. Копію тыпавога дагавора (чысты бланк) яму прыслалі з вышэйстаячай арганізацыі з Мінска, у якім быў пункт аб папярэдняй аплаце.

Невядома, чым кіраваўся дырэктар, але гэты пункт у падпісаным ім кантракце чамусьці знік. У выніку грошы на адпраўлены тавар не паступілі на прадпрыемства да сённяшняга дня, бо фірма аказалася аднадзённай. Зараз дырэктару толькі і застаецца чухаць патыліцу, бо ўзбуджана крымінальная справа ў сувязі з неналежным выкананнем службовых абавязкаў. Халатнасць, адным словам, дапусціў кіраўнік.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

В годовом балансе за 2006 г. СООО «Народный пенсионный фонд ВЕСТ», опубликованном в газете «Звязда» за 30 марта 2007 г., цифру 3,9, указанную в строке «фонд предупредительных (превентивных) мероприятий», следует читать в строке «гарантийные фонды».

Таварныя знакі Клімавіцкага ЛГЗ

ПЯТНІЦА, 27 КРАСАВІКА

6.00, 15.55 Серыял «Набярэжная Арфеўр, 36».
6.50, 1.00 Дзень спорту.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.30, 0.35 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.20, 8.20 «Ты ўбачыш Першы!».
7.25, 8.25, 11.50 «Дзелавое жыццё».
7.45, 8.45 Зона Х.
9.10 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
9.55 «Шпілька».
10.25, 17.00 Серыял «Каханне як каханне».
11.20 Дак. цыкл «Чарнобыльскія джунглі. 20 гадоў без чалавека...» Фільмы «Белыя буслы зоны», «Дом для птушкі».
12.10 «Сфера інтарэсаў».
12.30 Маст. фільм «Тэма».
14.15 «Альманах падарожжаў».
14.45 ЕўраФэст. Дзень за днём.
15.15, 18.50 Навіны рэгіёна.
15.30, 1.10 Серыял «Дзядуля маёй мары».
18.10 Зона Х.
19.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь—Чэхія.
21.30 «Панарама».
22.10 «Культурныя людзі».
22.35 Трылер «Кантроль».

Небяспечнага маньяка, які прыгавораны да смерці, выкарыстоўваюць для праверкі дзеяння новага заспакаяльнага прэпарату.

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05 Серыял «Сёстры па крыві».
10.00 Серыял «Застацца ў жывых. II-і сезон».
10.50 «Ералаш».
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Аляксандраўскі сад».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Хлопчыкі і дзяўчынкі».
17.10 «Няхай гавораць».
18.15, 21.00, 23.40 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Сябры».
18.55 «Поле цудаў».
20.00 Час.
22.10 «Сярэбраны грамафон».
23.45 Маст. фільм «Джэры Магуайер».

7.00 «Ранішняя падзарадка».
8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».
8.50, 15.50 Навіны культуры.
9.00 «У гэты дзень».
9.05, 18.30 Серыял «Гарадскі раманс».
9.55 Дак. фільм «Парыж Тулуз-Латрэка».
10.50 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
11.20 «Ядзім дома».
11.45, 13.15 «Анекдот. LAD».
12.10 «Стварэнне». Дак. фільм.
12.50 «Спорт, спорт, спорт...».
13.30 Ж. Расін «Федра». Тэлеспектакль.
16.10 Мультсерыял «Калекцыя падарункаў».
16.35 Серыял «Незямная госця».
17.00 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
19.30 «Жансавет».
20.05 «Калыханка».
20.20 Беларуская часінка.
21.15 Серыял «Крутыя павароты».
22.15 «Правы чалавека».
22.30 «Дэталі». «Прыгажосць — страшная сіла».
23.00 Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.
23.35 Баскетбол. НБА. Агляд тыдня.
0.05 Казка «Кастрама».

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15, 7.40 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
8.40 «Аўтапанарама».
9.00 Серыял «Салдаты 12».
10.00 «Сталкер».
10.40 «Тэма дня».
10.45 «Наша справа».
11.00, 18.25 Серыял «Пяць мінут да метро».
12.00 Серыял «Фірменная гісторыя».
13.00 «Асабісты інтарэс».
13.50 Серыял «Студэнты 2».
14.50 «Братц». Мультсерыял.
15.15 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
16.00 «Ёсць кантакт».
16.50 «Бабскі бунт». Ток-шоў.
17.30 «Званая вячэра 3».
20.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, малыш».
20.30 Камедыя «Сямейны план».
Ён марыць захапіць дзіцячы летні лагер, каб зрабіць з яго раскошны курорт, але дырэктар дзіцячага дома не збіраецца здавацца.

6.00 Зараджайся!
7.30 Серыял «Хрыстафор Калумб».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Хто лепшы за нас?
9.00 Даведнік.
9.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Дак. серыял «Гісторыі злачынстваў».
12.00, 22.25 Студыя 60—90.
12.15, 22.30 Кіно-Індыя. «Маюры».
13.45 Урокі англійскай мовы.
14.00 Дзіцячы сеанс. «Лётны атрад».
15.00 Дак. серыял «Сліўкі общества».
16.00 Серыял «Максімо ў маім сэрцы».
17.00 Дак. серыял «Вясельныя вар'яцтвы».
18.00 Акцэнты.
18.15 Парад парадаў.
19.45 «Цік-так».
20.00 Лепшае з «Джэнтльмен-шоў».
21.00 Серыял «Бушыдо — шлях воіна».
22.00 Акцэнты+.

7.00 «Сад і агарод плюс».
7.15, 10.55, 21.05, 23.30 «Метэапрагноз».
7.20 Маст. фільм «Іван Васільевіч мяняе прафесію».
8.40, 17.20 Мультпарад.
8.55 «К-гульня».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «Гурман-клуб».
9.50 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
10.50, 21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Зламаная страла».
13.00 «Лаві момант!».
13.15 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 «Мой любімы гадаванец».
18.40 «Дзіно».
19.00 «Магелан» — «Падарожжа з густам».
19.30 «Сад і агарод».
19.40, 21.25 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.45 Серыял «Справядлівая справа».
20.45 «Вечарніца».
21.10 «Каралі муай тай».
21.30 Маст. фільм «Вартавы».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 «Мой сярэбраны шар. Дзмітрый Пяўцоў».
10.00, 19.55 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50 Серыял «Паварот ключа».
12.45 Серыял «Прыгоды мага».
13.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Ток-шоў «Прыватнае жыццё».
15.30 Суд ідзе.
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Серыял «Кулагін і партнёры».
17.45 Серыял «Анёл-ахоўнік».
18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
19.45 Добрай ночы, малышы!
21.00 Баявік «Салдаты Буфало».
23.10 Весткі+.
23.25 Дэтэктыў «Геній».

6.00 «Сёння раніцай».
9.05 «Наша ўсё!».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 «Трыццатая глава».
10.50 «Крымінальная Расія».
11.15 Серыял «Усё ўключана».
12.10 «Дзве праўды».
13.25, 19.45 Серыял «У крузе першым».
14.10 Серыял «Свой-чужы».
15.00 «Іх норавы».
15.35 «Агляд. Выратавальнікі».
16.20 Серыял «Мангуст-2».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
20.45 «Следства вялі...».
21.40 Баявік «Брат-2».
0.10 Дак. фільм «Як здымаўся «Брат-2».

5.00 Канал «Настрой».
7.10, 17.50 Серыял «Расплата за грахі».
8.05, 13.45, 17.15, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.10 Маст. фільм «Самы марудны цягнік».
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Труп у магазіне».
10.15, 23.25, 4.45 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 «У цэнтры ўвагі». «Класныя ворагі».
11.20, 1.50 Серыял «Адна справа на дваіх».
12.25 Камедыя «Маё вялікае армянскае вяселле».
13.50 Небяспечная зона.
14.30, 20.05 Серыял «Фаворскі».
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.20 Нашы любімыя жывёлы.
18.55 «У цэнтры ўвагі». «Каханне да труны».
21.00 Момант ісціны.
21.55 «Народ хоча ведаць». Ток-шоў.
22.55 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.45 Маст. фільм «Зламаныя кветкі».

2.45 Маст. фільм «Не забудзь... Станцыя Лугавая».
4.05 Мультпарад.

9.30 Вось гэта дзіва!!!
10.00 Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу.
12.00, 16.30, 21.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
15.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу.
19.30, 0.00, 2.00 Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
20.00 Самыя дужыя людзі планеты.
0.30 TNA рэстлінг. ЗША.

ФІЛЬМ ДНЯ

АНТ 23.45 «ДЖЭРЫ МАГУАЙЕР» (ЗША, 1996 г.)

Звольнены за крытыку начальства, спартыўны агент вырашае стварыць сваю фірму. Толькі два чалавекі вераць у яго, а былыя калегі збіраюцца зламаць яму кар'еру.

Рэжысёр — Камеро Кроу. **У ролях:** Том Круз, Рэне Зільвегер.

СУБОТА, 28 КРАСАВІКА

6.35 Дзень спорту.
6.45 Мультфільмы.
7.25 Серыял «Аматары жывёл».
7.55 Добрай раніцы, Беларусь!
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 Здароўе.
9.40 «Тайны смак».
10.15 Шпілька.
10.50 «Альманах падарожжаў».
11.20 «Вось такія пірагі».
12.10 Маст. фільм «Шалёны дзень інжынера Баркасава».
14.30 Існасць.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зямельнае пытанне».
15.50 Галерэя вобразаў.
16.25 Кухня гумару.
17.00 Зона Х.
17.25 Вакол планеты.
17.55 «Ваша лато».
19.10 Баявік «Грабеж».
21.00 Панарама.
21.40 Гістарычная драма «Качэўнік».

XVIII стагоддзе. Лёс усклаў на Мансура вялікую місію — аб'яднаць плямёны казахаў, і ён праходзіць усе выпрабаванні сапраўднага народнага палкаводца.

23.45 Маст. фільм «Краіна прыліваў».
Аб дзіўнай здольнасці дзіцяці выстройваць уласную карціну свету і арганічна ўплятаць у яе самыя дзіўныя, а часам і страшныя праявы знешняга свету, прымаючы ўсё як належнае.

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Сябры».
9.45 «Малахаў+».
10.45 Суботні «Ералаш».
11.20 Чарадзейныя казкі. «Падарожжа Гулівера».
12.10 «Дзікі маладняк». «Небяспечныя крокі».
12.45 «Тэлечасопіс «Саюз».
13.30 Камедыя «Пакроўскія вароты».
16.10 «Уладар гары».
17.25 «Плёнка ўсё сцерпіць. Кіналяпы».
18.10 Маст. фільм «У захапленні ад кахання».
20.00 Вялікая палітыка.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Дзве зоркі».
23.00 Бокс. Бой за тытул чэмпіёна Еўропы ў лёгкай вазе.
20.10 Маст. фільм «Дом лятаючых кіжалаў».
22.30 «Схема смеху».
23.15 Драма «Сабака-прывід. Шлях самурая».

Мафіёзі выратоўвае жыццё чарнаскураму хлопчыку, і той абяцае стаць, у адпаведнасці з кодэксам гонару японскіх самураяў, яго васалам.

1.10 Камедыя «Сямейны план».

6.00, 15.00 Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
7.30 Мультсерыял «Шоў Нудніка».
8.00 Серыял «Маўглі».
8.30 Даведнік.
9.00, 17.00 Камедыйны кактэйль.
9.30 «Хіт-экспрэс».
10.30 Лепшае з «Джэнтльмен-шоў».
11.00 Мар, дзейнічай, будзь!
11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
12.00 Любімыя акцёры: Аліса Фрэйндліх.
12.15 Казка «Прынцэса на гарошыне».
14.00 Студыя 60—90.
14.15 Казахстан: старонкі гісторыі.
16.00 Аднакашнікі.
18.15 Чамадан гісторый.
18.45 На мяжы магчымага.
19.45 «Цік-так».
20.00 Спецыяльны рэпартаж.
21.00 Маст. фільм «Франчэзка і Нунцыята».
22.45 Серыял «Вядзьмак».

6.15 «Дэтэктыўныя гісторыі»: «Сутнасць прысяжных».
7.00 «Ваенная тайна».
7.45 «З дакладных крыніц».
8.00 «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
8.25 Серыял «Трое зверху».
9.10 «Голы кухар».
9.45 «Наш дом».
10.10 «Мінск і мінчане».
10.40 «Дэтэктыўныя гісторыі»: «Гісторыя аднаго крадзяжу».
11.30 «Лёсам напісаныя радкі».
12.00 Серыял «Спадары афіцэры».
13.00 «Перапынак». Мультсерыял.
13.50 Драма «Вазьму твой боль».
15.15 «Народжаныя ў СССР».
16.00 «Надзвычайныя гісторыі»: «Адзіноі бацька жадае пазнаёміцца».
16.55 «Відзьма-нявідзьма».
17.30 «Наша справа».
17.40 «Неверагодныя гісторыі».
18.05 «Рэтраманія».
19.30 «24 гадзіны».
20.00 «СТБ-спорт».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 «Тайна борта № 1».
10.00 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25, 14.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Меладрама «Таёжная аповесць».
13.30 «Відавочнае—неверагоднае».
14.40 «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
16.40 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.10 Ток-шоў «Нацыянальны інтарэс».
18.00 Святочны канцэрт.
20.20 «Суботні вечар».
22.20 Камедыя «Мае блакітныя нябёсы».
0.05 Камедыя «Прорва».

8.00 «Сёння раніцай».
9.05 «Наша ўсё!».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.25 «Асабліва небяспечны!».
10.55 Серыял «Усё ўключана».
12.00 «Дзве праўды».
13.30 Серыял «У крузе першым».
14.25 «Зусім сакрэтна».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Меладрама «Амерыканская дачка».
19.40 «Прафесія — рэпарцёр».
20.15 «Праграма Максімум».
21.20 «Рускія сенсацыі».
22.10 Баявік «Механік».
23.55 «Рэальная палітыка».
0.30 «Мікс-файт М-1. Баі без правілаў».

5.00 Канал «Настрой».
7.10, 10.05, 13.45, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
7.15 Маст. фільм «Радня».
9.10 Юрый Багатыроў. «Ідэальны выканаўца».
10.15, 16.55 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30 Падзеі.
10.50 Дэтэктыў «Сіцылійская ахова».
12.40 «Сто пытанняў дарогаламу».
13.50 Мультпарад.
14.30 Серыял «Фаворскі».
15.30 «Каралі манежу, прынцэсы цырка».
17.15 Маст. фільм «Самы марудны цягнік».
18.55 Баявік «Над законам».
21.00 «Пастскрыптум».
22.10 Маст. фільм «Мілэдзі».
0.45 Трылер «Незабыўнае».
Яму прапанавалі эксперымент: ён зможа ўбачыць момант забойства вачамі жонкі-нябожчыцы, калі рашыцца рызыкнуць жыццём.
2.50 Серыял «Адна справа на дваіх».

9.30 Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
10.00 Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу.
11.00, 16.00, 21.30 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
15.00 Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы ў Галандыі.
19.30 «Eurosport Buzz».
20.00 Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.
0.00, 2.45 Вось гэта дзіва!!!
0.45 Байцоўскі клуб.

ФІЛЬМ ДНЯ

РАСІЯ 0.05 «ПРОРВА» (ЗША, 1986 г.)

Напярэдзе бітва маладой сямейнай пары з трухлявым асабняком! Хто ж пераможа: новыя гора-гаспадары або дом-катастрофа?!

Рэжысёр — Рычард Бенджамін. **У ролях:** Том Хэнкс, Джо Мантэнья, Аляксандр Гадуноў, Шэлі Лонг і інш.

НЯДЗЕЛЯ, 29 КРАСАВІКА

6.50 Мультфільмы.
7.25 Серыял «Аматары жывёл».
7.50 Сузор'е надзей.
8.30 Раўнавага: асяроддзе пражывання.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Арсенал.
9.35 Ранішняя хваля.
10.15 У свеце матораў.
10.50 КампаС.
11.25 Усе стыхіі.
12.10 Камедыя «Дзяўчына без адрасу».
14.00 Мужчынскі характар.
14.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Час кіно.
16.00 Камедыя «Прывітанне ад Чарлі-трубача».
17.25 ЕўраФэст. Удзельнікі «Еўрабачання-2007».
18.05 Суперлато.
19.10 Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША—Беларусь.
21.30 Панарама тыдня.
22.55 Камедыйная меладрама «Нахабнік».

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь.
9.15 Серыял «Сябры».
9.55 Маст. фільм «Камедыя даўно мінулых дзён».
11.25 «Ранішняя пошта».
12.05 «Муслім Магамаеў. Страсці па каралю».
13.05 Дак. серыял «Гэтыя цудоўныя жывёлы».
14.05 Маст. фільм «Зялёныя ветразі».
16.15 «Міжнародная панарама».
16.35 Нядзельны «Ералаш».
17.10 «Мінута славы».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Камедыя «Добрая жанчына».
23.30 «Камедзі Клаб».
0.10 Маст. фільм «Ранча надзеі».
Не бачачы карысці ад бясконцых арыштаў, вопытны паліцэйскі вырашае перавыхаваць юных злачынцаў па-свойму: ён забірае з вуліцы на сваё ранча трох адчайных хлопцаў, каб даць ім шанц пачаць нармальнае жыццё.

6.00 Камедыя «Шосты гулец».
7.45 Мір вашаму дому.
8.00 Дзіцячая гадзіна.
9.05 Мультфільм.
9.20 Серыял «Згубленая імперыя».
10.00 Як гэта робіцца.
10.30, 13.15, 15.55, 0.10 ПРАсоўванне+.
10.45 Смачная раніца.
11.15 Сама сабе гаспадыня.
11.45 «Спявай, душа!».
12.15 Гаспадар.
12.40 Слова пісьменніка.
13.25 Фільм-балет «Юнак і смерць».
13.45 «Будзем разам!».
14.40 «Спорт, спорт, спорт...».
15.10 Вас выклікае Спартландыя.
16.05 Драма «Табар сыходзіць у неба».
17.55 Трагікамедыя «Сабачае сэрца».
20.20 Тэлебарометр.
20.35 Анекдот. LAD.
20.50 Камедыя «Усплёск».
22.50 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал.

6.05 «Схема смеху».
6.50 Фільм-казка «Вясенняя казка».
8.25 «Трое зверху». Серыял.
9.15 «Аўтапанарама».
9.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.30 «Вялікае снеданне».
11.05 «Культурнае жыццё».
11.35 «Добры дзень, доктар!».
12.05 «Спадары афіцэры». Серыял.
13.05 «Перапынак». Мультсерыял.
13.50 Меладрама «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся».
15.15 «И Вам при встрече я скажу...».
16.00 «Новыя падарожжы дылетанта».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Нацыянальны здабытак». Гарады.
17.20 «Прыватныя гісторыі».
18.10 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.45 Трылер «Па-за часам».
Апынуўшыся ў цэнтры расследавання падпалу і забойства, ён з паважанага шэрыфа гарадка ператвараецца ў галоўнага падазронага.
22.50 «Спартыўны тыдзень».
23.20 «Прафесійны бокс».
0.20 «Па поўнай праграме».
1.00 «Бла-бла-шоў».
2.05 «4400». Серыял.
2.50 Маст. фільм «Дом лятаючых кіжалаў».

6.00, 15.00 Дак. серыял «Згубленыя светы».
7.30 Мультсерыял «Шоў Нудніка».
8.00 Серыял «Маўглі».
8.30 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
8.45 Хто лепшы, чым мы?
9.00, 17.00 Камедыйны кактэйль.
9.30 Ведаем рускую.
10.30 «Хвост каметы».
11.30, 14.30, 17.30 «Навіны Садружнасці».
12.00 Любімыя акцёры: Зоя Фёдарава.
12.15 Камедыя «Шальменка-дзяншчык».
14.00 Студыя 60—90.
14.15 Сямейны альбом.
14.25 «Аўтапілот». Дак. фільм.
15.15 Дак. фільм «Бывай, каханне, бывай...».
16.00 «У цэнтры Зямлі». Канцэрт Рыгора Лепса.
17.05 «Фабрыка думкі». «Ідэя для Расіі».
18.00 Камедыя «Палёт бусла».
20.00 «У цэнтры падзей».
21.00 Маст. фільм «Вершнік па імені Смерць».

1904 год. Перакананыя ва ўласнай беспакаранасці, тэрарысты пачынаюць паляванне за членамі царскай сям'і.

23.30 Трылер «Сапраўднае злачынства».
1.25 «Над законам». Маст. фільм.
3.20 «Дзелавыя людзі». Маст. фільм.
4.40 «Чароўная палачка». Мультфільм.

8.00 Вось гэта дзіва!!!
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 «Адшукваецца адпачынак».
9.30 «Дзіно».
9.55 «К-гульня».
10.00 «Магелан» — «Падарожжа са смакам».
10.30 Маст. фільм «Забіць Біла».
12.30 Серыял «Доктар Хаўс».
14.30 «Добрая вестка з Рыкам Рэнерам».
15.00 «К-відэа для дзяцей».
15.20 Фільм для дзяцей.
17.00 Маст. фільм «Бег».
18.45 «К-відэа Топ-8».
19.00, 21.00 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.05 Маст. фільм «Люстасць».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Маст. фільм «Навальнічны перавал».

7.00, 11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
7.10 Маст. фільм «Арыфметыка кахання».
8.30 Мультфільм.
9.05 «Ваенная праграма».
9.30 Студыя «Здароўе».
10.00 «Сам сабе рэжысёр».
11.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.20, 19.00 «Сакрэт поспеху».
11.40 «Сто да аднаго».
12.40 Смехапанарама.
13.10 Фітыль.
14.20 Маст. фільм «І на камянях растуць дрэвы».
17.15 «Смяюцца дазваляюцца».
20.25 Маст. фільм «Падманскоўныя вечары».
Трыццацігадовая Каця, упершыню спазнаўшы сапраўдную страсць, гатова зняшчыць усіх, хто можа перашкодзіць яе шчасцю.
22.20 Трылер «Жаночая логіка».
Тры маладыя афіцыянткі рэспектабельнага рэстарана вырашаюць зарабіць што-небудзь, акрамя чаявых, і ідуць... у наркабізнэс!

9.30 «Дзікі свет».
10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
10.20 «Усё адразу!».
10.55 «Шчаслівы рэйс».
11.45 «Іх норавы».
12.25 «Авіятары».
13.30 «Трыццатая глава».
14.05 Драма «Дзеці Ванюшына».
16.30 «Адзін дзень. Новая версія».
17.10 Серыял «Адвакат».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
21.10 «Галоўны герой».
22.20 «Нядзельны вечар».
23.25 Баявік «Павуціна».

Звычайны ганконгскі падлетак апынуўся ў цэнтры шпіёнскага загавору, мэтай якога з'яўляецца крах усіх кампʼютарных сістэм у паўднёва-ўсходняй Азіі.

3.35 Маст. фільм «Безыменная зорка».
6.30 Права на надзею.
6.55 Дзённік падарожніка.
7.25 Сялянская застава.
8.00 «Жывая прырода». «Захавальнікі рая».
8.45 «Залатая антылопа». Мультфільм.
9.20 Нашы любімыя жывёлы.
9.50 «Рэальныя гісторыі». «Адпавяць да смерці».
10.30, 23.15 Падзеі.
10.45 Камедыя «Дзелавыя людзі».
12.20 Андрэй Макарэвіч у праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
12.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Апошні выстрал маньяка».
13.30 Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
14.00 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».

9.30 Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.
10.30 Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы ў Галандыі.
13.00, 19.30 Супербайк. Чэмпіянат свету ў Галандыі.
14.00 Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал.
16.00 Веласпорт.
18.00, 21.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
20.30, 2.00 Мотаспорт па выхадных.
0.00 Бокс.
1.00 Сумо.

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

ФІЛЬМ ДНЯ

«ПЕРШЫ» 22.55 «НАХАБНІК» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ФРАНЦЫЯ, 2003 г.)

Мірны і нясмелы Гары, паддаўшыся на ўгаворы родных і канчаткова пасварыўшыся з сынам, едзе ў горад, каб узяць удзел у бязглуздым шоў і парадаваць жонку-нябожчыцу.

Рэжысёр — Дэвід Цьюліс. **У ролях:** Дэвід Цьюліс, Джоні Вегас, Ліза Горман.

Тэлесеткі

Успаміны «мёртвых» вёсак

Слова «зона» для беларусаў вось ужо больш як 20 гадоў дадатковага тлумачэння і перакладу не патрабуе. Але чалавечая памяць не вечная, і каб не паўтарылася чарнобыльская трагедыя, трэба пастаянна аб ёй нагадваць... Напярэдадні чарговай гадавіны аварыі на ЧАЭС Агенцтва тэленавін прадставіць новы дакументальны фільм «Крывая Ніва» — аповед пра жыццё вёскі Крывая Ніва і іншых вёсак, што знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджання — і, адпаведна, адсялення.

Аўтарам ідэі фільма выступіў Аляксандр Мартыненка, над праектам таксама працавалі вядомы рэжысёр Сяргей Рыбакоў і журналіст Ірына Акуловіч. На працягу года творчая група працавала ў беларускіх вёсках, якіх зараз ужо няма на карце краіны. Галоўныя героі фільма жывуць у адной з такіх адселеных вёсак — Крывой Ніве. Жывуць — таму, што не хочуць больш нікуды сыходзіць, таму, што свядома зрабілі такі выбар і засталіся ў адзіноце, практычна ў поўнай ізаляцыі.

Што трымае людзей на зямлі, дзе як быццам нама і не можа быць нармальнага жыцця? Над гэтым і разважаюць аўтары фільма «Крывая Ніва». У эфіры Першага канала дакументальная карціна будзе паказана 23 красавіка, пасля праграмы «Панарама».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Эх, дарогі...

Увесну дарогі, якія і без таго лічацца адным з галоўных няшчасцяў, ператвараюцца для большасці вадзіцеляў у праблему нумар адзін. Але вядучыя праграмы «Аўтапанарама», што выходзіць на тэлеканале СТБ, бяруцца пацвердзіць, што справа толькі ў прафесіяналізме і правільным выбары аўто. З гэтай мэтай у праграме стартуе акцыя «Выездка», дзе аўтамабілі праходзяць выпрабаванне бездарожжам — ва ўмовах, максімальна набліжаных да «баявых».

Экзаменаваць аўтамабілі вядучы «Аўтапанарамы» Рыгор Камянюк і запрошаныя тэст-пілоты будуць у 3 катэгорыях: пазадарожнікі (месца здымак — кар'ер Стайкі), усюдыдарожнікі (на пляжы Мінскага мора) і легкавыя паўнапрывадныя аўтамабілі (на пляцоўцы Баравой). У тэсціраванні возьмуць удзел таксама кіраўнік спаборніцтваў па джып-трыялу і навучэнцы школы тэст-пілотаў. Лепшы аўтамабіль вызначаць сумесна 10 «аўтамабільных» журналістаў і гледачы праграмы. У прэтэндэнтах на званне «Лепшы паўнапрывадны аўтамабіль-2007» — Міцубісі Паджэра 4, Нісан Кашкай, Уаз Хантэр, Кіа Спаратаж, Грэйт Уол Дзір, Грэйт Уол Хувер, Субару Форэстэр і Кадзілак Эскалэйд. Галасаванне, дарэчы, ужо ідзе на сайце www.ap.by.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАВАЖАНЫЯ ПАСАЖЫРЫ!

У сувязі з рамонтам моста на перагоне Уша—Маладзечна **23 і 25 красавіка 2007 г.** скразны рух прыгарадных электрацягнікоў ад Мінска да Маладзечна **з 04 гадз. 30 мін. да 19 гадз. 35 мін. АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЦА НЕ БУДЗЕ.**

— Электрацягнікі, адпраўленнем са ст. Мінск-Пасажырскі, будуць рухацца ТОЛЬКІ ДА СТ. УША І НАЗАД.

— Электрацягнікі, адпраўленнем са ст. Маладзечна ў перыяд указанага часу з абароту здымаюцца.

Перавозка пасажыраў паміж станцыямі Маладзечна і Уша будзе ажыццяўляцца аўтобусамі па чыгуначных білетах.

Заезд аўтобусаў на п.п. Фестывальны, Селівонаўка, Крыніца, Татаршчызна, Мясата ажыццяўляцца не будзе.

Расклад руху на 23 і 25 красавіка 2007 г.

РАСКЛАД ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ					
Адпраўленне Мінск-Пас.	Прыбыццё ў Ушу	Прыбыццё ў Аляхновічы	Адпраўленне з Ушы	Адпраўленне з Аляхновіч	Прыбыццё ў Мінск
04-36	05-47			06-17	07-28
05-23	06-45		06-14		07-40
06-09	07-30		07-00		08-25
07-01	08-24		07-48		09-09
07-33	09-07		08-57		10-23
09-14	10-37		10-23		11-51
10-00		Аляхн. 11-10	11-23		12-52
11-11	12-36		13-40		15-09
12-38	14-03		15-10		16-37
15-33	16-57			16-27	17-36
16-30	17-54		17-15		18-40
			18-12		19-35

Час адпраўлення АЎТОБУСАЎ са ст. Маладзечна да ст. Уша
05-20
06-05
06-58
07-50
08-40
09-30
10-30
12-48
14-10
16-20
17-20

Да і пасля ўказанага раскладу рух электрацягнікоў без змяненняў.

У сувязі з вышэйвыкладзеным, перакананўчая просьба, ва ўказаныя дні ўстрымацца ад паездак чыгуначным транспартам і скарыстаць іншыя віды транспарту.

Просім Вас улічыць, што, у выпадку неабходнасці ажыццяўлення паездкі, працягласць Вашай паездкі ў гэты дзень павялічыцца.

23.04.2007 г. і 25.04.2007 г. адмяняюцца электрацягнікі:
— эл.ц. Мінск—Маладзечна, адпр. 06-38
— эл.ц. Мінск—Маладзечна, адпр. 08-22
— эл.ц. Мінск—Маладзечна, адпр. 13-34
— эл.ц. Аляхновічы—Мінск, адпр. 08-32
— эл.ц. Аляхновічы—Мінск, адпр. 07-34
— эл.ц. Маладзечна—Мінск, адпр. 13-51
— эл.ц. Мінск—Маладзечна, адпр. 10-00 ідзе да ст. Аляхновічы, прыб. 11-10
**— эл.ц. Маладзечна—Мінск назначаецца ў абарот Уша—М

ГАЗОН

Незалежна ад таго, якую плошчу будзе займаць газон (будзе гэта палянка памерам з дыван ці вялізная плошча гарадскога парку), дзякуючы сваёй аксамітнай яркай зеляніне, ён палепшыць настрой, упрыгожыць навакольны ландшафт, дадасць камфорту ў адпачынак і заняцце спортам.

Для таго, каб газон атрымаўся густым і прыгожым, прытрымлівайцеся агратэхнікі пасадкі сумясяў газонных траў: **норма высеву** — 30—40 г/кв.м; **тэрмін пасеву** — з красавіка да сярэдзіны верасня; **глыбіня пасадкі насення** — 0,5—1 см.

Усе намаганні абзавесціся сапраўдным газонам могуць стаць дарэмнымі, калі купленае насенне акажацца няякасным. Таму не рызыкуйце, купляйце травасумесі ў фірменных магазінах **«МінскСортНасенАгародніна»**, дзе якасць насення вам могуць гарантаваць. Акрамя таго, тут у залежнасці ад плошчы ўчастка вы зможаце выбраць неабходную колькасць насення, расфасаваную ў фірменную ўпакоўку.

Назва травасумесі/від упакоўкі	Маса насення ва ўпакоўцы, кг	Кошт у магазінах ААТ "МінскСортНасен-Агародніна", руб.
"Гольфмастер" ***(для прафесійных газонаў)***		
каляровая кардонная скрынка	1	**19000**
"Спортмастер" ***(для прафесійных спартыўных палёў)***		
каляровая кардонная скрынка	1	**19000**
"Орнаментал" ***(для дэкаратыўных газонаў)***		
каляровы поліэтыленавы пакет	0,2	**3500**
каляровы поліэтыленавы пакет	0,4	**6000**
каляровая кардонная скрынка	1	**16000**
мяшок з паперы	20	**240000**
"Спорт" ***(для спартыўных і гульнявых пляцовак)***		
каляровы поліэтыленавы пакет	0,2	**3500**
каляровы поліэтыленавы пакет	0,4	**6000**
каляровая кардонная скрынка	1	**16000**
мяшок з паперы	20	**240000**
"Шедоу" ***(для газонаў на заценены х участках)***		
каляровая кардонная скрынка	1	**16000**
мяшок з паперы	20	**240000**
"Эко-лон" ***(экалагічны газон з белай канюшынай)***		
каляровая кардонная скрынка	1	**16000**
мяшок з паперы	20	**240000**
"Робустика" ***(для звычайных газонаў)***		
каляровы поліэтыленавы пакет	1	**14000**
мяшок з паперы	20	**220000**
"Плейграўнд" ***(для гульнявых пляцовак і двароў)***		
каляровы поліэтыленавы пакет	1	**14000**
мяшок з паперы	20	**220000**
"Парк" ***(для газонаў на заценены х участках)***		
каляровы поліэтыленавы пакет	1	**14000**
мяшок з паперы	20	**220000**
Канюшына белая ***(нізкарослая для газонаў)***		
поліэтыленавы пакет з этыкеткай	0,2	**5000**
Мятліца параскаўтвараль ная ***(для густых і мяккіх газонаў)***		
поліэтыленавы пакет з этыкеткай	0,15	**7000**

Набыць насенне ААТ «МінскСортНасенАгародніна» вы можаце па адрасах:

аптовы продаж:
223017 Мінскі р-н, пас. Гатава
тэл.: (017) 503-41-80,
503-41-56,
503-41-58;
факс: (017) 503-60-00
дробнаптовы продаж:
220014 г. Мінск,
вул. Мініна, 21, корп. 1
тэл./факс: (017) 226-25-85,
226-38-79.

Рознічны продаж ажыццяўляецца праз фірменныя магазіны **«НАСЕННЕ» ААТ «МінскСортНасенАгародніна»** па адрасах:
г. Мінск: вул. Кісялёва, 36; Камароўскі рынак (на адкрытым рынку); вул. Я. Коласа, 48; вул. Барадзінская, 31; Чэрвеньскі рынак (павільён); прасп. Газеты «Праўда», 24а; вул. Мініна, 21, корп. 1; вул. Алтайская, 64, корп. 1; вул. Дуніна-Марцінкевіча, 10; вул. Станіслаўскага, 34; вул. Альшэўскага, 73; перасячэнне вул. Адзінцова—Якубоўскага;
г. Барысаў, прасп. Рэвалюцыі, 30;
г. Маладзечна, вул. Міру, 12;
г. Жодзіна, прасп. Сыракваша, 3.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Кредэксбанк»

пер. Промышленный, 7, 220075 г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001
Тел. 299-66-21, факс 299-66-23
E-mail: nordinvest@nib.bn.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	*2*	*3*	*4*	*5*	*6*
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1		
3	Средства в Национальном банке	1102	2	315,9	170,1
4	Ценные бумаги	1103		-	1 573,2
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	-	1 573,2
	в наличии для продажи	11033	3.2	-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	13 629,0	2 446,4
6	Кредиты клиентам	1106	5	-	-
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	82,6	3,7
9	Прочие активы	1109	8	3 674,5	29,3
10	ИТОГО активы	110		17 702,0	4 222,7
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	-	2 132,6
14	Средства клиентов	1206	11	1 883,4	67,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		-	-
16	Прочие обязательства	1209	12	3,5	11,4
17	ВСЕГО обязательства	120		1 886,9	2 211,7
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	12	14201,4	1 440,6
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		488,7	360,2
22	Накопленная прибыль	1214	14	1 124,2	209,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	0,8	0,3
24	ВСЕГО капитал	121		15 815,1	2 011,0
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		17 702,0	4 222,7
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	6 618,6	-
28	Обязательства	1302	17	6 621,0	-

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 апреля 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	*2*	*3*	*4*	*5*	*6*
1	Процентные доходы	2011		482,8	123,2
2	Процентные расходы	2012		0,1	36,6
3	Чистые процентные доходы	201	18	482,7	86,6
4	Комиссионные доходы	2021		126,9	0,4
5	Комиссионные расходы	2022		77,1	2,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	49,8	- 2,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	417,4	3,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	-	-
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	-	-
11	Прочие доходы	207	23	-	-
12	Операционные расходы	208	24	230,9	69,0
13	Прочие расходы	209	25	13,2	7,1
14	Налог на прибыль	210		81,7	2,3
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		624,1	9,7

Председатель Правления Т.И. Жевняк
Главный бухгалтер Т.Н. Дылько

Лицензия на осуществление банковских операций № 19 от 13.02.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь

Дзённік Вікі Ц.



Ніколі не перастаю здзіўляцца, як у людзей адрозніваюцца паняцці «маё» і «агульнае» — і, адпаведна, адносіны да гэтых рэчаў. Кватэра — яна мая, і для яе не шкада ні еўрарамонту, ні рамонту звычайнага. А, напрыклад, лесвічная пляцоўка — агульная, і таму на ёй з лёгкім сэрцам можна пакінуць вырваную «з мясам» старую аконную раму, нягледзячы на скаргі і просьбы прыбіральшчыцы. Або дзіця — яно маё, сцвярджае маладая мамачка, і не перашкаджайце выхоўваць! Але калі тое ж самае дзіця нешта ўтворыць, высвятляецца, што яго выхаванне — справа агульная, за якую адказваюць школа, грамадства і ўсе, хто хочаце, акрамя бацькоў...

Спусціць або закасаць?

20.04.2007

На асобным пачэсным месцы стаіць праца і стаўленне да яе. «Мая» праца — тая, за якую заплацяць, ад якой не адкруцішся, якой можна пахваліцца перад знаёмымі і якую не перадаручыш камусьці іншаму, больш за тое — будзеш абараняць, каб ніхто не паквапіўся. Але ўсё мяняецца, калі справе прысвойваюць статус «агульнай». Агульная — значыць не абавязковая, не тэрміновая, нікому канкрэтна не патрэбная (калі толькі, крый Божа, вас не прызначаць адказным за яе выкананне). Хтосьці калісьці, канешне, павінен яе зрабіць — але чаму менавіта я і зараз? Прабачце, гэта не ўваходзіць у мае службовыя абавязкі! І ўсё, далей ніякія прамовы, заклікі і заахвочванні (акрамя эканамічных) не дапамогуць.

Асабліва гэта заўважна ў штогадовай паласе «рэха савецкіх часоў» — суботнікаў. Адны паблажліва махаюць рукой — ат, няхай здымаюць грошы, і разыдземся па-ціхаму. Другія, сціскаючы зубы і спусціўшы рукавы, імітуюць бурлівую дзейнасць, абы кіраўніцтва адчапілася. Трэція рукавы моўчкі закасваюць і ідуць куды сказана — саджаць дрэвы, прыбіраць смецце, наводзіць чысціню і парадак. Памятаю, некалі мы ў складзе вялікай групы валанцёраў-добраахвотнікаў прыкладвалі маладыя рукі да сталічнага Парка камянёў — дык нават рыштунку на ўсіх не хапала, добра яшчэ, некаторыя вопытныя «чысцільшчыкі» са сваім прыйшлі! Трайная карысць, між іншым, атрымалася: і добраўпарадкавалі тэрыторыю, і свежым паветрам, ды яшчэ ў добрай кампаніі, надыхаліся, і сам парк як след паглядзелі (некаторыя — упершыню ў жыцці). Або яшчэ аднойчы рэдакцыі маладзёжных выданняў (калегі па «Чырвонай Змене» не дадуць схлусіць), як працалюбівыя мурашы, расчышчалі скверык, а пазней маладзёжны дэсант паднаўляў і добраўпарадкоўваў Маскоўскія могілкі...

Ой, гэта я захапілася, і лірычнае адступленне зацягнулася. Насамрэч хацела прыгадаць яшчэ адну катэгорыю людзей — тых, якія пры слове «суботнік» забіваюцца ў далёкі кут і злымі вачыма глядзяць адтуль, даючы зразумець, што без бою не здадуцца. Менавіта яны любяць узгадваць пра «службовыя абавязкі», у якія не ўваходзіць добраахвотная фізічная праца ў імя высокіх ідэалаў. «Гэта не мая справа, гэта павінны рабіць іншыя людзі», — заявіў адзін такі «адмоўнік», якому я спрабавала націснуць на сумленне, робячы цьмяныя намёкі, што вокны няблага было б і памыць. «Але ж акно ў ТВАІМ кабінеце!» — запярэчыла здзіўленая я. «Яго мыццё ўваходзіць у абавязкі прыбіральшчыцы!» — задаволена адрэзаў апанент. Тое ж самае адбылося, калі я паспрабавала зайсці з іншага боку, спытаўшы: «А ўласны двор — там жа ёсць лавачкі, пясочніцы, арэлі і ўсё іншае, што патрабуе дробнага рамонту?». Гэта, як мне здзекліва нагадалі, абавязкі супрацоўнікаў ЖЭС. Скверыкі — вотчына Зелянгаса, пляцоўкі для выгулу сабак — іх жа, сабачнікаў, галаўны боль, і ўвогуле — кожны павінен адказваць толькі за сваю работу.

Логіка жалезная, не падкапаешся. Але ці кожны з нас на сто працэнтаў выконвае ўласныя «службовыя абавязкі»? З дакладнасцю да хвіліны, ад званка да званка, адпрацоўвае паложаны час? Выконвае нават самыя непрыемныя даручэнні? ...Вось і я пра тое самае. Пералічваць дробныя саломінкі ў чужым воку вельмі зручна — калі бервяно ў сваім не перашкаджае.

Некаторыя мае сябры любяць прыводзіць у прыклад прагматычных амерыканцаў — маўляў, вось яны як прыйшлі дадому з работы, так і забыліся на працу, лішнюю хвілінку ў офісе не затрымаюцца. І чужую скамечаную паперку не паднімуць, каб да сметніцы данесці. Мажліва, усё так, усё праўда — як казала Нона Мардзюкова ў ролі домакіраўніка, «не ведаю, як там у Нью-Йорку, я там не была». Але, як расказваюць іншыя сябры (яны былі), ёсць за акіянам адметная традыцыя. Маладыя людзі, калі жадаюць дасягнуць пэўных вышыняў — не маё значэнне, у мясцовых выбарах або ў конкурсе прыгажосці — абавязкова павінны мець у біяграфіі радок накont сваёй грамадскай актыўнасці. Дзеля гэтага яны працуюць на грамадскіх пачатках у прытулках для састарэлых, удзельнічаюць ва ўсякіх валанцёрскіх летніках, дзяжураць у лячэбніцах і г.д. Карацей, расцягваюць сабе тыя ж самыя суботнікі з пары дзён да некалькіх гадоў. Бо інакш, калі ім будзе справа толькі да сваіх спраў (прабачце за каламбур), ні пра якое прызнанне лідарам не можа быць і гаворкі.

Гэты тэкст — зусім не пракламацыя, ён не мае на мэце кагосьці загітаваць пастроіцца ў шарэнгі і рушыць на суботнік. Выключна індывідуальнае меркаванне. Асабіста я ведаю, што не пераламлюся, калі закасаю рукавы і памыю некалькі вокнаў ці пафарбую агароджу ля пад'езда. А потым зноў пастараюся «глаголом жечь сердца людей» (або куды там патраплю). Работа ў мяне такая...

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ «АЛЬВЕНА»
БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗА 2006 Г.

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	*2*	*3*	*4*
Основные средства	392,3	**Источники собственных средств, всего**	3 828,8
Нематериальные активы	3,7	в том числе: уставный фонд	938,0
Финансовые вложения, всего	2 990,4	резервный фонд	145,8
в том числе: инвестиции в дочерние общества	0	добавочный фонд	991,4
инвестиции в другие организации	352,6	фонд накопления	654,9
облигации и другие долговые обязательства	2 377,8	фонд потребления	141,4
прочие финансовые вложения	260,0	целевое финансирование	0
Доля перестраховщиков в страховых резервах	1 011,7	нераспределенная прибыль прошлых лет	132,8
Дебиторы, всего	1 954,3	нераспределенная прибыль отчетного года	824,5
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	258,4	**Страховые резервы и фонды, всего**	7 210,5
		в том числе: страховые резервы	6 546,8
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	0	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	663,7
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	1 695,9	гарантийные фонды	0
		Кредиторы, всего	472,8
Прочие активы, всего	5 403,8	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	101,9
в том числе:незавершенное строительство	0,8		
материальные ценности и затраты	82,2	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	9,3
денежные средства	5 320,0	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	0
собственные акции (доли)	0,0	заемные средства	0
прочие активы	0,8	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	361,6
Непокрытые убытки прошлых лет	0	**Прочие пассивы**	244,1
Непокрытые убытки отчетного года	0	**БАЛАНС**	11 756,2
БАЛАНС	11 756,2		

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ «АЛЬВЕНА»
ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗА 2006 Г.

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	*2*	*3*
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	**5572,0**
Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -)	067	**- 104,0**
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	082	**3408,2**
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	482,5
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	0
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	0
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	30,7
Расходы на ведение дела	120	2023,0
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	101,7
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	117,7
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	472,6
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	12647,7
Операционные расходы	145	11400,4
Внереализационные доходы	150	495,5
Внереализационные расходы	155	349,1
Финансовый результат		1866,3
Использовано прибыли		1041,8
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	824,5

Достоверность баланса подтверждена независимой аудиторской организацией ОДО «Промаудит» 26.02.2007 г.: специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0061721 выдана Министерством финансов Республики Беларусь 3 февраля 2004 года со сроком действия по 2 февраля 2009 года.

По данной отчетности представлено положительное аудиторское заключение:

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «Страховая компания «АльВеНа» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность Закрытого акционерного общества «Страховая компания «АльВеНа» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 год.

УСМІХНЁМСЯ!

У хірурга:
— Што вас непакоіць?
— Доктар! Мяне дзяўчына кінула!
— Ну тады вам да псіхатэрапеўта.
— Але ж пасля кідка я пяць метраў праляцеў і аб сценку стукнуўся!

☺

Аб'ява: Шукаю фотаздымак Міхаіла Баярскага без капелюша.

☺

Бацька прыходзіць дадому пасля цяжкага працоўнага дня:
— Прывітанне, дачка, ты купіла новую сукенку?
— Не.
— Пафарбавала валасы?
— Не.
— Тады што?!
— Яна ў ваннай... Я — яе хлопец...

☺

Хатнія гадаванцы ўпрыгожваюць наша жыццё, а ў цяжкую хвіліну — стол.

☺

Жонка:
— Ты каго больш кахаеш — мяне ці гэтую дурную штуку, за якой ты праводзіш увесь дзень?!
Муж:
— Ну, любая, як ты можаш параўноўваць неадушаўлёны прадмет з Камп'ютарам?

«Вясёлцы»—50

«Залатая» дата дзіцячага часопіса

У год нараджэння «Вясёлкі» я працавала ў новым дзіцячым садку ў гарадскім пасёлку торфапрадпрыемства «Калпеніца» пад Баранавічамі. Загадчыца надавала вялікую ўвагу забеспячэнню садка не толькі харчамі і цацкамі, але і кніжкамі на беларускай і рускай мовах. Пасля планавых заняткаў у вольныя хвілінкі я чытала дзецям вершаваныя і празаічныя творы. Перад тым, як чытаць, гаварыла дзецям, на якой мове напісаны верш ці апавяданне. Яны добра засвойвалі прачытанае і ў хуткім часе амаль усе пры паўторных чытаннях правільна адказвалі, беларускамоўны ці рускамоўны твор.

Шкада, што зараз далёка не ў кожным садку існуе такая практыка. Больш за тое, многія выхавальніцы зусім не гавораць па-беларуску (не ведаюць?!). Я кажу гэта, бо шмат у якіх садках бывала на сустрэчах з дзецьмі.

З асаблівай цікаўнасцю малыя слухалі казку Васіля Віткі «Вавёрчына гора». Аднойчы ў садку з'явіўся і нованароджаны часопіс «Вясёлка». Я нават думаць не магла, што жыццёвая дарога прывядзе мяне ў Мінск, і я са сваімі вершамі прыйду ў «Вясёлку» і пазнаёмлюся з аўтарам цудоўнай казачкі. Вершы мае былі ўхвалены і, на маю вялікую радасць, для іх адпусцілі цэлую старонку. Гэта быў 1960 год. У часопісе тады працавалі цудоўныя творцы — Цімох Васільевіч Крысько (Вітка), Алесь Восіпавіч Пальчэўскі, Сяргей Іванавіч Грахоўскі. Яны ўважліва, патрабавальна, але добразычліва ставіліся да аўтараў і іх твораў. Маладую «Вясёлку» любілі дзеці і былі ўдзячнымі яе чытачамі (слухачамі).

Ішлі гады, змяняліся рэдактары «Вясёлкі», паляпшаліся тэхнічныя магчымасці, часопіс якасна абнаўляўся. Прыносілі свае творы не толькі сталыя аўтары, але і пачаткоўцы. Заставалася нязменнай патрабавальнасць да матэрыялаў — пісаць даходліва, цікава для дзяцей, як кажуць, забаўляючы, выхоўваць, каб твор выклікаў не толькі ўсмешку, але і заклікаў чытача (слухача) падумаць над учынкамі персанажа ці героя, прааналізаваць іх.

«Вясёлцы» шанцуе на супрацоўнікаў. І зараз у ёй працуюць выдатныя майстры слова — Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі, Мікалай Аляксандравіч Маляўка, Мікалай Мікалаевіч Чарняўскі, Уладзімір Мінавіч Мазго, якія добра адчуваюць псіхалогію дзяцей, ведаюць, што для іх цікава і карысна. І, канешне, патрабавальнасць да твораў нязменная.

Вялікую ўвагу надае рэдакцыя творчасці сваіх чытачоў, на старонках часопіса змяшчаюцца вершы дзяцей, замалёўкі, малюнкі.

Лепшыя мастакі афармляюць «Вясёлку». А колькі ў ёй рубрык — «Наша спадчына», «Была вайна», «Музей «Вясёлкі», «Кацілася торба...», «Школа «Вясёлкі», «Тэатр Васі Вясёлкіна», «Хвілінкі-весялінкі», «Каласавічок» і інш. Часта друкуюцца песні з нотамі, рэбусы, смяшынкі, загадкі, забаўлянкі, вясёлыя пытанні...

Творы, якія змяшчаліся пад рубрыкамі «Наша спадчына» і «Музей «Вясёлкі» (аўтар Мікола Маляўка), выдадзены асобнымі кніжкамі. Да кожнага юбілею часопіса выдаецца тэматычны зборнік, які так і называецца — «Вясёлка». Гэта вельмі патрэбная літаратура для настаўнікаў пачатковых класаў, для бацькоў.

У «Вясёлкі» шаноўны юбілей — 50-годдзе, але пра яе можна з гонарам сказаць:

«Вясёлка» наша без узросту —
заўсёды юная яна.
Валодае сакрэтам простым:
яе пусціла ў свет вясна.
І з кожным новым юбілеем
«Вясёлка» мудрасцю сталее.

Будзь жа і надалей, дарагі часопіс, добрым сябрам і дарадцам дзецям.

Я бясконца рада, што іду па творчым шляху разам з любімай мною «Вясёлкай».

Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ, лаўрэат прэміі імя Янкі Маўра і прэміі імя Васіля Віткі.

ПАГРОЗА «СЯДЗЯЧАЙ СМЕРЦІ»

Амаль 70 працэнтаў мінчан пакутуюць ад няхваткі фізічнай актыўнасці — гіпадынаміі. Наступствы гіпадынаміі настолькі сумныя, што ёй нават прысвоілі другую назву — «сіндром сядзячай смерці». Як расказала ўрач-гігіеніст Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ленінскага раёна Ірына Пазняк, амаль кожны другі жыхар сталіцы, які вядзе маларухомы лад жыцця, ужо нажыў ускладненні ад гіпадынаміі. Так, 30 працэнтаў мінчан пакутуюць ад залішняй вагі, кожны трэці — ад варыкознага расшырэння вен, якое стала наступствам сардэчна-сасудзістай недастатковасці. Столькі ж мінчан з-за адсутнасці фізічнай нагрузкі зарабілі хранічную вянозную недастатковасць. Прычым найбольшую небяспеку гіпадынамія ўяўляе для дзяцей школьнага ўзросту, цяжарных жанчын і састарэлых людзей.

ЗАМАРОЖАНЫ ЯД

Збор грыбоў яшчэ не пачаўся, а санітарная служба горада ўжо зарэгістравала 10 выпадкаў атручэння гэтымі дарамі лесу. Аб гэтым расказала спецыяліст аддзялення гігіены харчавання Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Юлія Ігнатава. Практычна ва ўсіх выпадках харчовыя атручэнні былі выкліканы ўжываннем замарожаных грыбоў.

«Мінск—Навіны».

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.59	20.20	14.21
Віцебск —	5.45	20.13	14.28
Магілёў —	5.49	20.10	14.21
Гомель —	5.49	20.03	14.14
Гродна —	6.14	20.34	14.20
Брэст —	6.18	20.31	14.13

Месяц

Маладзік 17 красавіка.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Акуліны, Гаўрылы, Георгія, Данілы.*
К. *Агнешкі, Амаліі, Тэадора, Часлава, Шымана.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+9 — +11 °С	МАСКВА	+6 — +8 °С
ВІЛЬНЮС	+5 — +7 °С	РЫГА	-2 — 0 °С
КІЕЎ	+6 — +8 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+5 — +7 °С

ХТО ЎКРАЎ КАБЕЛЬ?

Адразу дзве крымінальныя справы ўзбуджаны па факту крадзяжоў каляровага дроту ў Рэчыцкім раёне. У першым выпадку 156 метраў сілавога кабелю знікла каля вёскі Баршчоўка ў сістэме прадпрыемства электрычных сетак. А ў другім — з вышкі прамежкавай радыёлінейнай сістэмы, што знаходзіцца ў раёне вёскі Заспа. Агульны ўрон — каля двух мільёнаў рублёў. Міліцыя шукае зламыснікаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.485. Індэкс 63850. Зак. № 2163. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12